Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 26 красавіка 1985 г. № 17 (3271) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.

НЯХАЙ ЖЫВЕ 1 МАЯ — ДЗЕНЬ МІЖНАРОДНАЙ САЛІДАРНАСЦІ ПРАЦОЎНЫХ!

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб Пленуме Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза

23 красавіка 1985 года адбыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. На Пленуме з дакладам «Аб скліканні чарговага XXVII з'езда КПСС і задачах, звязаных з яго падрыхтоўкай і правядзеннем» выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС М. С. Гарбачоў.

У спрэчках па гэтаму пытанню выступілі т.т. У. В. Шчарбіцкі—першы сакратар ЦК Кампартыі Украіны, В. В. Грышын — першы сакратар Маскоўскага гаркома КПСС, Д. А. Кунаеў — першы сакратар ЦК Кампартыі Казахстана, В. І. Варатнікоў — Старшыня Савета Міністраў РСФСР, Э. А. Шэварднадзе—першы сакратар ЦК Кампартыі Грузіі, Л. М. Зайкоў—першы сакратар Ленінградскага абкома КПСС, Я. І. Клімчанка—слесар-інструментальшчык вытворчага аб'яднання «Мінскі трактарны завод» імя У. І. Леніна, К. Г. Вайна—першы сакратар ЦК Кампартыі Эстоніі, А. П. Філатаў—першы сакратар Новасібірскага абкома КПСС, В. К. Месяц — міністр сельскай гаспадаркі СССР, А. У. Уласаў—першы сакратар Растоўскага абкома КПСС, П. М. Федасееў—віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук СССР, Б. У. Бальмант—міністр станкабудаўнічай і інструментальнай прамысловасці.

Пленум прыняў па дакладу М. С. Гарбачова пастанову, якая публікуецца ў друку.

Пленум ЦК КПСС разгледзеў арганізацыйныя пытанні.

Пленум ЦК перавёў В. М. Чэбрыкава з кандыдатаў у члены Палітбюро ЦК, выбраў сакратароў ЦК КПСС Я. К. Лігачова і М. І. Рыжкова членамі Палітбюро ЦК.

Пленум ЦК выбраў члена ЦК КПСС, міністра абароны СССР С. Л. Сакалова кандыдатам у члены Палітбюро ЦК, члена ЦК КПСС В. П. Ніканава—сакратаром ЦК КПСС.

На гэтым Пленум ЦК КПСС закончыў сваю работу.

Пастанова Пленума Цэнтральнага Камітэта КПСС

АБ СКЛІКАННІ ЧАРГОВАГА XXVII З'ЕЗДА КПСС

Заслухаўшы і абмеркаваўшы даклад Генеральнага сакратара ЦК КПСС т. Гарбачова М. С. «Аб скліканні чарговага XXVII з'езда КПСС і задачах, звязаных з яго падрыхтоўкай і правядзеннем», Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС пастанаўляе:

1. Склікаць чарговы XXVII з'езд Камуністычнай партыі Савецкага Саюза 25 лютага 1986 г.

2. Зацвердзіць наступны парадак дня з'езда:

1) Справаздача Цэнтральнага Камітэта КПСС і задачы партыі—дакладчык Генеральны сакратар ЦК КПСС т. Гарбачоў М. С.

2) Справаздача Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС—дакладчык старшыня Цэнтральнай рэвізійнай камісіі КПСС т. Сізоў Г. Ф.

3) Аб новай рэдакцыі Праграмы КПСС.

4) Аб змяненнях у Статуце КПСС.

5) Аб Асноўных напрамках эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1986—1990 гады і на перспектыву да 2000 года — дакладчык Старшыня Савета Міністраў СССР т. Ціханаў М. А.

6) Выбары цэнтральных органаў партыі.

3. Устанавіць норму прадстаўніцтва на XXVII з'езд КПСС: адзін дэлегат ад 3.670 членаў партыі.

4. Дэлегаты на XXVII з'езд КПСС выбіраюцца згодна са Статутам партыі закрытым (тайным) галасаваннем на абласных, краявых партыйных канферэнцыях і з'ездах кампартый саюзных рэспублік. Выбары дэлегатаў на XXVII з'езд КПСС ад кампартый Украіны, Беларусі, Узбекістана і Казахстана праводзяцца на абласных партыйных канферэнцыях.

Камуністы, якія знаходзяцца ў партыйных арганізацыях Савецкай Арміі, Ваенна-Марскога Флоту, унутраных і пагранічных войск, выбіраюць дэлегатаў на XXVII з'езд КПСС разам з адпаведнымі тэрытарыяльнымі партыйнымі арганізацыямі на абласных, краявых партканферэнцыях або з'ездах кампартый саюзных рэспублік.

Камуністы, якія ўваходзяць у партыйныя арганізацыі часцей Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флоту, што знаходзяцца за граніцай, выбіраюць дэлегатаў на XXVII з'езд КПСС на партыйных канферэнцыях адпаведных вайсковых злучэнняў.

5. Правесці справаздачна-выбарную кампанію, якая папярэднічае XXVII з'езду КПСС, у наступныя тэрміны: сходы ў пярвічных партыйных арганізацыях у верасні—лістападзе; раённыя, гарадскія, акруговыя партыйныя канферэнцыі — у лістападзе—снежні г. г.; абласныя, краявыя партыйныя канферэнцыі—у снежні 1985—студзені 1986 гг.; з'езды кампартый саюзных рэспублік—у студзені—пачатку лютага 1986 г.

6. На справаздачна-выбарных сходах, канферэнцыях, з'ездах кампартый саюзных рэспублік глыбока і ўсебакова разгледзець праведзеную работу па выкананню рашэнняў XXVI з'езда партыі і наступных Пленумаў ЦК КПСС, грунтоўна абмеркаваць пытанні партыйнага кіраўніцтва гаспадарчым і культурным будаўніцтвам, стан арганізацыйна-партыйнай, ідэалагічнай работы.

У ходзе справаздачна-выбарнай кампаніі неабходна сканцэнтраваць намаганні партыйных арганізацый, працоўных калектываў на паспяховым завяршэнні 1985 года і адзінаццатай пяцігодкі ў цэлым, своечасовай і якаснай падрыхтоўцы да выканання планаў дванаццатай пяцігодкі, вырашэнні ключавых праблем эканамічнага і сацыяльнага развіцця, усямернай інтэнсіфікацыі вытворчасці на аснове шырокага ўкаранення дасягненняў навукова-тэхнічнага прагрэсу, удасканалення планавання і кіравання, умацавання арганізаванасці, дысцыпліны і парадку ва ўсіх звеннях народнай гаспадаркі. Забяспечыць авангардную ролю камуністаў у разгортванні перадз'ездаўскага сацыялістычнага спаборніцтва, дзелавую падтрымку каштоўных пачынанняў, накіраваных на выяўленне і лепшае выкарыстанне ўнутраных рэзерваў.

Партыйныя сходы, канферэнцыі і з'езды павінны праходзіць у абстаноўцы дзелавітасці, прынцыповасці, самакрытычнага падыходу да ацэнкі работы партарганізацый і іх кіруючых органаў. Важна, каб справаздачы і выбары садзейнічалі далейшаму ўмацаванню ленінскіх норм партыйнага жыцця, развіццю ўнутрыпартыйнай дэмакратыі, крытыкі зверху і знізу, росту актыўнасці і ініцыятывы камуністаў, павышэнню іх адказнасці за справы сваіх арганізацый і партыі ў цэлым.

Цэнтральны Камітэт КПСС выказвае цвёрдую ўпэўненасць у тым, што падрыхтоўка да XXVII з'езда КПСС пройдзе на высокім арганізацыйным і ідэйна-палітычным узроўні, пад знакам цеснай згуртаванасці партыйных радоў, непарушнага адзінства партыі і народа.

ВЕЧАРЫ, СУСТРЭЧЫ

У Мінскай вышэйшай партыйнай школе адбыўся творчы вечар, прысвечаны 40-годдзю Вялікай Перамогі. У вечары прынялі ўдзел народны пісьменнік БССР, Герой Сацыялістычнай Працы Васіль Быкаў і першы сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў рэспублікі Ніл Гілевіч.

Госці расказалі аб здабытках беларускай ваеннай прозы, падзяліліся творчымі планамі, адказалі на шматлікія пытанні слухачоў.

Фота К. ДРОБАВА.

Шмат адбылося ў Доме літаратара «паэтычных пятніц», ды гэтая асаблівая, паколькі стала своеасаблівым мастом з дня ўчарашняга ў сённяшні. «Радкі, абарваныя куляй» — такая назва яе. Тыя, хто сабраўся ў камінай зале, змаглі далучыцца да творчасці паэтаў, якія загінулі ў Вялікую Айчынную вайну.

Адкрыў сустрэчу і вёў лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Р. Барадулін. Майстар паэтычнага слова, ён з глыбокім хваляваннем гаварыў пра тых, чый талент, магчыма, не змог раскрыцца ва ўсёй паўнаце і значнасці, але іх творы, якія прыйшлі да чытача — у тым сумненні быць не можа, — назаўсёды застануцца ў гісторыі беларускай літаратуры. Р. Барадулін прачытаў свой верш, прысвечаны ім, паэтам пярэдняга краю.

У выкананні артысткі Г. Кухальскай прагучалі славуты верш М. Сурначова «У стоптаным жыце», а таксама адзін з твораў А. Пысіна—паэта, які, прайшоўшы праз пекла вайны, назаўсёды застаўся песняром пакалення, што мужнела ў полымі ўсенароднай барацьбы з фашызмам.

А потым слова бралі маладыя паэты. Не свае ўласныя вершы чыталі, а іх — творцаў і салдатаў. У. Марук — М. Сурначова, А. Пісьмянкоў — З. Астапенкі, Г. Булыка — А. Жаўрука, Л. Дранько-Майсюк — Л. Гаўрылава, У. Мазго — А. Ушакова, Л. Паўлікава — Г. Шведзіка, В. Шніп — А. Коршака.

Малады кампазітар Г. Казлова выканала свае песні, у якіх адлюстравана тэма вайны.

Е. ДРОМІН.

Кінадакументаліст В. Дашук стварыў фільм, які расказвае пра жыццёвы і мастакоўскі шлях народнага пісьменніка Беларусі, Героя Сацыялістычнай Працы В. Быкава. Стужка так і называецца «Васіль Быкаў. Узыходжанне». Пабудаваная ў асноўным як маналог самога творцы аб пройдзеным і здзейсненым, яна ўвабрала ў сябе паасобныя эпізоды з мастацкага фільма «Узыходжанне» — прачытанне Л. Шапіцька адной з самых выдатных аповесцей пісьменніка «Сотнікаў».

У мінулы чацвер адбыліся грамадскі прагляд стужкі ў Доме літаратара і сустрэча з творчай групай. Каб пачуць уражанні аб сваёй новай рабоце, прыйшлі аўтар сцэнарыя і рэжысёр-пастаноўшчык поўнаметражнага дакументальнага фільма «Васіль Быкаў. Узыходжанне» В. Дашук, галоўны аператар С. Пятроўскі, асістэнт рэжысёра У. Талкачыкаў.

Адкрыў абмеркаванне А. Адамовіч. Пра сваю новую работу расказаў і адказаў на пытанні гледачоў В. Дашук. У гаворцы пра фільм прынялі ўдзел пісьменнікі Д. Бугаёў, В. Тарас, Р. Барадулін, А. Сульянаў.

З фільмам «Васіль Быкаў. Узыходжанне» неўзабаве пазнаёмяцца беларускія тэлегледачы.

К. КОРНЕЎ.

У саўгасе «Бальшавік» Мінскага раёна адбыўся літаратурны вечар «Роля паэзіі Янкі Купалы ў Вялікай Айчыннай вайне», арганізаваны супрацоўнікамі Літаратурнага музея Янкі Купалы. Адкрыў яго і вёў сакратар парткома гаспадаркі К. Ліхач.

Пра творчасць Я. Купалы ваеннага перыяду расказала старшы навуковы супрацоўнік музея Л. Давідоўская. Дырэктар музея А. Кулакоўскі падзяліўся ўспамінамі аб франтавых гадах, прачытаў урыўкі са сваіх твораў, прысвечаных незабыўным падзеям, гаварыў аб ролі творчасці Я. Купалы ў развіцці беларускай літаратуры, падарыў калгасу свае кнігі. Перад прысутнымі з чытаннем вершаў выступіў паэт П. Прыходзька.

Вершы чытае П. Прыходзька

За цікавую сустрэчу гасцям шчыра падзякавалі К. Ліхач, былы настаўнік гісторыі М. Андрыеўскі, брыгадзір трактарнай брыгады Р. Пянкрат, загадчык бібліятэкі Н. Кузняцова.

Л. СЦЯПАНАВА.

Фота І. СУХІН.

ДЗВЕ НОВЫЯ РАБОТЫ

У гэтыя перадсвяточныя дні радыёслухачоў і тэлегледачоў рэспублікі чакае сустрэча з двума новымі спектаклямі. У пятніцу і суботу галоўная рэдакцыя літаратурна-драматычнага вяшчання радыё прапануе спектакль «Свае і чужынцы» па рамане І. Чыгрынава. Аўтар інсцэніроўкі і пастаноўшчык — заслужаны дзеяч мастацтваў БССР В. Раеўскі.

У нядзелю на блакітным экране другое нараджэнне спектакля «Вяртанне ў Хатынь», пастаўленага ў свой час Рускім драматычным тэатрам БССР імя М. Горкага па «Хатынскай аповесці» А. Адамовіча. Аўтары сцэнарыя А. Адамовіч і Б. Луцэнка, рэжысёр-пастаноўшчык заслужаны дзеяч мастацтваў БССР Б. Луцэнка.

Спектаклі прысвячаюцца 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Л. РАГАУЦОЎ.

НА МАСКОЎСКІМ ЭКРАНЕ

У рамках кінафестывалю «Такі народ непераможны», які праводзіўся ў Маскве, у кінатэатрах, палацах, дамах культуры і клубах прайшоў тэматычны паказ стужак «Званы Хатыні», прысвечаны гераізму і мужнасці працоўных Беларусі ў барацьбе супраць фашысцкіх захопнікаў.

Дэманстраваліся дакументальныя карціны «Рудабелка, год 41-ы», «Боль мой — Хатынь», «Мінск — горад-герой», «Бессмяротны подзвіг Мінска», «Хвіліна маўчання», «Ставіцца ў абавязак», фільм 14-ы «Вызваленне Беларусі» з серыяла «Вялікая Айчынная», а таксама мастацкія стужкі «Маладымі засталіся назаўсёды», «Дзень вяртання», «Узыходжанне», «Аленевае паляванне».

А. КАСЯНКОЎ.

НАШЫ ГОСЦІ

Госцем Саюза пісьменнікаў БССР быў перакладчык беларускай літаратуры на балгарскую мову Іван Дайчынаў. Ён пераклаў раманы І. Шамякіна «Вазьму твой боль», І. Чыгрынава «Апраўданне крыві», паасобныя творы А. Васілевіч, А. Варановіча, Л. Дайнекі, У. Караткевіча, А. Пальчэўскага, М. Парахневіча, Б. Сачанкі, Я. Скрыгана, М. Стральцова. У яго творчых планах — пераклад рамана І. Чыгрынава «Свае і чужынцы».

Іван Дайчынаў азнаёміўся з Мінскам, наведаў мемарыяльны комплекс «Хатынь». Ён меў гутаркі з першым сакратаром праўлення СП Беларусі Н. Гілевічам і сакратаром праўлення І. Чыгрынавым.

Г. КУЗЬМІЧ.

АБ'ЯДНАЛА ЗАХАПЛЕННЕ

Тэатр Чэрвеньскага раённага Дома культуры сёлета адзначыць сваё 30-годдзе. Увесь гэты час для калектыву быў багатым на творчыя знаходкі. У рэпертуары тэатра спектаклі «Барабаншчыца» А. Салынскага, «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы, «Пад адным небам» А. Маўзона, «Свае людзі —паладзім» А. Астроўскага, «Лявоніха на арбіце» А. Макаёнка і іншыя.

У 1982 годзе калектыву прысвоена ганаровае званне «народны». Ён з'яўляецца актыўным прапагандыстам тэатральнага мастацтва ў калгасах і саўгасах раёна, рэгулярна прымае ўдзел у абласных конкурсах-аглядах.

Цяпер самадзейныя артысты працуюць над спектаклем «Альдона, Анфіса, Анэта» па п'есе маладога беларускага драматурга Г. Марчука. У ролях заняты М. Ананіч, С. Чарняк, В. Часнакова, Н. Хаймінава, Я. Харытановіч і іншыя.

К. ЧАРКАСАЎ.

І СЛОВАМ, І СПРАВАЙ

У савецкіх літаратараў, як і ва ўсіх людзей добрай волі, няма зараз больш пачэснага абавязку, як захаваць мір на нашай планеце. Таму і ганарар за чарговую літстаронку, якую склалі творы членаў літаб'яднання «Натхненне» пры бялыніцкай райгазеце «Зара камунізму», пералічаны ў Савецкі фонд міру.

В. ХАУРАТОВІЧ,
старшыня літаб'яднання.

Працягваюцца творчыя сувязі часопіса «Маладосць» са сваімі чытачамі. Нядаўна прайшла яшчэ адна з такіх сустрэч. Адбылася яна ў Мінскім культасветвучылішчы. На сустрэчу з навучэнцамі і выкладчыкамі прыйшлі галоўны рэдактар часопіса А. Грачанікаў, адказны сакратар Л. Дайнека, загадчык аддзела паэзіі Я. Янішчыц, загадчык аддзела публіцыстыкі А. Гаўрон, а таксама пастаянныя аўтары часопіса В. Шніп і У. Скарынкін. Вялася гаворка аб тых праблемах, на якія звяртае ўвагу выданне ў справе выхавання падрастаючага пакалення, гучалі вершы.

М. ВАРАНЦОЎ.

Выступае Уладзімір Карызна.

Фота Ул. КРУКА.

Традыцыйным становіцца яшчэ адно цікавае мерапрыемства — прэм'ера кнігі. Шмат у гэтым кірунку робіць аддзел прапаганды і рэкламы кнігі Мінаблкнігагандлю, а таксама Партызанская раённая арганізацыя таварыства кнігалюбаў. На гэты раз аматары паэзіі завіталі ў Дом літаратара, каб пазнаёміцца з новым зборнікам У. Карызны «Музыка ў свеце».

Уладзімір Карызна — паэт-песеннік. Многія яго творы пакладзены на музыку вядомымі беларускімі кампазітарамі, сярод якіх і народны артыст рэспублікі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР Ю. Семяняка. Ён таксама прыняў удзел у гэтай сустрэчы. Разам з Ю. Семянякам прыйшлі ў Дом літаратара і маладыя кампазітары — лаўрэат прэміі Ленінскага камсамола Беларусі Л. Захлеўны і Э. Зарыцкі, якія таксама актыўна супрацоўнічаюць у апошні час з паэтам.

Адкрыў сустрэчу і вёў А. Вольскі. Гаворка ішла і аб паэзіі, і аб песні, закраналіся шматлікія праблемы ўвасаблення лепшых твораў у музыцы. І, вядома ж, гучалі песні на словы У. Карызны — іх выканала салістка Беларускага радыё і тэлебачання, лаўрэат Усесаюзнага конкурсу В. Пархоменка.

У. Карызна прачытаў свае новыя творы, расказаў аб сваім супрацоўніцтве з кампазітарамі.

У гэты ж дзень новая кніга У. Карызны «Музыка ў свеце» паступіла ў продаж і тыя, хто набыў яе, атрымалі ў паэта аўтографы.

В. ЗАКРЭУСКІ.

Адбылася сустрэча студэнтаў і выкладчыкаў факультэта журналістыкі БДУ імя У. І. Леніна з Алесем Петрашкевічам. Абмяркоўваліся праблемы сучаснай беларускай драматургіі. Напярэдадні быў арганізаваны культпаход у Тэатр юнага гледача на прэм'еру спектакля «У спадчыну — жыццё» па аднайменнай п'есе драматурга, прысвечанай лёсу дзяцей і салдацкіх удоў часу Вялікай Айчыннай вайны.

А. НАРКЕВІЧ.

Вечар, прысвечаны 65-годдзю з дня нараджэння паэта-франтавіка А. Пысіна, адбыўся ў Глуску. З дакладам на тэму «Вобразы Радзімы і яе абаронцаў у паэзіі А. Пысіна» выступіў старшыня раённага літаратурнага аб'яднання «Пціч» В. Лаўрыновіч. Затым члены літаратурна-творчага аб'яднання школьнікаў «Званок» В. Лугіна, Ж. Калыхалава, З. Мішур, П. Шапко, А. Стоцкая, А. Шэршань, Н. Кандзеева, І. Казлоўская выступілі з чытаннем вершаў і апавяданняў аб франтавіках і Радзіме.

Бібліятэкар школы В. Зайцава наладзіла выстаўку кніг літаратараў Беларусі, у тым ліку і А. Пысіна, а таксама рэдкіх фотаздымкаў паэта.

Г. ДЗЕМІДОВІЧ.

СЛОВАМ ПУБЛІЦЫСТА

ТРЫ МАЕ ПЕРШАМАІ

Свята сусветнай працоўнай салідарнасці нельга ўявіць у якім-небудзь другім месяцы года. Гэта свята менавіта вясновае.

Мо таму Вясну заўсёды чакаюць з нецярпеннем. Вясна — пара цвіцення, шчодрага сонца, яснага неба і цяпла.

А калі яна для цябе шасцідзесятая, дык можна ўжо і вылучыць найбольш памятныя свае Вёсны...

Вось тры з іх.

Трыццатыя гады. Мой бацька, камуніст з 1918 года, у той час працаваў дырэктарам саўгаса «Ціманава», што на Магілёўшчыне. І вось напярэдадні свята 1 Мая яго ўзнагародзілі пераходным сцягам з... дзяругі! Так, так, былі ў той час і такія «ўзнагароды». Выйшла ў дырэктара саўгаса нейкая прамашка, недагляд і атрымлівай дзяругу. Да гэтага часу памятаю бацькаў сорам і сум з гэтай нагоды.

Быў мітынг на пляцы каля школы, святочны абед, было ўсё, як ужо павялося ў свята 1 Мая.

Ноч была цёплая, бяроза пад акном нашай хаты весела шапацела маладым лісцейкам, маці і бацька сядзелі на прыступках ганка і ціха размаўлялі.

— Чаго ты так смуткуеш, Саўка? — пыталася маці. — Што цябе гняце? Дзяружка гэта?

Бацька ўздыхнуў.

— Сумленне камуніста папракае: як жа гэта ты да дзяружкі дакаціўся?

Сумленне камуніста...

На партыйным білеце так і напісана: «Партыя — розум, гонар і сумленне нашай эпохі».

Камунізм таксама асацыіруецца з Вясной, як усё значнае і велічнае. Бо грамадства, якое бярэ на свае плечы адказнасць за ўсё лепшае і прагрэсіўнае, за мір і шчасце на Зямлі, мае непасрэднае дачыненне да ўсяго светлага, вясновага ў нашым жыцці.

І яшчэ адна Вясна: май сорак другога.

Карэльскі фронт. Дрымучыя лясы, непралазная багна, камары. Цяжкія баі пад Кесцянгай. Наш 93-ці батальён — у акружэнні. Зацятыя баі з эсэсаўскай дывізіяй «Штандар Гітлера» асаблівую жорсткасць набылі напярэдні свята 1 Мая.

Камандаванне прыняло рашэнне з баямі выходзіць з акружэння. Нашаму батальёну пастаўлена баявая задача: штурмаваць варожую абарону, першымі ісці на прарыў.

І вось каманда на пастраенне. Камандзір батальёна, былы латышскі стралок, маёр Прыедэ ўважліва разглядае тых, хто яшчэ трымаецца на нагах, застаўся ў страі.

— Камуністы і камсамольцы... — камандзір не паспеў закончыць: тыя, каго датычылася гэтая каманда, выйшлі наперад.

Камбат ідзе ўздоўж строю, да ўсіх прыглядаецца, мабыць, каб запомніць твары байцоў на ўсё астатняе жыццё... (Шкада: жыцця заставалася камбату некалькі гадзін).

Вось камбат прыпыніўся каля сяржанта Фёдара Лягенчанкі (ён мой зямляк, з Магілёўшчыны).

— Выйдзі са строю, сяржант. — Не загадаў, папрасіў камандзір.

— Чаму? — збялеў Фёдар.

— Ты паранены ў нагу, а ісці трэба далёка.

— Я не маю права заставацца...

— Чаму не маеш права? — Па выразе твару камандзіра ўсе мы бачым, што ён добра ведае «чаму», але хоча пачуць адказ Фёдара.

І той адказвае:

— Я — камуніст.

Сяржант Фёдар Лягенчанка пайшоў на чале свайго аддзялення і загінуў героем.

На розных гераічных і драматычных этапах гісторыі нашай дзяржавы камуністы, не шкадуючы жыцця, баранілі незалежнасць і гонар яе...

Камуністы заўжды наперадзе яшчэ з тых часоў, калі Ленін сказаў: «Мы ідзём цеснай кучкай па абрывістай і цяжкай дарозе, моцна ўзяўшыся за рукі». І сёння, калі камуністы рыхтуюцца да свайго дваццаць сёмага з'езда, гэтыя прарочыя словы набываюць яшчэ адно адценне: Камуністычная партыя адзіная ў свеце, што вядзе народы да Вясны чалавецтва — да камунізму.

І, нарэшце, май 1945 года.

Вяртаючыся вясной сорак пятага з далёкага Свярдлоўска, дзе ляжаў у шпіталі, я затрымаўся на святочныя дні ў Маскве.

О, які гэта быў незвычайны Май!

Напярэдадні свята ў Маскве было адменена «зацямненне». І як толькі змрок апусціўся на вялікі непераможны горад, яго вуліцы і плошчы заліла паводка святочных агнёў — як да вайны!

Мы падняліся на дах гасцініцы «Масква» — тут ужо на пляцоўцы, дзе зараз моднае кафэ, сабралася шмат людзей, усё больш вайскоўцы. Сталіца ўнізе зіхацела і пералівалася вясёлкавымі колерамі, здавалася, што гэта навечна засвяціліся агні Пераможнага салюта...

А салют быў на другі дзень Мая — логава фашысцкага рэйха Берлін быў павержаны...

Да свята Перамогі заставалася сем дзён—тыдзень.

І ёсць заканамерная сімвалічнасць у тым, што перамога савецкага народа над самым змрочным і пачварным злом XX стагоддзя — фашызмам — выпала менавіта на Май.

Пятро ВАСІЛЕЎСКІ,
ветэран Айчыннай вайны.

З ВЕРАЙ У ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ

«Скажу я заўсёды таварышу-другу — ніколі, ніколі табе не памерці, калі ты душою, як крэпасць над Бугам, калі гэта крэпасць жыве ў тваім сэрцы» — менавіта гэтыя словы Петруся Броўкі прагучалі лейтматывам на двухдзённай Усесаюзнай навукова-практычнай канферэнцыі «Адлюстраванне подзвігу абаронцаў Брэсцкай крэпасці ў літаратуры і мастацтве», прысвечанай 40-годдзю Вялікай Перамогі, у Брэсцкім педагагічным інстытуце імя А. С. Пушкіна.

Мерапрыемства арганізавалі і правялі кафедра рускай і замежнай літаратуры ВНУ і абласное педагагічнае таварыства.

На канферэнцыі выступілі вучоныя з Магілёўскага педінстытута імя А. Куляшова, Тэлаўскага педінстытута, Днепрапятроўскага універсітэта, мясцовыя даследчыкі літаратуры, мастакі, пісьменнікі.

У час канферэнцыі працавала выстаўка карцін аб Брэсцкай крэпасці мастакоў М. Чурабы і І. Ламакіна.

Удзел у канферэнцыі прымалі выкладчыкі і навучэнцы музычных вучылішчаў, гурткоўцы Палаца піянераў.

Артысты абласнога драматычнага тэатра імя ЛКСМБ паказалі ўрыўкі са спектакля па п'есе «Брэсцкая крэпасць» К. Губарэвіча.

В. ТАРАСЮК.

ЛЕГЕНДАРНЫ ОТА ШМІТ

Ёсць нямала выдатных людзей, імёны якіх яшчэ пры іхнім жыцці гучаць на вуснах усяго чалавецтва. Да іх адносіцца і вучоны з сусветным імем, буйны грамадскі дзеяч Ота Юльевіч Шміт. Як вядома, асаблівая слава прыйшла да яго пасля таго, як была ажыццёўлена легендарная адысея «Чалюскіна». Аднак гэта толькі адзін з самых важных момантаў з жыцця палярнага даследчыка, якому даводзілася неаднойчы і ў самых выключных абставінах прымаць вызначальныя рашэнні.

Наколькі шматгранным быў воблік гэтага легендарнага чалавека, як самааддана служыў ён Радзіме і народу, пра жыццёвы і навуковы шлях першапраходцы расказваецца ў альбоме-нарысе «Ота Шміт», выпушчаным выдавецтвам «Беларусь» па заказе творчай студыі «Фота і жыццё» Саюза журналістаў БССР.

Серыя «Жыццё — подзвіг», у якой выйшла яна, добра вялома ўсім, хто хоча больш ведаць пра знакамітых людзей свайго краю. У розны час у гэтых выданнях расказвалася пра Пятра Купрыянава і Пятра Клімука, Уладзіміра Кавалёнка і Івана Ралько, герояў Вялікай Айчыннай вайны, знакамітых вучоных, што нарадзіліся на тэрыторыі рэспублікі.

На гэты раз пра ўраджэнца Магілёва Ота Шміта гаворыць журналіст А. Ледзянёў, а дапаўняюць гэты расказ сорак два здымкі — фота, зробленыя пры жыцці Ота Юльевіча, рэпрадукцыі яго дакументаў, у тым ліку Указа Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 27 чэрвеня 1937 года аб прысваенні звання Героя Савецкага Саюза, іншыя матэрыялы.

Цяпер у серыі «Жыццё — подзвіг» рыхтуюцца чарговыя альбомы-нарысы. Адзін з іх раскажа пра Героя Савецкага Саюза Мікалая Чэпіка, які гераічна загінуў у Афганістане, выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак.

Ю. РОСІЧ.

ДВОЙЧЫ... СТАРШЫНЯ

З 1980 года ўзначальвае первічную арганізацыю таварыства кнігалюбаў калгаса імя Маякоўскага Навагрудскага раёна старшыня гэтай гаспадаркі Уладзімір Сянюта. З маленства пасябраваў ён з кнігай, асабліва палюбіў паэзію. Студэнтам Гродзенскага сельскагаспадарчага інстытута наведваў вечары паэзіі, шмат займаўся самаадукацыяй.

Цяпер у асабістай бібліятэцы У. Сянюты налічваецца звыш трох тысяч экземпляраў кніг. Ён праводзіць вялікую работу па прапагандзе літаратуры: у калгасе штогод праводзяцца святы кнігі, вечары паэзіі, прысвечаныя У. Маякоўскаму, дзейнічае народны кніжны кіёск.

Грамадскай дзейнасці У. Сянюты прысвечана брашура Алеся Шлега «Старшыня», якая па ініцыятыве рэспубліканскага праўлення ДТК БССР выйшла ў выдавецтве «Полымя».

А. ПАНАСЕНКА

ВІНШУЕМ!

За вялікі ўклад у развіццё кінамастацтва, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў кінарэжысёру-пастаноўшчыку кінастудыі «Беларусьфільм» заслужанаму дзеячу мастацтваў Беларускай ССР ДАБРАЛЮБАВУ Ігару Міхайлавічу ганаровае званне народнага артыста Беларускай ССР.

●

За вялікі ўклад у развіццё кінамастацтва, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў першаму сакратару праўлення Саюза кінематаграфістаў Беларускай ССР, кінарэжысёру-пастаноўшчыку кінастудыі «Беларусьфільм» КАРПАВУ Аляксандру Якаўлевічу ганаровае званне заслужанага дзеяча мастацтваў Беларускай ССР.

●

За дасягненне высокіх творчых і вытворчых паказчыкаў, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР: БУЛЕВІЧА Яўгена Аляксеевіча — дырэктара Браслаўскай раённай кінасеткі, ДРАКУ Аляксандра Тадэвушавіча — начальніка ўпраўлення кінафікацыі выканкома Гродзенскага абласнога Савета народных дэпутатаў, ЛІСАФ'ЕВА Аляксея Сцяпанавіча — загадчыка Лідскага міжраённага аддзялення кінапракату, НІКІФАРАВА Вячаслава Аляксандравіча — кінарэжысёра-пастаноўшчыка кінастудыі «Беларусьфільм», НІКАЛАЙЧЫКА Аляксея Іванавіча — дырэктара Лельчыцкай раённай кінасеткі, ПТАШНІКА Пятра Сцяпанавіча — кінамеханіка Вілейскай дырэкцыі раённай кінасеткі, РЭУКОЎСКУЮ Зінаіду Канстанцінаўну — кінамеханіка Баранавіцкай дырэкцыі раённай кінасеткі, СТРАЛЬЦОВА Уладзіміра Міхайлавіча — кінарэжысёра кінастудыі «Беларусьфільм», ШЧАСНУЮ Рыту Сцяпанаўну — начальніка аддзела Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па кінематаграфіі; Граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР: АКСЕНАВУ Святлану Фёдараўну — мантажніцу кінастудыі «Беларусьфільм», АЛАЯ Анатоля Іванавіча — кінааператара кінастудыі «Беларусьфільм», БУКСМАНА Леаніда Іванавіча — токара мінскага завода «Кінадэталь», УРУБЛЕЎСКУЮ Тамару Усцінаўну — кінамеханіка кінатэатра «Радзіма», гор. Мінск, ГНУСКОВУ Надзею Васільеўну — метадыста Гомельскай абласной канторы кінапракату, ГАРАЧАВА Мікалая Андрэевіча — следсара Віцебскай абласной канторы кінапракату, ЖУК Галіну Андрэеўну — начальніка аддзела Мінскай абласной і гарадской канторы кінапракату, КАЛІНІЧЭНКУ Яўгенію Сяргееўну — кінамеханіка Добрушскай дырэкцыі раённай кінасеткі, КОГАЛЯ Фёдара Пракопавіча — кінамеханіка Сенненскай дырэкцыі раённай кінасеткі, КУЗАЎКОВА Васіля Епіфанавіча — кінамеханіка Горацкай дырэкцыі раённай кінасеткі, ЛАЎРОВА Уладзіміра Іванавіча — начальніка аддзела Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па кінематаграфіі, МАЦІЕВІЧА Казіміра Іосіфавіча — дырэктара Слонімскай раённай кінасеткі, МНАЦАКАНЯНА Азарыя Баграта віча — начальніка цэха кінастудыі «Беларусьфільм», НЯДЗВЕДСКУЮ Вальдаміру Казіміраўну — старшага рэдактара Магілёўскай абласной канторы кінапракату, ШУБСКАГА Леаніда Леанідавіча — вадзіцеля аўтамабіля Брэсцкай абласной канторы кінапракату.

●

За вялікі ўклад у вырашэнне сацыяльна-эканамічных і палітыка-выхаваўчых задач, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР прысвоіў ганаровае званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг.: ВАРЫНУ Аляксандру Яфімавічу — загадчыку рэдакцыі выдавецтва «Беларусь», МІХАЛЕВУ Фёдару Сцяпанавічу — рэферэнту Гомельскай абласной арганізацыі таварыства «Веды», ТОЛКАЧУ Уладзіміру Аляксеевічу — адказнаму сакратару рэдакцыі абласной газеты «Гродненская правда», ЯЦКО Уладзіміру Нікітавічу — галоўнаму рэдактару Дзяржаўнага камітэта Беларускай ССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю.

Да 80-годдзя III з'езда РСДРП

«ПАРТЫЙНАСЦЬ ПЕРАМАГЛА ГУРТКАЎШЧЫНУ...»

Першая расійская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя абудзіла да палітычнага жыцця шырокія масы рабочых і сялян, іншыя пласты насельніцтва, — гаворыцца ў пастанове ЦК КПСС «Аб 80-годдзі рэвалюцыі 1905—1907 гадоў у Расіі», — азнаменавала пачатак новага гістарычнага перыяду— перыяду глыбокіх сацыяльных хваляванняў і рэвалюцыйных бітваў. Велізарны ўплыў на разгортванне народнай рэвалюцыі аказаў Трэці з'езд РСДРП.

Ён адбыўся ў Лондане з 25 красавіка па 10 мая 1905 г. і праходзіў ва ўмовах бурнага ўздыму рэвалюцыйнай барацьбы пралетарыяту і сялянства ў Расіі, у тым ліку і ў Беларусі. Напрыклад, у студзеньскім стачачным руху салідарнасці з барацьбой пралетарыяту Пецярбурга ўдзельнічала 34 тыс. рабочых Беларусі. Бальшавікі павінны былі выпрацаваць правільную палітычную лінію ў нарастаючай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Перад партыяй паўсталі велізарныя, грандыёзныя задачы арганізацыі паўстання, канцэнтрацыі рэвалюцыйных сіл пралетарыяту, згуртавання іх з сіламі ўсяго рэвалюцыйнага народа, утварэнне часовага рэвалюцыйнага ўрада. Рэвалюцыя высунула перад расійскай сацыял-дэмакратыяй такія патрабаванні, — указваў У. І. Ленін,— «якіх ні разу яшчэ і нідзе не ставіла гісторыя перад рабочай партыяй у эпоху дэмакратычнага перавароту». Гэта патрабавала ад РСДРП умацавання сваіх радоў.

Але партыя перажывала крызіс, яна фактычна была расколатай на бальшавікоў і меншавікоў. Аксельрод, Мартаў, Троцкі і іншыя меншавікі ўтварылі антыпартыйную арганізацыю. Яны паставілі мэту — узяць кіраўніцтва партыяй у свае рукі і павесці яе па шляху апартунізму. У лістападзе 1903 г. раскольнікі захапілі «Искру» і ператварылі газету ў фракцыйны орган, у сродак барацьбы супраць бальшавікоў — найбольш паслядоўных выразнікаў інтарэсаў рабочага класа і сялянства.

Адзіным надзейным сродкам утаймавання дэзарганізатараў, захавання згуртаванасці партыі з'яўлялася скліканне з'езда. У. І. Ленін яшчэ ў снежні 1903 г. патрабаваў неадкладнага правядзення партыйнага з'езда. Важнымі крокамі ў яго падрыхтоўцы з'явілася ўтварэнне Бюро камітэтаў большасці і выданне газеты «Вперед». На яе старонках У. І. Ленін апублікаваў больш чым 40 артыкулаў і нататак, у якіх выклаў стратэгічную і тактычную лінію бальшавікоў па галоўных пытаннях рэвалюцыі.

У сацыял-дэмакратычных арганізацыях Расіі распачалася вострая ідэйная барацьба па пытанні аб скліканні трэцяга з'езда партыі. У сувязі з гэтым У. І. Ленін і заграніччны партыйны цэнтр удзялялі вялікую ўвагу Палескаму і Паўночна-Заходняму камітэтам РСДРП, якія кіравалі дзейнасцю сацыял-дэмакратычных арганізацый Беларусі.

Напрыклад, 15 жніўня 1904 г. У. І. Ленін накіраваў пісьмо з Жэневы ў Гомель старшыні Палескага камітэта РСДРП М. К. Уладзіміраву. Ён тлумачыў цяжкае становішча, якое склалася ў партыі ў выніку раскольніцкіх дзеянняў меншавікоў і заклікаў падтрымаць рашэнне аб неадкладным скліканні з'езда.

Мінская група РСДРП 26 студзеня 1905 г. прыняла рэзалюцыю, у якой выказалася за падтрымку правядзення з'езда. 5 сакавіка 1905 г. з такой жа рэзалюцыяй выступіў Палескі камітэт. Гэтую прапанову пасля некаторых хістанняў падтрымаў і Паўночна-Заходні камітэт. Яны паслалі на з'езд сваіх дэлегатаў — М. К. Уладзіміра і Д. С. Пасталоўскага з рашаючым і Р. Л. Шклоўскага з дарадчым голасам ад Мінскай групы РСДРП. Іх удзел у рабоце з'езда меў агромністае значэнне для вызначэння бальшавіцкай лініі гэтых камітэтаў у рэвалюцыі, развіцця рэвалюцыйнага руху ў краі.

Усяго на з'ездзе прысутнічала 24 дэлегаты з рашаючым і 14 з дарадчым голасам. На з'езд былі запрошаны ўсе арганізацыі РСДРП. Але меншавікі адмовіліся прыняць удзел у рабоце трэцяга з'езда і сабраліся асобна ў Жэневе. З-за малалікасці дэлегатаў яны не адважыліся назваць сваё зборышча з'ездам і аб'явілі яго канферэнцыяй партыйных работнікаў. У сувязі з гэтым У. І. Ленін заявіў: «...Мы можам радавацца поўнай маральнай перамозе! Расія ўзяла верх над заграніччнікамі. Партыйнасць перамагла гурткаўшчыну».

Старшынёю трэцяга з'езда быў абраны У. І. Ленін. Ён з'яўляўся, як гаворыцца, душой з'езда. Энергічна кіраваў усёй яго работай. У пратакольных запісах з'езда зафіксіравана да 170 выступленняў, прапаноў і рэплік Уладзіміра Ільіча. Фактычна ён быў аўтарам ці сааўтарам усіх асноўных дакладаў і рэзалюцый.

З'езд разгледзеў карэнныя пытанні першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі. Усяго было абмеркавана 14 пытанняў. Важнейшымі з іх з'яўляліся тактычныя — аб узброеным паўстанні, адносінах да палітыкі ўрада напярэдадні і ў самы момант перавароту, адносінах да сялянскага руху; арганізацыйныя, звязаныя з прыняццем новай рэдакцыі Статута партыі, і пытанні аб адносінах да другіх партый і плыней. Ён вызначыў стратэгічны план партыі, разлічаны на перамогу буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі. Гэта абазначала звяржэнне самаўладдзя і ўстанаўленне дэмакратычнай рэспублікі, ліквідацыю ўсіх рэштак прыгонніцтва. Рухаючай сілай, гегемонам у рэвалюцыі з'яўляўся пралетарыят у саюзе з усім сялянствам, які пасля перамогі павінен быў весці барацьбу за неадкладнае перарастанне яе ў рэвалюцыю сацыялістычную.

Для рэалізацыі стратэгічнага плана з'езд распрацаваў і тактычную лінію партыі, высунуў на першы план арганізацыю ўзброенага паўстання. Упершыню пасля смерці Маркса і Энгельса бальшавіцкая партыя разглядала на з'ездзе ў якасці практычнай праблему ўзброенага паўстання. Гэта мела агромністае значэнне не толькі для рэвалюцыйных сіл Расіі, але і для ўсёй міжнароднай пралетарскай барацьбы.

У духу творчага марксізму і ў непарыўнай сувязі з задачай падрыхтоўкі ўзброенага паўстання абмяркоўвалася і пытанне аб будучай уладзе, як цэнтральнай задачы рэвалюцыі. Бальшавікі лічылі, што новы ўрад павінен быць рэвалюцыйна-дэмакратычнай дыктатурай пралетарыяту і сялянства, гэта значыць урадам перамогшых класаў. Ён павінен быў у поўным аб'ёме ажыццявіць рэвалюцыйна-дэмакратычныя пераўтварэнні і зрабіць умовы для шырокай барацьбы мас за сацыялізм.

З дакладам па гэтым пытанні выступіў У. І. Ленін. Калі ён яго закончыў, «авацыям і апладысментам не было канца, — успамінаў адзін з дэлегатаў з'езда. — Перад намі стаяў вялікі рэвалюцыянер, тэарэтык і трыбун».

У. І. Ленін выступіў на з'ездзе і з дакладам аб адносінах да сялянскага руху. Ён абгрунтаваў ідэю саюза рабочага класа з усім сялянствам у буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі і будучага саюза пралетарыяту з бяднейшымі пластамі вёскі на сацыялістычным этапе рэвалюцыі. З'езд выказаўся за падтрымку рэвалюцыйных патрабаванняў сялян, уключаючы і канфіскацыю памешчыцкіх, казённых, царкоўных і іншых зямель. Гэтае рашэнне было накіравана на разгортванне барацьбы сялянства супраць самаўладдзя.

Трэці з'езд разгледзеў пытанні аб адносінах да часткі РСДРП (меншавікоў), што адкалоліся, нацыянальных сацыял-дэмакратычных арганізацый, лібералаў і эсэраў. З'езд асудзіў апартуністычныя погляды меншавікоў па арганізацыйных пытаннях. Аднак, улічваючы жыццёвую неабходнасць аб'яднання пралетарыяту ў рэвалюцыі, з'езд прызнаў дапушчальным удзел у рабоце партыйных арганізацый меншавікоў, і перш за ўсё рабочых. Абавязковай умовай такога аб'яднання з'яўлялася іх падпарадкаванне рашэнням партыйных з'ездаў і Статуту, партыйнай дысцыпліне.

З'езд унёс шэраг прынцыповых змяненняў у Статут партыі. Ён аднадушна адмяніў старую фармуліроўку першага параграфа Статута і запісаў яго ў ленінскай рэдакцыі. Згодна з ёю членам партыі мог з'яўляцца толькі той, хто прымаў праграму, падтрымліваў партыю матэрыяльнымі сродкамі і ўдзельнічаў асабістай працай у адной з яе арганізацый. Мартаўская фармуліроўка першага параграфа Статута была адкінута самім жыццём, рэвалюцыйнай практыкай.

З'езд ухіліў сістэму двух цэнтраў і выбраў адзіны кіруючы орган — Цэнтральны Камітэт на чале з У. І. Леніным. Функцыі ЦК значна пашыраліся. На яго ўскладалася задача ажыццяўлення не толькі арганізацыйнага, але і ідэйна-палітычнага кіраўніцтва партыяй.

У абмеркаванні ўсіх пытанняў парадку дня трэцяга з'езда актыўна ўдзельнічалі і дэлегаты Палескага і Паўночна-Заходняга камітэтаў, ад Мінскай групы РСДРП. Напрыклад, М. К. Уладзіміраў на з'ездзе браў слова 12 разоў. Ён падтрымаў ленінскую рэзалюцыю аб узброеным паўстанні і часовым рэвалюцыйным урадзе. Але па пытанні аб адносінах да нацыянальных сацыял-дэмакратычных арганізацый ён заняў няправільную пазіцыю. М. К. Уладзіміраў прапаноўваў даць Бунду аўтаномію ў партыі і не весці з ім барацьбы, якая быццам азлабляе бундаўцаў.

Іншай думкі быў Р. Л. Шклоўскі. Калі ён гаварыў аб тым, што «асобная яўрэйская арганізацыя з больш ці менш шырокай аўтаноміяй рана ці позна павінна знікнуць», У. І. Ленін на гэта звярнуў увагу дэлегатаў з'езда рэплікай: «Слухайце, слухайце!..»

У цэлым Трэці з'езд РСДРП замацаваў у сваіх рашэннях палітычныя і арганізацыйныя прынцыпы бальшавізму па найважнейшых пытаннях тактыкі партыі і партыйнага будаўніцтва. Ён адзначыў гістарычную перамогу бальшавізму. З'езд творча развіў вучэнне марксізму ў новых гістарычных умовах эпохі імперыялізму. Замацаваў ленінскае вучэнне аб новым тыпе буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі, у якой рухаючай сілай з'яўляўся пралетарыят у саюзе з сялянствам. Яго ідэі і рашэнні, вытрымаўшыя праверку часам, увайшлі ў скарбніцу марксізму-ленінізму і цяпер захоўваюць станоўчае значэнне для народаў, якія выступаюць за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне, сацыялізм і мір.

Уладзімір МІХНЮК,
кандыдат гістарычных навук.

НЕ ПАЎТОРЫЦЦА, НЕ ЗАБУДЗЕЦЦА!

На фоне зялёнага лесу так добра знаёмы кожнаму фрагмент мемарыяльнага комплексу «Хатынь» — стары на знясіленых руках трымае мёртвае дзіця. Унізе словы: замежныя аўтары. І поруч пералік прозвішчаў. Яшчэ крыху ніжэй назва «Гэта не павінна паўтарыцца!» Так выдавецтва «Прогресс» аформіла супервокладку чарговай кнігі, змест якой склалі ўражанні замежных пісьменнікаў і журналістаў ад наведвання СССР.

Падарожна-публіцыстычныя зборнікі іх выпускаліся на розных мовах выдавецтвам на працягу 1978—1984 года ў серыі «Сведчанні аб СССР». Цяпер выданне для рускамоўнага чытача: ва ўрыўках з ранейшых кніг змешчаны матэрыялы, што даюць адчуць стаўленне замежных аўтараў да Савецкай краіны і нашага народа, іх разуменне таго, што перажыў ён у час барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Ва ўступным артыкуле «Ці хочуць рускія вайны?» старшыня Савецкага камітэта абароны міру, вядомы савецкі журналіст-міжнароднік Ю. Жукаў падрабязна расказвае і пра аўтараў кніг, і пра тое, якім падчас няпростым шляхам ішлі яны да разумення ролі Савецкага Саюза ў разгроме нямецкага фашызму, выратаванні ўсяго чалавецтва ад закабалення.

Паасобныя з іх гавораць і пра шматпакутную беларускую зямлю, якая ў гады Вялікай Айчыннай вайны ператварылася ў партызанскую рэспубліку. Асабліва многа беларускага матэрыялу ў кнізе галандскага пісьменніка Дзіка Валды «Свінец у мандарынах». У прадмове аўтар так растлумачвае свой намер пабываць там, дзе асабліва жорстка бясчынствавалі фашысцкія акупанты: «Людзі майго пакалення аб другой сусветнай вайне ведаюць у асноўным па кнігах і кінафільмах. Але ні адна кніга, ніводзін кінафільм не дадуць аб вайне такога яркага ўяўлення, як расказы ветэранаў, якіх, аднак, з кожным годам застаецца ўсё меней. Менавіта таму я паставіў перад сабой мэту — сустрэцца ў СССР з людзьмі, якія на сваіх плячах вынеслі цяжар вайны, і запісаць іх успаміны. Спадзяюся, што яны паслужаць свайго роду дапаўненнем у летапіс вайны, нядаўна паказаны заходнім тэлебачаннем: я маю на ўвазе дакументальны кінафільм «Вялікая Айчынная», названы амерыканцамі «Невядомая вайна».

Кніга Д. Валды пабудавана ў форме гутарак з жыхарамі Беларусі, Украіны і Масквы, хто прымаў актыўны ўдзел у барацьбе з фашысцкімі захопнікамі. У нашай рэспубліцы пісьменнік сустрэўся з рознымі людзьмі. Паступова з разрозненых успамінаў паўстае праўдзівая і суровая карціна ўсенароднай барацьбы. Менавіта — усенароднай, бо ў дзеючую армію, у партызаны, у падполле ішлі ад старога да малога. Д. Валда найперш і акцэнтуе ўвагу на згадках тых, хто ў час вайны быў падлеткам.

Заходненямецкі пісьменнік Эміль Карлебах, у адрозненне ад Д. Валды, добра ведае, што значыць фашызм: з 1934 па 1945 год быў вязнем фашысцкіх лагераў смерці Дахаў і Бухенвальд і толькі цудам выжыў. Зразумела, што на старонках сваёй кнігі «Мы і Савецкі Саюз» (у зборнік «Гэта не павінна паўтарыцца!» увайшлі з яе ўрыўкі) публіцыстычна востра выкрывае чалавеканенавісніцкую ідэалогію фашызму, раскрывае тую вялікую ролю Савецкай Арміі, якая не толькі выгнала ворага з акупіраванай тэрыторыі, а і выканала інтэрнацыянальны абавязак, выратаваўшы ад чумы нямецкага фашызму народы Заходняй Еўропы. Нашай рэспубліцы прысвечаны спецыяльны раздзел «Беларусь, адроджаная з руінаў».

Цікавая біяграфія бельгійскага пісьменніка Людо Ван Эка. У час другой сусветнай вайны ён са зброяй у руках змагаўся з фашызмам, перажыў пакуты ў канцлагеры Дахаў. І вось ветэран вайны едзе ў Савецкі Саюз, каб, як і іншыя аўтары, знайсці адказ на пытанне: «Ці хочуць рускія вайны?»

Раздзел з кнігі Л. В. Эка «Дыктатура ці дэмакратыя» так і называецца — «Ці хочуць рускія напасці на Заходнюю Еўропу?» Першае знаёмства—з Беларуссю. З пагранічным Брэстам і яго легендарнай крэпасцю, з Віцебскам і Хатынню. «У Савецкім Саюзе вайна лічыцца непрымальным сродкам для вырашэння разыходжанняў паміж народамі»,—робіць адзіна правільны вывад пісьменнік і звяртаецца да тых замежных грамадзян, у каго яшчэ будзе магчымасць прыехаць да нас: «Падарожнічаючы па Савецкім Саюзе, не забудзьце наведаць помнікі ахвярам вайны. І піша пра тое, што «не выношваюць планаў новай вайны там, дзе так многа помнікаў загінуўшым».

Пад гэтымі словамі могуць падпісацца і іншыя аўтары, што прадстаўлены на старонках зборніка «Гэта не павінна паўтарыцца!» Усе яны ўпэўнены: «Мінулае не паўторыцца! Не забудзецца!», калі ўсе народы будуць жыць у міры і дружбе.

Г. ТРУСЕВІЧ.

ПОСТУП ТЫДНЯ

КРЫНІЦА НАТХНЕННЯ—ПЕРАМОГА

Вось ужо сорак гадоў тэма подзвігу савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, велічы духу савецкага чалавека застаецца адной з галоўных, вядучых у творчасці дзеячаў літаратуры і мастацтва. Ствараемы імі сёння мастацкі і дакументальны летапіс Вялікай Айчыннай — гэта не толькі даніна памяці дваццаці мільёнам, чыё жыццё пакладзена на алтар Перамогі, але і неацэнны падручнік мужнасці і вернасці Радзіме для новых пакаленняў, зброя ў барацьбе за мір.

Аб гэтым гаварылі ўдзельнікі ўрачыстага аб'яднанага пленума праўлення саюзаў пісьменнікаў, журналістаў, мастакоў, архітэктараў, кампазітараў, кінематаграфістаў рэспублікі, Беларускага тэатральнага аб'яднання, прысвечанага 40-годдзю Перамогі. Ён адбыўся 25 красавіка ў Мінску.

Адкрыў пленум старшыня праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, народны паэт Беларусі Максім Танк.

З вялікім натхненнем быў выбран ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

Выступаўшыя адзначалі важкі ўклад майстроў культуры рэспублікі ў агульнасаюзны мастацкі летапіс Вялікай Айчыннай, падкрэслівалі значнасць і маштабнасць творчых задач, якія неабходна вырашаць сёння.

Мастацкая інтэлігенцыя—пісьменнікі, кампазітары, мастакі, работнікі тэатра і кіно — карыстаецца вялікім аўтарытэтам і прызнаннем. Але адсюль вынікае і іх велізарная адказнасць перад грамадствам. Усё лепшае, што створана савецкай літаратурай і мастацтвам, заўсёды было неаддзельнае ад галоўных спраў і клопатаў партыі і народа.

Задачы, пастаўленыя перад мастацкай інтэлігенцыяй краіны красавіцкім (1985 г.) Пленумам ЦК КПСС, знайшлі гарачы водгук сярод дзеячаў літаратуры і мастацтва Савецкай Беларусі. Яны аднадушна выказалі гатоўнасць і ў далейшым аддаваць усе свае сілы і талент служэнню высакародным ідэалам камунізму, барацьбе за мір і шчасце людзей.

Удзельнікі пленума накіравалі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС.

У рабоце пленума прынялі ўдзел таварышы М. М. Слюнькоў, І. Я. Палякоў, Г. Г. Барташэвіч, В. Г. Балуеў, А. Т. Кузьмін, М. І. Лагір, М. Н. Полазаў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР Н. М. Мазай.

Справаздача аб рабоце пленума будзе апублікавана.

БЕЛТА.

ЗАДАЧЫ КНІГАЛЮБАЎ

40-годдзю Вялікай Перамогі быў прысвечаны злёт прапагандыстаў кнігі Мінска і Мінскай вобласці, які правялі аблкнігагандаль, гарадская і абласная арганізацыі таварыства кнігалюбаў. Дакладчык — дырэктар мінскага аблкнігагандлю В. Лапцёнак, а таксама намеснік старшыні клуба кнігалюбаў «Слава» Дома афіцэраў Г. Суслаў, дырэктар народнага кніжнага магазіна вытворчага аб'яднання «Інтэграл» А. Кашын, вучаніца СШ № 150 Н. Бляк і іншыя расказвалі аб вялікай ролі кнігі ў адлюстраванні подзвігу савецкага народа ў барацьбе з ворагам, у ваенна - патрыятычным выхаванні падрастаючага пакалення. Гаварылася аб вопыце работы па прапагандзе і распаўсюджванні кнігі сярод чытачоў. Лепшым прапагандыстам былі ўручаны кнігі.

У злёце прымалі ўдзел і выступілі паэт У. Карызна, кампазітар Э. Зарыцкі, спявак Я. Еўдакімаў.

А. ПАШКЕВІЧ.

ВАЧАМІ СЯБРОЎ

ПРЫЯЗНА, АБ'ЕКТЫЎНА

21 красавіка споўнілася 40 год з дня падпісання Дагавора аб дружбе, узаемнай дапамозе і пасляваенным супрацоўніцтве паміж Савецкім Саюзам і Польскай Народнай Рэспублікай. Гэты гістарычны дакумент, абноўлены ў 1965 годзе, садзейнічаў і садзейнічае плённаму развіццю сяброўскіх сувязей у самых розных галінах гаспадарчага і культурнага жыцця — у тым ліку паміж вучонымі, пісьменнікамі.

Важкі ўклад ва ўмацаванне дружбы суседніх народаў уносяць беларускія і польскія літаратуразнаўцы. Красамоўным сведчаннем таго з'яўляецца своеасаблівая анталогія «Савецкая паланістыка», выдадзеная сёлета ў Варшаве дзякуючы клопатам вядомага польскага славіста прафесара Базыля Белаказовіча. У яе ўключаны працы 44 савецкіх паланістаў. У іх ліку — і беларусы: Валянціна Гапава, Уладзімір Казбярук, Святлана Мусіенка, Святлана Спас і інш. Супастаўленыя разам, іх даследаванні даюць зарубежнаму чытачу шырокую панараму развіцця беларуска-польскага літаратурнага ўзаемадзеяння ад XVIII стагоддзя да нашых дзён.

У сваю чаргу беларуская праблематыка ўсё часцей займае польскіх славістаў. Сярод іх сёння хочацца вылучыць прафесара Вроцлаўскага універсітэта Францішка Сяліцкага, дарэчы, ураджэнца Беларусі. Летась ён парадаваў нас кніжкай пра беларускі фальклор, якая ўжо рэцэнзавалася на старонках «Літаратуры і мастацтва». Сёлета ж у Варшаве ўбачыў свет яго падручнік для студэнтаў «Беларуская літаратура да канца XVIII стагоддзя». Гэта першае зарубежнае выданне, спецыяльна прысвечанае старажытнай беларускай літаратуры.

У прадмове да сваёй працы Ф. Сяліцкі падкрэслівае, што беларуская і польская культуры старажытнага перыяду развіваліся ў цеснай сувязі, абумоўленай агульнасцю гістарычных лёсаў абодвух народаў у XV—XVIII стагоддзях. Нягледзячы на істотныя адрозненні ў іх традыцыях, рэлігійнай належнасці, паміж беларускай і польскай літаратурамі ўстанавіліся тады кантакты, якія выявіліся ў перакладах, агульнай тэматыцы, уплывах. Прытым уплывы гэтыя, як вынікае з прыведзеных у падручніку фактаў, былі двухбаковыя. Беларуская літаратура, сцвярджае аўтар, падсумоўваючы гаворку, «не была літаратурай беднай, як меркавалі да нядаўняга часу». Яна магла не толькі ўспрымаць, але і ўздзейнічаць. Старажытная беларуская літаратура, багаты беларускі фальклор уваходзілі ў свядомасць тых польскіх пісьменнікаў (Сяліцкі тут згадвае Ф. Багамольца, Ф. Князьніна, Ф. Карпінскага, А. Нарушэвіча), якія нарадзіліся або жылі на тэрыторыі Беларусі і прыдавалі яе літаратуры шматмоўны характар.

Разглядаючы старажытны перыяд нашай літаратуры, Ф. Сяліцкі ў асноўным абапіраецца (і гэта адзначана ў шматлікіх спасылках) на выданні, падрыхтаваныя ў Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР. Грунтоўна і аб'ектыўна сказана ў падручніку пра дасягненні агульнай для ўсіх усходніх славян літаратуры Кіеўскай Русі, пра старажытныя летапісы і перакладныя творы. Даволі падрабязна разгледжана творчасць Міколы Гусоўскага (Сяліцкі, у адрозненне ад некаторых іншых даследчыкаў, не ставіць пад сумненне яго «беларускасць»), Мялеція Смятрыцкага, Афанасія Філіповіча, Сімяона Полацкага, чаго нельга сказаць пра Сымона Буднага і Васіля Цяпінскага, чые постаці выглядаюць тут некалькі збеднена. Агульныя палажэнні падмацоўваюцца ў падручніку шматлікімі цытатамі, якія прыводзяцца ў арыгінальным гучанні.

Вельмі высока ацэньвае Сяліцкі дзейнасць Францыска Скарыны. Прадмовы і пасляслоўі да Скарынавых выданняў характарызуюць яго як «чалавека адукаванага і асвечанага, ставяць яго ў шэраг ранніх еўрапейскіх гуманістаў». Погляды Скарыны вызначаліся рэнесанснай шырынёй, талерантнасцю ў пытаннях рэлігіі. Характарызуючы мову нашага першадрукара, аўтар адзначае, што ў ёй, пры ўсёй стараславянскай аснове, «ужо ёсць многа элементаў беларускай мовы, якая тады фармавалася».

Ф. Сяліцкі не толькі падсумоўвае тое, што было сказана да яго, але і прыводзіць новыя факты (напрыклад, пра перакладную літаратуру XVIII стагоддзя), прапануе новыя трактоўкі (не ўсе з іх бясспрэчныя). У адпаведнасці з традыцыяй, прынятай у польскім літаратуразнаўстве, вроцлаўскі славіст разглядае беларускую літаратуру не па перыядах, якія вызначаюцца сваімі сацыяльнымі і мастацкімі асаблівасцямі, а па стагоддзях. У адных выпадках гэта дае станоўчы вынік (больш відочнымі становяцца этапы ў развіцці перакладной справы, значнасць уласна мастацкай літаратуры XVIII ст.), у другіх — адмоўны (у розных раздзелах аказалася творчасць пісьменнікаў-палемістаў). На жаль, у падручнік пракраліся асобныя фактычныя недакладнасці. «Жыціе Аўрамія Смаленскага» названа ананімным творам, хоць вядомы яго аўтар — манах Яфрэм. Патрабуюць удакладнення гады жыцця Ефрасінні Полацкай і Мялеція Смятрыцкага.

Паколькі гаворка ўжо зайшла пра даты жыцця, хочацца папалемізаваць з прафесарам Сяліцкім таксама адносна адной мясціны ў яго раздзеле пра Скарыну. У большасці беларускіх крыніц, у тым ліку энцыклапедычных, сцвярджаецца, што беларускі першадрукар нарадзіўся каля 1490 года. М. Шчакаціхін, устанаўліваючы сувязь паміж «выдавецкім знакам» Скарыны і поўным зацьменнем сонца ў Полацку, калісьці «прывязваў» гэтую дату да сакавіка 1486 года. Сяліцкі ж падае трэцюю дату, блізкую да другой, — «каля 1485». Прытым прамыя аргументы на карысць новай версіі ў кнізе не прыводзяцца. Але ўскосна, па інтэрпрэтацыі іншых біяграфічных звестак, ход разважанняў аўтара зразумець можна. І зразумець прыкладна так. Першы дакументальна засведчаны факт з жыццяпісу Скарыны — яго паступленне ў 1504 годзе ў Кракаўскі універсітэт. Выкладанне там вялося тады на лацінскай мове. Скарына ж вырас у Полацку, у праваслаўным асяроддзі, якое карысталася старабеларускай і стараславянскай мовамі. Значыць, яму патрэбен быў дадатковы час, каб авалодаць латынню. І таму, выходзіць, Скарына не мог стаць студэнтам у 14 год, таму дату яго нараджэння трэба аднесці прынамсі на пяць гадоў назад... Што ж, пэўная логіка ў такой версіі ёсць. Але толькі пэўная. Трэба ўлічваць, што ў першай палавіне XVI стагоддзя можна было стаць студэнтам нават у 14 год (яркі доказ таго — класік польскай літаратуры Ян Каханоўскі), нават пасля заканчэння адной... парафіяльнай школы. Што ж датычыцца латыні, то яе Скарына, чалавек, несумненна, выключны па сваім розуме, па здольнасці авалодваць іншымі мовамі, мог вывучыць як у Вільні, дзе жыў яго старэйшы брат Іван (праўда, невядома, з якога часу), так і ў самім Полацку, дзе з 1498 года ўжо дзейнічала місія бернардынцаў (ёсць друкаваныя, хоць і не пацверджаныя яшчэ дакументальна, звесткі, што адной з першых пры ёй прыняла хрост сям'я Скарынаў). Такім чынам, рынцыпова пераглядаць «традыцыйную» дату нараджэння Францыска Скарыны, пераносіць яго пяцісотгадовы юбілей на 1985 ці 1986 год няма асаблівых падстаў — хіба што будуць знойдзены нейкія новыя дакументы.

Можна было б тут палемізаваць з Ф. Сяліцкім і адносна іншых прыватных момантаў (напрыклад, ацэнкі «Слова пра паход Ігаравы»). Аднак яны істотна не мяняюць агульнае добрае ўражанне ад кнігі. «Беларуская літаратура да канца XVIII стагоддзя» напісана добразычлівым і зацікаўленым аўтарам, які ведае і любіць свой прадмет даследавання.

Прафесар Сяліцкі апублікаваў таксама звыш дзесяці артыкулаў пра фальклор, побыт, мову, гісторыю сваёй роднай вёскі Мікуліна, што на Вілейшчыне. У іх ён шырока цытуе беларускія песні, вершы, казкі, прымаўкі, запісаныя ад сваіх землякоў, якія ў пасляваенныя гады перасяліліся на заходнія землі Польшчы. Летась у часопісе «Славіка Вراціславенсія» былі надрукаваны два новыя артыкулы з гэтага цыкла: «З гісторыі Вілейскай зямлі ў першай палавіне XIX стагоддзя» і «З гісторыі Вілейскай зямлі ў 1860—1914 гг.». У іх прыведзены невядомыя або забытыя факты, якія, безумоўна, зацікавяць беларускіх даследчыкаў,—аб прабыванні ў Даўгінаве Я. Чачота, Т. Зана, І. Дамейкі, аб пашырэнні беларускай мовы сярод тагачаснай мясцовай шляхты (тут аўтар робіць спасылкі на І. Ходзьку, пісьмо Э. Ажэшка да Ю. Сікорскага — аказваецца, у час, калі царскія ўлады забаранілі ў Гродне карыстацца польскай мовай, аўтар рамана «Над Нёманам» і яе сябры дэманстрацыйна гаварылі... па-беларуску). На падставе апублікаваных артыкулаў Ф. Сяліцкі мяркуе выдаць «манаграфічнае апрацаванне» пра вёску Мікуліна і яе ваколіцы.

Беларускай праблематыцы прысвечаны таксама грунтоўныя артыкулы Надзеі Панасюк «Некалькі заўваг аб перакладзе рамана Івана Мележа «Людзі на балоце» і Зофі Скібінскай-Харыла «Пан Тадэвуш» па-беларуску», якія апублікаваны ў Варшаве ў зборніку «Літаратура і фальклор». У першым з іх разглядаюцца тыя цяжкасці, якія мусіў пераадолець перакладчык, перастваряючы на польскай мове багатую і своеасаблівую лексіку беларускага пісьменніка. З. Скібінская-Харыла даследуе традыцыі перакладу паэмы А. Міцкевіча на польскую мову, якія ўзыходзяць да В. Дуніна-Марцінкевіча. Цікавасць беларускіх перакладчыкаў узмацнялася тым, што ў «Пане Тадэвушы» шырока прадстаўлена жыццё Навагрудчыны.

У апошні час польскія літаратуразнаўцы ўсё часцей і смялей пішуць пра ўплыў на Адама Міцкевіча беларускай рэчаіснасці, беларускай народнай творчасці. Спашлёмся для прыкладу на другое, пашыранае выданне манаграфіі Аліны Віткоўскай «Міцкевіч. Слова і дзеянне», якое нядаўна выйшла ў Варшаве. «Асмеліўшыся, — піша вядомая даследчыца, — можна выказаць назіранне, што з навагрудскага дома Мікалая Міцкевіча (бацькі паэта. — **А. М.**) бліжэй было да беларускіх сялян і іх культуры, чым да сапраўды вялікапанскіх шляхецкіх маёнткаў». І далей: «Бедны юнак з правінцыі, трапіўшы пад уплыў некалькіх асяроддзевых і нацыянальных культур, стаў вялікім літаратурным наватарам не наперакор свайму паходжанню, але якраз дзякуючы яму, дзякуючы таму шматгалоссю культуры, якое прыдало яго вуху ўспрымальнасць і да простай сялянскай — беларускай ці літоўскай — песні, і да гутаркі засцянковай шляхты, і да казкі прыдворнай прыслугі, і да «высокай» кніжнай культуры, што ішла з дамініканскай навагрудскай школы». Пад такім жа ўплывам беларускай і літоўскай народнай культуры, працягвае прафесар Віткоўская, знаходзіліся філаматы і філарэты, сябры Адама Міцкевіча па Віленскім універсітэце.

Новыя звесткі пра Беларусь, яе гісторыю і культуру ёсць таксама ў кнігах Г. Лаўмянскага «Даследаванні па гісторыі Вялікага княства Літоўскага» (Познань, 1983) і Я. Ульчынайце «Тэорыя рыторыкі ў Польшчы і на Літве ў XVII стагоддзі» (Вроцлаў, 1984). У першую з іх, выдадзеную пасля смерці аўтара, уключаны працы «Гаспадарчая структура Магілёва ў часы валочнага межавання» і «Гандаль Магілёва ў XVI стагоддзі». Абапіраючыся на багаты архіўны матэрыял, вядомы польскі гісторык сцвярджае, што па колькасці насельніцтва, рамёствах, гандлю (асабліва з Масквой), культуры сярэднявечны Магілёў займаў у Вялікім княстве Літоўскім другое месца (пасля Вільні). Я. Ульчынайце ўводзіць у навуковы ўжытак арыгінальныя курсы рыторыкі, якія ўзніклі ў Полацку, Навагрудку, Вільні, Пінску і Брэсце. Іх аўтарамі былі беларусы па паходжанні Пётр Пузына, Андрэй Вырвіч, Антон Шырма і інш. Рукапісы гэтых рыторык выяўлены Я. Ульчынайце ў вільнюскіх, варшаўскіх, кракаўскіх і вроцлаўскіх архівах.

Працы беларускіх і польскіх даследчыкаў апошніх год істотна ўзбагачаюць нашы веды пра ўзаемадзеянне культур двух суседніх народаў у мінулым і на сучасным этапе. І адначасова яны служаць высакароднай справе далейшага савецка-польскага збліжэння. Даўнія традыцыі жывуць і працягваюцца!

Адам МАЛЬДЗІС.

ПІСЬМЕННІК КНІГА ЖЫЦЦЁ

Свая барэна

Штрыхі да творчага партрэта Уладзіміра ДАМАШЭВІЧА

КАЛІ паспрабаваць адным словам падсумаваць уражанне ад прозы Уладзіміра Дамашэвіча, дык гэтае слова будзе — «ураўнаважанасць». Грунтоўная і нетаропкая памяркоўнасць апавядальнай манеры аўтара — яе вонкавае ўвасабленне. Але ідзе яна ад больш глыбокага і істотнага — ад ураўнаважанасці ў свядомасці пісьменніка свету ўнутранага і знешняга. Аб'ектыўнае і суб'ектыўнае, лірычнае і эпічнае не саступаюць адно аднаму, не перамагаюць, не разгортваюцца на поўную моц за кошт другога, а суіснуюць, упарта трымаючыся дакладнай, дакументальна - рэалістычнай асновы жыцця.

Пісьменнік часам нават адкрыта падкрэслівае дакументальную аснову сваіх твораў («Пахла порахам зямля», «Кожны чацвёрты»), але там, дзе і не папярэджвае аб гэтым, яна ўсё-такі адчуваецца і стрымлівае, дысцыплінуе фантазію. Дакладней, фантазія пісьменніка спаборнічае з безумоўнасцю і аб'ектыўнасцю дакумента. І таму стрыманасць — адметная адзнака стылю У. Дамашэвіча. Ён хутчэй недагаворыць, чым перагаворыць. Хутчэй прыхавае пачуццё і вытрымае абвінавачванне ў яго адсутнасці, чым сарвецца ў сентыментальнасць і экзальтаванасць. Хутчэй застанецца незразумелым, чым будзе тлумачыць рэчы, якія патрэбна разумець адразу.

Ад гэтай агульнай стрыманасці ідзе, мусіць, і відавочная схільнасць аўтара да дыялогу: хай чытач сам прыслухоўваецца — у меру адпушчанага слыху, — як і што гавораць героі. А пагаварыць, высветліць не столькі ўзаемаадносіны, колькі сутнасць чалавечую, героі У. Дамашэвіча любяць. Наогул, здаецца, што пісьменнік бачыць сваю задачу ў тым, каб перш-наперш цвяроза бачыць і дакладна паказваць. І калі ён чаго асцерагаецца, дык гэта, мусіць, перш за ўсё таго, каб не быць разумнейшым за жыццё. Ураўнаважанасць, стрыманасць, дакладнасць — якраз і дапамагаюць.

Урэшце, «не быць разумнейшым за жыццё» — рыса чыста сялянскай свядомасці. Пры пэўным завастрэнні ў гэтай формуле можна ўбачыць жаданне абмежавацца толькі вынікамі вопыту, што вядзе да мастацкага пазітывізму, а на практыцы — да натуралізму, да самамэтных апісанняў, да «фізіялагічнага» нарыса, пэўны перакос у бок якога заўважаецца ў нашай літаратуры.

Гэтая сціплая формула — «не быць разумнейшым за жыццё» — патрабуе ад пісьменніка перш-наперш «быць разумным, як жыццё». І не менш. Але і не больш. Бо крытэрый разумнасці — жывое, яго прадаўжэнне і ахова. У такім разуменні формула пераходзіць у скарбонку сучаснай высокакультурнай свядомасці. Перш за ўсё таму, што бароніць чалавека ад нашэсця абстракцый і псеўданавуковых тэорый, якія стараюцца замураваць кожны неўсядомлены рух і ўсплёск жыцця. Замураваць — замест таго, каб пазнаць, авалодаць, прымусіць працаваць на жыццё. І таму накіраванасць пісьменніка на рэальнага чалавека, ва ўсёй шурпатасці і неспадзяванасці лёсу, уяўляецца вельмі надзённай і змястоўнай.

Апошнім часам увагай і чытача і крытыка карыстаецца «праблемная» проза. Яна, безумоўна, дасягае пэўнай глыбіні, але за кошт звужэння абсягу даследавання рэчаіснасці. Таму яна і распадаецца на «гарадскую», «ваенную», «вясковую». І прадстаўлена аповесцю, жанрам усё-такі аналітычным, а не раманам, які патрабуе сінтэзу. Калі ў лепшых творах Васіля Быкава, Валянціна Распуціна праблемы вырастаюць з тэксту, а не штучна прыўносяцца ў яго, то творы талентаў меншага калібру грашаць зададзенасцю, самаўпэўненым жаданнем «быць разумнейшымі за жыццё». Дамашэвіч свядома адштурхоўваецца ад такой літаратуры. Яго заўсёды вабіла і вабіць «плынь жыцця» сама па сабе, ва ўсёй невылічальнай складанасці і паўнаце. Але менавіта плынь, а не ціхія тоні, не старыцы ці нават балотцы, да якіх прагна цягнецца «фізіялагічны» нарыс — маўляў, якая фактура!

Пісьменнік не прызнае апісанняў дзеля апісанняў, праблем дзеля праблем. Усё дзеля чалавека, дзеля героя, які заўсёды на стрыжні часу. Як, напрыклад, Глеб Клімёнак з аповесці-хронікі «Пахла порахам зямля». Дарэчы, аўтар не спакусіўся назваць яе раманам, хоць аб'ёмам яна і цягне на гэты жанр. Гэта таксама сведчыць аб дакладнасці аўтара і ў адчуванні жанру.

У першым набліжэнні да тэмы пісьменнік часта карыстаецца нарысам. Потым прыходзіць апавяданне. Аповесць падсумоўвае іх набыткі. Паступовасць у засваенні і апрацоўцы матэрыялу вядзе да таго, што пісьменнік калі-нікалі ўключае апавяданне ў якасці аднаго з матываў у аповесць. Так, узаемадачыненні герояў апавядання «Насланнё» напамінаюць і дапаўняюць адносіны Ляхоўскага («Німфа») са старой жонкай. Але ва ўсіх жанрах, хоць і з рознай глыбінёй, пісьменнік засяроджваецца на лёсе героя. І, быццам спаборнічаючы з жыццём, раскрывае яго не адразу, — няспешна вядзе ад адной неспадзяванкі да другой і, здаецца, што толькі ў самым канцы мы бачым героя ў натуральны рост. Як, напрыклад, у апавяданні «Звяруга» з часоў панскай Польшчы. Забойца са страшным прозвішчам толькі ў фінале апавядання раскрывае сваю сутнасць.

Менавіта засяроджанасцю на лёсе героя У. Дамашэвіч падкрэслівае сваю прыхільнасць да першасных, як мага менш умоўных і залітаратураных форм. Бо апавяданне аб лёсе чалавека — «жыціе» — адзін з першых і натуральных жанраў літаратуры. Сілу яго добра ведала хрысціянская ідэалогія. Савецкая літаратура таксама не цураецца «жыційных» форм. Дастаткова згадаць «Як гартавалася сталь» Мікалая Астроўскага ці «Клаўдзію Вілор» Даніила Граніна.

Глеб Клімёнак У. Дамашэвіча — у адпаведнасці з канонамі «жыційнай» літаратуры, з яе павышанай ідэалагічнасцю — таксама з тых глыбінных характараў, што ствараюць свой час. Перад намі вобраз, на які нанізваюцца падзеі і выпрабаванні. І таму, калі мы гаворым аб прозе У. Дамашэвіча (а трэба прызнацца, што робім гэта не вельмі часта), дык перш за ўсё гаворым пра ягоных герояў, якія з'яўляюцца носьбітамі індывідуальна пазначаных і дакладных прыкмет часу.

Апошнія гады шмат гавораць і пішуць аб станоўчым героі ў мастацкай літаратуры. Аб тым, як яго нам не хапае, аб тым, які ён павінен быць. Пакідаючы ўбаку спрэчныя пытанні аб сутнасці станоўчага вобраза або ідэалу, хочацца спытаць: а ці разбіраліся мы з тымі станоўчымі героямі, якіх ужо маем?

У творах У. Дамашэвіча можна ўбачыць цэлы шэраг такіх герояў. І што важна — у іх адсутнічаюць усякія вонкавыя прыкметы «геройства»: гэта простыя людзі, але менавіта на іх плячах ляжыць галоўная праца жыцця, менавіта на іх сціпласці, цярпенні трымаецца свет. «Жыццё трымаецца на цярплівых», — часта паўтараюць героі У. Дамашэвіча. А дзе цярпенне — там і сціпласць. Камісар Дзятко з аповесці «Кожны чацвёрты» пераканаўча даводзіць, — мы чуем голас самога аўтара, — што «сціпласць — гэта прыроджаная культура», а калі паглядзець шырэй — нацыянальная рыса, якой трэба ганарыцца.

Кожны пісьменнік прыходзіць у літаратуру са сваім станоўчым ідэалам, з якім так ці інакш суадносяцца ўсе — нават адмоўныя — ягоныя героі. Значная група герояў У. Дамашэвіча напрамую суадносіцца з яго ідэалам. Гэта і Глеб Клімёнак, і камісар Дятко, і Валя Калейнік, маладая настаўніца, і афіцэр Карыцкі з аповесці «Німфа», і партызанка Юля Казак з аповесці «Кожны чацвёрты».

Але ёсць у пісьменніка яшчэ адзін герой, які, на маю думку, самы бліжэйшы да ідэалу У. Дамашэвіча. Я маю на ўвазе Русіновіча з аповесці «Студэнты апошняга курса». Не выпадкова, што менавіта гэты твор адкрываў том выбранай прозы У. Дамашэвіча.

Цікавасцю да чалавека, які стаіць на парозе жыцця, імкненнем зразумець яго і дапамагчы ў першых самастойных кроках у жыцці вылучаецца ўся проза пісьменніка. Русіновіч — не толькі малады, ён, напэўна, самы любімы герой, бо яму аўтар давярае свае, адкрыта пісьменніцкія думкі. Усе станоўчыя героі ў большай ці меншай ступені нагадваюць Русіновіча — і Карыцкі, і Клімёнак, і Дзятко. Яднае іх тое, што яны — прыроджаныя інтэлігенты. Гэтай акалічнасцю аўтар падкрэслівае, што народ, нават у самых цяжкіх умовах існавання, заўжды мае ў сабе сілы і магчымасці да новага, больш свядомага і духоўнага жыцця.

Аповесць «Студэнты апошняга курса» стаіць трохі асобна ў творчасці У. Дамашэвіча. Хоць, трэба адзначыць, тэматычна кожны буйны твор пісьменніка — спасціжэнне новага жыццёвага матэрыялу.

Першымі былі апавяданні з часоў панскай Польшчы, аб «ямах на дарозе» ў кожнага простага чалавека, якому далей карчмы і турмы няма куды асабліва выбрацца. Потым з'явілася аповесць «Між двух агнёў», дзе расказваецца аб трагедыі чалавека-адзінкі, які адарваўся ад народа. Па-свойму апрацаваў пісьменнік і тэму «чалавек на вайне» — аповесць-хроніка «Пахла порахам зямля». Напісаў аповесць з партызанскага жыцця — «Кожны чацвёрты». Далікатна, з уласцівай яму тактоўнасцю закрануў «гарачую» тэму сямейна-шлюбных адносін — у аповесці «Німфа», у шэрагу апавяданняў. Цікавяць яго і «лабірынты» гарадскога жыцця — апавяданне «У лабірынце», дзе прасочваюцца першыя крокі «простай» душы, якая напачатку губляецца ў новым для яе асяроддзі.

Для кожнай тэмы знаходзіць пісьменнік свае павароты і адценні, намацвае напрамкі, у якіх будуць шукаць і знаходзіць маладзейшыя. «Усё, што ён гаварыў ці даказваў, было яго ўласным, выказаным па-свойму», — гэтая характарыстыка Русіновіча можа быць дастасавана і да самога аўтара. Усё, аб чым піша У. Дамашэвіч, — яго ўласнае і выказанае па-свойму. Ён ніколі не спакушаецца павярхоўнай і паспешлівай кан'юнктурнасцю, якая заўсёды прымушае выбіраць накатаныя шляхі, свядома спрошчваючы чыёсьці.

Але якія б розныя тэмы ні закранаў пісьменнік, у выніку ўсё напісанае ўтварае тым не менш відавочнае адзінства. Менавіта «Студэнты апошняга курса» даюць ключ да гэтага адзінства, бо герой аповесці — Русіновіч — найбольш блізкі да станоўчага ідэалу У. Дамашэвіча — чалавека высакародных думак і ўчынкаў.

Аповесць напісана амаль дваццаць гадоў назад, але і цяпер — у адрозненне ад многіх «маладзёжных» аповесцей таго часу — вабіць сваёй грунтоўнасцю і дзейсным па-

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

«НЕ ЎГАСЦІ МЯНЕ ПІЎЦОМ, А ЎГАСЦІ СЛАЎЦОМ»

Што кожнае сяльцо мае сваё слаўцо, вядома даўно. Але хіба блякне ад гэтага адвечная ісціна, калі пацвярджэнне ёй сустракаеш зноў і зноў?

Ды яшчэ ж якое слаўцо!

«Паслухай, што людзі кажуць»—запрашае чытача сваёй новай кніжкай Валянцін Рабкевіч, і я ўжо чую ў голасе пісьменніка тую хітрынку-«лукавинку», якая абяцае жывыя дзівосы і ў той жа час нібы папярэджвае: толькі слухай, а сам не спяшайся з вывадамі, не вытыркайся фанабэрліва са сваімі «трыма капейкамі»... І я не спяшаюся, я п'ю ўцеху і асалоду спакваля: спачатку кручу ў руках і пагладжваю дабротна выдадзены «Мастацкай літаратурай» зборнік беларускіх народных прыказак, прымавак, прыкмет і жартаў, потым разгортваю, цікаўлюся зместам-раздзеламі, не вытрымліваю, сям-там прачытваю тое, што западае ў вока, а потым ужо чытаю і перачытваю ад пачатку да канца. І расцвітаюць у душы кветкі радасці, хочацца ўжо гэтай радасцю дзяліцца з іншымі чытачамі, запрасіць разам з В. Рабкевічам на ўваходзіны — уваходзіны ў кнігу як у светлы і гожы дом, дзе частуюць не піўцом, не! «Не ўгасці мяне піўцом, а ўгасці слаўцом»—ёсць у зборніку такі запіс. Дык вось—уся кніжка і напоўнена народным мудраслоўем, цану якому і самі людзі ведаюць і аддаюць перавагу спажыве духоўнай — для розуму і сэрца—перад іншай. «Угасці слаўцом!»—а потым ужо ўсё астатняе. А мо і так—«усё астатняе» ладзіцца толькі для таго, каб пасядзець, як людзі, паслухаць тое самае «слаўцо» (праўда, бываюць выключэнні, і іх тут жа прыкмячаюць: «каму што, а Базылю клёцкі», «дурны-дурны, а заціркy сёрбае»). Народ—вялікі эстэтык, разумее, цэніць і любіць слаўцо разумнае, дасціпнае, трапнае, вясёлае, такое, што—сказаў, як звязаў! І народная мараль, што заключана ў гэтым «слоўцы»,—самая высокая. Жылося-вялося так ва ўсе вякі, жыве пасюль і жыць будзе, пакуль зямля стаіць.

Немагчыма ўсё пераказаць, чым хата багата, прабачце—кніга, кніга! А таму паспяшаем ў госці, калі запрасілі: хто позна ходзіць, той сам сабе шкодзіць (нязванаму ж госцю і лыжкі няма, або яшчэ—прыйшоў нязваны, пайшоў нясланы). Зойдзем і паслухаем хоць бы тое, што каля стала і за сталом гаварылася і гаворыцца, што прыкмячалася, з чым звязвалася, на што далікатна намякалася, пра што думалася, а пра што і ў лоб смалілі, як з дубальтоўкі. Будзем памятаць, што слова не сажа, не заб'е, дык замажа. І будзем мець на ўвазе: не дораг абед, а дораг прывет. Дома і салома ядома, хоць воўна, абы кішка поўна. Ну і што, калі ў чалавека часам з квасам, а парою з вадою? Хлеб і вада — маладзецкая яда. Хоць чорная па́па, абы поўная лапа. Карацей — што пастаўлёна, тое і блаславлёна...

І вось яшчэ: не забывайцеся на свае паводзіны за сталом. Лепш за ўсё, вядома, калі ем, то глух і нем. Але ж мы прыйшлі слухаць, то стаўляй вушы тапырком. Болей знай, меней бай. Сам не мялі сорак бочак арыштантаў, не лезь сляпіцаю ў вочы, дай людзям сказаць.

Мы яшчэ толькі парог пераступілі, яшчэ толькі кінулі на

В. Рабкевіч. Паслухай, што людзі кажуць. Беларускія народныя прыказкі, прымаўкі, прыкметы, жарты. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1985.

фасам.

Русіновіч сам з'яўляецца прыкладам таго, як трэба паказваць чалавека. Сястра асуджана, бацька хворы, маці выбіваецца з сіл, каб пракарміць сям'ю і вывучыць сына, на якога, дарэчы, прыйшла ананімка. Розныя не вельмі прыемныя акалічнасці. Але не больш. Не яны праграмуюць самаадчуванне Русіновіча. Насуперак усяму — нядаўняй вайне, нястачам, крыўдам — пануе маладая радасць жыцця, раскаванасць, дасціпнасць, вера ў будучыню.

На новы час паказваюць у аповесці не вонкавыя падзеі, а найперш самаадчуванне асобы — таго ж Русіновіча і яго сяброў. Жыццяздольнасць аповесці тлумачыцца, на маю думку, тым, што ў ёй адбылося супадзенне асобы і часу. Час такі ж паўнапраўны герой, як і Русіновіч. Усе маладыя героі носьбіты сацыяльнага аптымізму, магутны зарад якога народ атрымаў ад рэвалюцыі і перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. І яго хопіць на тое, каб пераадолець многія хваробы росту і развіцця.

Аповесць пачынаецца вясной і канчаецца вясною — вясна душы супадае з вясною часу і вясною зямлі, «з яе імклівай і бурнай паводкай, што ачышчае зямлю і адмыкае замкі ад усяго жывога, дорыць людзям новыя светлыя падзеі і клопаты».

Аповесць «Студэнты апошняга курса» можна разглядаць як матэрыял да гісторыі беларускага інтэлігента, інтэлігента ад зямлі, які мастацкія каштоўнасці прыдзірліва выпрабоўвае маральным пачуццём народа.

Пры ўсёй навізне свайго героя, інтэлігента ў першым пакаленні, У. Дамашэвіч не забываецца і аб папярэдніках Русіновіча ў беларускай літаратуры. Перш-наперш гэта Андрэй Лабановіч. Спрэчка аб коласаўскім героі — адна з самых важных у ідэйнай структуры твора. Нават тое, што Русіновіч не можа абмінуць Лабановіча ў сваім духоўным развіцці і спачатку адштурхоўваецца ад яго, даказвае іх несумненную сувязь.

Аўтар, улічваючы характар героя, дае яму час на роздум, на памылкі. Толькі значна пазней Русіновіч ловіць сябе на думцы, што «адводзіць сабе ў жыцці ролю таго ж Лабановіча, настаўніка, асветніка, «сейбіта вечнага». Урэшце ён згаджаецца са сваім выкладчыкам, што без Лабановіча і да яго падобных «не было б нас з вамі».

Русіновіч, як і большасць астатніх герояў, не статычны персанаж, які толькі падае аўтарскія рэплікі. У аповесці ён увесь час удакладняецца, адкрываецца па-новаму, з розных бакоў. Мы бачым яго пачамі сяброў, выкладчыкаў, бацькоў. Чытаем дзённік героя. Спачуваем яму ў перыпетыях першага і не вельмі ўдалага кахання. У адносінах з дзяўчынай яму шкодзіць лішак грунтоўнасці і разважлівасці. Ён хоча разлажыць усё па палічках, дабіцца яснасці і прастаты, але дзяўчына не ўкладваецца ў каардынаты рацыянальнай свядомасці, яна патрабуе ацэнкі ў каардынатах пачуцця. Але пачуцці героя занадта «разумныя», выхаваныя вельмі суровым жыццём, і яму патрэбны час, каб «адтаць», раскавацца...

Наогул, станоўчаму, высокаманральнаму герою У. Дамашэвіча цяжка даюцца адносіны з жанчынамі. Аўтар падкрэслівае пэўную абмежаванасць героя, яго залішні рацыяналізм, жаданне ўсё зразумець і вытлумачыць. Нават у непрафесійнай сферы. Гэта характарыстыка не толькі героя, але і часу. У Русіновіча гэта ідзе яшчэ і ад ягонай цэльнасці, і зразумела, ад маладосці, ад жыццёвай нявопытнасці і наіўнасці.

Адносінам паміж мужчынам і жанчынай, прысвечана апавяданне «Трэці лішні». Аўтар прасочвае, як трагікамічна суіснуюць жаночая гнуткасць, нават выкручастасць, з мужчынскай праматой, якая даходзіць да просталінейнасці.

Пісьменнік часта звяртаецца да сітуацыі, калі блізкія людзі аказваюцца духоўна далёкімі («Німфа») ці нават варожымі («Між двух агнёў»). Жарэс Ляхоўскі толькі разышоўся з маладой жонкай, Лукашык — выдаў яе немцам. У. Дамашэвіч падкрэслівае, што суровы час — заўсёды каталізатар адносін, бо выяўляецца хто ёсць хто. Чалавек часта сам не ведае, якая ношка яму пад сілу. Як не ведала Валя Калейнік, простая маладая настаўніца. Потым яна знайшла сябе ў агульнай барацьбе з ворагам і мужна сустрэла сваю апошнюю хвіліну.

Калі Валя Калейнік і Лукашык кахалі адзін аднаго, і толькі пад цяжарам часу выявілася нетрываласць іх адносін, то «Німфа» і Жарэс Ляхоўскі з самага пачатку здрадзілі каханню. «Німфа» падабалася Жарэсу толькі таму, што нечым нагадвала Свету, дачку яго жонкі. А Жарэс «Німфе» зусім не падабаўся, але яна адчувала, што гэтага шлюбу чакаюць усе яе родныя — і брат, і маці: брат паляпшае свае кватэрныя ўмовы, а маці пазбаўляецца ад ужо трохі стамляючых клопатаў і перажыванняў за дарослую дачку. Дзяўчына адчувае і разумее, што выйсця няма. Як і кахання. Але спрабуе жыць з нелюбімым. Шлюб без пачуцця няўстойлівы. Вінаватыя тут не толькі Жарэс і «Німфа», але — і Карыцкі. Так, той самы Карыцкі, што закахаўся калісьці ў «Німфу», але не адважыўся ёй прызнацца ў сваіх пачуццях. Пісьменнік адзначае ў свайго станоўчага і разважлівага героя адметны недахоп — адсутнасць смеласці. Але трэба ўдакладніць, што смеласць адсутнічае менавіта ў дачыненні да самога сябе і ідзе ад той жа сціпласці, ад прыроджанай тактоўнасці, культуры.

Ляхоўскі і Лукашык — героі вельмі блізкія паміж сабою, нават яшчэ бліжэйшыя, чым Русіновіч і Карыцкі. Гэтыя пары супрацьпастаўлены ў сваіх адносінах да свету, хоць усе яны інтэлігенты ў першым пакаленні. Сваіх антыгерояў У. Дамашэвіч малюе дакладна-стрымана. Пісьменнік не судзіць сваіх герояў — гэта справа чытача.

Лукашык — настаўнік з з аповесці «Між двух агнёў». Аднак ён не лічыць сябе сапраўдным настаўнікам, хоць і карыстаецца павагай вучняў і калег. Той факт, што саслалі яго бацькоў, якія былі ні ў чым не вінаватыя, моцна ўразіў яго свядомасць. Лукашык існуе на той ступені бясплённа рэфлектуючага інтэлекту, які, разбураючы ўсякіх куміраў, адначасова разбурае і народныя ідэалы, асэнсоўвае свой інтэлект не як сродак дасягнення мэты, а як нешта самамэтнае. Інтэлект становіцца адзінай прыкметай асобы, атаясамліваецца з ёю, і ў выніку асоба адрываецца ад «паганай» масы і гіне. Трагедыя Лукашыка — гэта ў нейкай ступені трагедыя паўінтэлігентнай свядомасці, якая — у адрозненне ад сапраўднай інтэлігентнасці — часта пераацэньвае сябе. У адрозненне ад быкаўскага Рыбака, які сутаргава хапаецца за жыццё, за само фізічнае існаванне за магчымасць дыхаць, есці, піць, таму што, як жывёліна, баіцца смерці, Лукашык не знаходзіць у розуме — які для яго ўжо найвышэйшы суддзя — апраўдання і апоры для мэтанакіраванай дзейнасці. І таму аддаўся на волю плыні, таму заўсёды адзінокі. Сувязь з жыццём пачала наладжвацца праз «дурную» Валю, якая не згубіла веры ні ў народ, ні ў Радзіму, ні ў рэвалюцыю. Асабіста перажытая несправядлівасць засланіла Лукашыку агульную справядлівасць. Тут інтэлектуальнае не было падтрымана маральным. Той жа Русіновіч ці Карыцкі знайшлі б сваё месца ў такім становішчы. А вось з Жарэсам Ляхоўскім у адпаведных умовах магло б адбыцца тое, што і з Лукашыкам.

У. Дамашэвіч заўсёды падкрэслівае, што галоўнае ў асобе — маральны фундамент. Калі ён ёсць, то лёгка ўзводзіць на ім і «будынак» інтэлекту. Толькі маральна пэўны чалавек можа вытрымаць напор любых падзей, а не бязвольна падпарадкоўваюцца ім. Толькі такі чалавек —гаспадар свайго лёсу. Любая неакрэсленасць, недакладнасць у вызначэнні самога сябе, асабліва ў гадзіны цяжкіх выпрабаванняў, можа абярнуцца трагедыяй. Як гэта здарылася і з Пятром Паланейчыкам з аповесці «Кожны чацвёрты». Ён просты сялянскі хлопец, але з пачуцця сяброўства прымае ўдзел у злачынстве, у самасудзе.

Наогул, калі чытаеш аповесць «Кожны чацвёрты», бачыш, што партызанская тэма яшчэ далёка не вычарпана. І У. Дамашэвіч распрацоўвае яе па-свойму і пераканаўча. Аўтар падкрэслівае (а гэта вельмі важна), што ў надзвычайных умовах партызанскай барацьбы дзейнічаюць і жывуць звычайныя людзі.

Мусіць, ні ў адным творы пісьменніка не дзейнічае столькі розных людзей — розных менавіта светаадчуваннем, як у аповесці «Кожны чацвёрты». Гэта ваяка і бабнік камандзір Дарашэнка, і памяркоўны, клапатлівы, строгі і прынцыповы камісар Дзятко, і прыстасаванец Нікановіч, і няўрымслівы Ваўчэцкі, і па-дзявочы прывабная Юля Казак. Так, людзі вельмі розныя. І таму ў любой складанай справе трэба прымаць у разлік кожнага чалавека.

Дарэчы, у аповесці адчуваецца і вопыт нашай дакументальнай літаратуры аб вайне. Апісанне гібелі сям'і Ваўчэцкіх, асабліва Каці, уражвае, як факт, які адбываецца на тваіх вачах — ніводнага лішняга, «літаратурнага» слова.

Ад твора да твора расце дакладнасць і мастацкая моц пісьменніка. І як заўсёды, у творах, дзеянне ў якіх адбываецца ў час, аддзелены ад нашых дзён, на першае месца выступае побыт. Менавіта з яго дапамогай У. Дамашэвіч дае дакладную карціну таго жыцця і таго гістарычнага часу. І галоўнае — стварае ілюзію яго натуральнай плыні.

Пісьменнік арыентуецца ў асноўным на моладзь, і таму ён ніколі не злоўжывае пафасам. Але і не кідаецца і ў другі бок. Змрачнавата-ўпартыя героі, якія зацята сунуцца па рэйках аўтарскай думкі, у яго адсутнічаюць.

Мусіць, ад гэтай заўсёднай і ўжо незаўважанай арыентацыі на маладога чытача, у творах У. Дамашэвіча падкрэслена-дакладнае бачанне свету. Калі, прыкладам, герой пераправіцца цераз раку, то чытач будзе ведаць, як наводзіць пантонны мост. Арыентацыя на моладзь праяўляецца ў частых спрэчках герояў на філасофска-адцягненыя тэмы, ад вырашэння якіх залежаць далейшыя дзеянні і ўчынкі. Яна адчуваецца ў схільнасці аўтара падсумоўваць свае назіранні афарызмамі. Вось, мусіць, адзін з самых галоўных і дарагіх: «Чалавека не перабіш за адзін раз: за адзін раз яго можна толькі зламаць».

Таму пісьменнік не спяшаецца з рэцэптамі перавыхавання чалавека, а ўважліва прыглядаецца да яго, да свету, у якім побач са сваімі героямі жыве і ён сам. Немітусліва і роўна ведучы сваю, адметную баразну на полі роднай літаратуры.

Валерый ЛІПНЕВІЧ.

НАШ КАЛЯНДАР

Споўнілася 120 гадоў з дня нараджэння СТАРОГА УЛАСА (Уладзіслава Пятровіча Сівога-Сівіцкага). Беларускі паэт-самавук. Друкавацца пачаў у 1907 годзе на старонках «Нашай Нівы». Змяшчаў вершы і вершаваныя апавяданні ў беларускіх дакастрычніцкіх і заходнебеларускіх календарах. Шэраг твораў змешчаны ў «Анталогіі беларускай паэзіі» (1961) і зборніку «Беларуская дакастрычніцкая паэзія» (1966).

Споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння празаіка, драматурга і нарысіста Васіля СТАШЭЎСКАГА. Пачынаў творчы шлях з паэзіі. Надрукаваў больш за 20 п'ес. Найбольшага поспеху дасягнуў у галіне прозы. Выходзілі кнігі «Па сонечным шляху» (1930), «Пад местачковым месяцам» (1931), «Шуміць бярэзінка» (1933), нарысы «Гаворыць Асінстан...» і «Койданаўская МТС» (1931), «Каласіцца зямля» (1932). Сённяшняму чытачу творчасць В. Сташэўскага вядома па аднатомніку выбранага «Шуміць бярэзінка», што выйшаў у 1963 годзе.

Споўнілася 95 гадоў з дня нараджэння пісьменніка Янкі НЁМАНСКАГА (Івана Андрэевіча Пятровіча). Першае апавяданне «Над Кроманню» надрукаваў у 1922 годзе ў часопісе «Полымя». Аўтар зборніка апавяданняў «На зломе» (1925), аповесці «Партызан» (1927, часопіс «Полымя»), незавершанага рамана «Драпежнікі», што друкаваўся на старонках «Полымя» ў 1928—1930 гадах. Творы Я. Нёманскага цікавыя тым, што ён першым у беларускай літаратуры звярнуўся да адлюстравання падзей рэвалюцыі 1905—1907 гадоў. Летась выдавецтва «Мастацкая літаратура» выпусціла аднатомнік выбраных твораў пісьменніка.

нас вокам, а ўжо бачаць: на нагах блішчыць, а ў жываце пішчыць. І не думайце, што гаспадар і гаспадыня не хваляюцца з нагоды гасцей. Ён— не раз перадумае: добра сытага карміць, а лысага галіць. Еш хлеб і людзям дай, бо той не чалавек, што сам не гам і другому не дам. Адзін хоць з'еш вала, адна хвала. А зірніце, як яна, як гаспадыня перажывае! Хаця б не сказалі: умела гатаваць, ды не ўмела падаваць. Вось і частуюць шчыра, ад душы, як гэта прынята ў беларускіх вёсках. Ніколі не бывае так, што на языку мядок, а на сэрцы лядок. Не думаюць людзі, не мяркуюць: ці варта козамі сена травіць? Ці канечне папу яечня? Дык еш, хоць распержыся, еш, пакуль рот свеж, еш, пакуль не запяеш... Праўда, не забывайся, што невялікая слава, калі рот як халява.

Дабаўкі не прасі, заўжды было добрым тонам дзякаваць за полудзень, хоць сам ні сыты, ні голадзен. Дый усё роўна з адным брухам на два абеды не паспееш. Еш нармальна, каб не падумаў гаспадар: з цябе ядок, як з мяне стралок. Умей пахваліць гаспадыню, памятаючы, што слова — не верабей, выпусціш — не зловіш, што залішняя хвала зваліць і вала. Хвалі быццам не нарокам, скажы: хараша міска, ды дно блізка. Або народны жарт успомні: «Еш, Якаў.— Ем, дзякуй.— А чаму ты, Якаў, не ясі? — А чаму ж ты лыжкі не дасі?» (Успамінаецца, як умеў гэта рабіць мастак, нястомны шукальнік-збіральнік народнай творчасці, народнага адзення нябожчык Лявон Баразна: за хвіліну-другую ён ужо рабіўся свой, родны-раднюсенькі за сталом; то хіба дзіўна, што гаспадыні расчынялі перад ім куфры і шафы, паказвалі самае запаветнае і дарагое!).

Выслухаем гаспадыню з разуменнем, ёй жа заўсёды хочацца выбачыцца, калі чагосьці не хапае: не ўрадзіў мак, пражывем і так. Ай, цётка, цётка, нашто ж прыбядняцца? Ды на стале ж і жарана, і парана, і так кускамі... І ты спаквяла ўсяго адведай, усяго пакаштуй, усё ацані. І памятай, што пасуда любіць чыстату. Каб, не дай бог, не падумалася гаспадарам: не шкада таго, што з'еў, а шкада таго, што засталося. Каб не чухаў гаспадар патыліцу: не пазнаць, ці шляхта ела, ці свінні папасвіліся. (Дару В. Рабкевічу слуцкую прымаўку для наступнага выдання: не той госць, што разрые, як свіння, а той госць, што выліжа, як сабака).

І ведаеце што? З-за чаркі не рабіце сваркі — пакаштуйце і «зелля». Яно ж даецца толькі для размовы, для таго, каб паспяваць, а не напіцца. Хто ўмее піць, той умее жыць. Піва піць — не дровы рубіць, можна неўпрыкмет набрацца, як жаба гразі. А тады ўжо п'янаму і ў лужыне рай. У моры менш людзей тоне, як у гарэлцы — помніце гэта.

Але ж насядзеліся, нагаманіліся, наслухаліся, наспяваліся — час і паклоны класці, развітвацца. Канечне ж ,сто вёрст не круг, калі ёсць друг. Мей сто сяброў, а не сто рублёў. Завітаем яшчэ сюды не раз, але не трэба забываць: дзе не любяць — не гасці, а дзе любяць — не часці.

А пад канец сваіх нататак скажу: тады хвала, як людзі хваляць, а не тады, як сам сябе хваліш. Такое народнае пахвалы заслугоўвае праца і клопаты Валянціна Рабкевіча.

Я і з сотай доляй не пазнаёміў вас з тым, што ёсць у Рабкевіча ў зборніку. Шмат яго запісаў увайшло ў двухтомнік «Прыказкі і прымаўкі» са шматтомнага збору серыі «БНТ», які выдае Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. Шмат яшчэ засталося і ў картатэцы пісьменніка.

«Паслухай, што людзі кажуць» — добрая кніжка, цікавая кніжка. І добра, што яны выходзяць, такія кніжкі, у выдавецтве «Мастацкая літаратура». Фальклор і ёсць мастацкая літаратура вышэйшай пробы, і тое, што мы трымаем руку на пульсе сённяшняга яго жыцця, друкуем жывыя, яшчэ «цёпленькія» запісы, сведчыць пра духоўнае здароўе народа, пра яго будучыню.

Павел МІСЬКО.

ПАЭЗІЯ

Юрась СВІРКА

Партызанскі край

Мой край, адзіны мой,
Ты блізкі мне і свойскі
З Бярозаю-ракой
І з вёскаю Бярозкі.

Бяроза для мяне—
Найпершая у свеце.
Бывае, што і ў сне
Сваёю плынню свеціць.

Бярозкі за ляском,
Ні ляскату, ні гулу.
Бярозавым дымком
І мурагом дыхнула.

Дымок тут сапраўды
Салодкі і духмяны.
Сплывае да вады
Нізінкай за туманам.

І дзесьці над ракой
З туманам ён зліецца
І пасмаю сваёй
Майго кранецца сэрца.

Навекі цішыні
Бярозы нашапталі.
Бярозавыя дні,
Бярозавая далеч.

Чародка галубоў
У небе не знікае—
Нібы лістоўкі зноў
Над партызанскім краем.

Высока узняло
Іх, галубоў імклівых,
Засвеціцца крыло
Бярозавым адлівам.

І столькі тут святла—
Радзімая глыбінка.
Бяростай усплыла
На небе аблачынка.

Бярозавы жарок
Праменіцца даверам.
І нават папялок,
Нібы бяроста, шэры.

У Мінску шэсце ветэранаў

Кумач барвовіцца зарою.
На іх так хочацца зірнуць.
Бацькі, браты—сям'я герояў.
Чыесьці прадзеды ідуць.
Дармо,
што крок іх недакладны,
Дармо,
што не па струнцы строй.
Ідуць байцы і партызаны,
З'яднаны доляй франтавой.

Яны даўно не маладыя,
На тварах
час
Маршчыны тчэ.
Узнагароды залатыя.
Сляза іскрыцца на шчацэ.

Яны—вайны Айчыннай сведкі,
Перамаглі яны ў баях.
Пад ногі ім
Кладуцца кветкі—
Да абеліска ў ружах шлях.

А музыка гушкае неба.
Блакіт прасветлены трымціць...

Душой убачыць гэта трэба
І ўдзячна
лёс іх
перажыць.

На схіле веку

Хоць была і не ў ружах дарога,
Ты высокія вехі адкрыў:
Рэвалюцыя і Перамога,
І Гагарына ў космас прарыў.

Ты азораны мудрасцю Леніна,
Ты адчуў спраў ягоных размах.
І змаганнем за мір
Ты асветлены,
Што трымаўся на нашых плячах.

●

Дождж першародны
І сонца вясновае
Жыццё пачынаюць
Спрадвечнае, новае.

Зямля памякчэе,
Праклюнуцца травы,
Вецер народзіцца
Цёплы, ласкавы.

Дрэвы аздобяцца
Лісцем і квеценню.
Будуць вяночкі
Шчаслівыя сплецень.

Будзе жывое
Расці, і пыліцца,
І адцвітаць,
І гарэць, і дыміцца,

Жухнуць, і чэзнуць,
Зрастацца з зямлёю
Так непарыўна,
Як лета з вясною.

І зноў узнімацца
Нязломнаю раццю,
Сокам зямлі
Для жыцця налівацца.

Каб зноўку вясной
Нарадзіцца жывому—
І бессмяротнаму,
І маладому!

●

Яна ні ў які цуд не верыць:
Ніхто не ўстане з-пад жарствы.
Ды прыйдзе ўсё ж ля той кватэры.
Куды прыходзіў ён жывы.

Тут лепшыя гады пражыты,
Тут мары лепшыя і сны.
Нічога ў сэрцы не забыта.
Тут нарадзіліся сыны.

Згадзілася б маліцца богу,
Калі б дадому ідучы,
Яго сустрэла зноў жывога.
Здалёк пазнала б і ўначы...

На дом той гляне і паволі
Ідзе назад.
Каго чакаць?
І па-асенняму таполі,
Што ім пасаджаны,
Шумяць.

Спрадвечнае

«А колькі, скажыце, стагоддзяў
зямлі?»—
Дакладна яшчэ невядома.
Спрадвеку аблокі над ёю плылі
І сонца свяціла без стомы.

Паілі яе ва ўсе эры дажджы.
Вятры цалавалі спрадвеку.
Таксама спрадвеку хацелася жыць
У міры на ёй чалавеку.

Валун, што на полі спрадвеку
маўчыць,
Прызнанне паведаў такое:
«Калі я прылёг на зямлю адпачыць,
Яна ўжо была пада мною...»

●

Ведаю, мама,
Што мне не сустрэцца з табой:
Ты ўжо далёка,
Адкуль немагчыма вяртацца.
Ды ўсё ж,
Уяўляешся ты мне жывой.
Еду у вёску,
Спрабую табе ўсміхацца.

Дзесяць гадоў,
Як не чую твой голас, не бачу вачэй.
І я пасівеў.
І не веру ў дзівосы і ў казкі.
А варта прыехаць дамоў
І узяцца за клямку дзвярэй, —
Як і раней,
Сэрца заные ад мамінай ласкі.

А ты і не ведаеш,
Дзе мяне лепш пасадзіць,
Частуеш,
Нібы я вярнуўся з галоднага краю.
Было так...
І памяць нічым немагчыма зацьміць.

ПРОЗА

Сяргей ГРАХОЎСКІ

Акцябрына

АПАВЯДАННЕ

ЗА АКНОМ прамільгнулі пакгаузы, жоўты двухпавярховы дом, цагляны будынак вакзала, а назву станцыі прачытаць не паспеў. У цягнік села толькі некалькі пасажыраў, і ў наша купэ зайшла зграбная жанчына няпэўнага веку. Яе постаць аблягаў цёмна-карычневы касцюм, у проразі жакеціка бялелі карункі празрыстай блузкі, на старанна ўкладзеных цёмных валасах ледзьве трымалася газавая касыначка.

Новая спадарожніца ветліва павіталася, лёгка закінула на верхнюю паліцу туга напакаваную спартыўную сумку і, стоячы перад запыленым акном, некаму махала рукою, ведаючы, што яе не пачуюць, стараннай артыкуляцыяй вылепвала нейкія словы і ўсміхалася, а вочы глядзелі журботна.

Я зірнуў на жанчыну і ўнурыўся ў даволі прымітыўны дэтэктыў, куплены ў чыгуначным кіёску. Праз хвіліну цягнік тузанула і ён павольна паплыў каля платформаў з баластам і металаломам, каля штабеляў збуцвелых прамасленых шпалаў, прамільгнуў замурзаны вусаты змазчык, бабулька з казою на повадзе ў зарослым рамонкамі кювеце. Мінулі выхадны семафор, і закружыліся шчыльныя елачкі, палі і пералескі.

— Прабачце, што гэта была за станцыя? — спытаў у жанчыны.

— Анютка. Раней тут хуткія цягнікі не спыняліся. Пенсіянеры дамагліся.

Я пакруціў галавою і ўсміхнуўся: трэба ж прыдумаць: Аню-тка!

— А жыхароў як завуць? Анюцікі?

— Анюткінцамі завуць. — Жанчынна дастала з сумачкі часопіс «Кардиология», знайшла патрэбны артыкул. То чытала, то пазірала ў акно. Было ясна: суседка мая медык, ды яшчэ кардыёлаг, спецыяліст па маіх хваробах.

Дэтэктыў мяне цікавіў мала. Недачытаную старонку я заклаў неадпраўленым у спешцы лістом майму земляку, кніжку паклаў на дрыготкі столік і выйшаў у калідор. Там разгаварыўся з высокім сівым мужчынам у паношаным афіцэрскім кіцелі з цэлаю вясёлкаю ордэнскіх планак. Гаворка, як кажуць, пайшла пра вайну і пра бамбёжку, бо і ваяваў ён недзе ў гэтых мясцінах.

Калі вярнуўся ў купэ, суседка мая задуменна глядзела ў акно, бо, відаць, развіталася з нейкім вельмі блізкім. Я разгарнуў кніжку, канверт з неадпраўленым лістом выпаў на столік. Я перагортваў старонку за старонкаю, спадзеючыся знайсці цікавы эпізод. Жанчына ўважліва разглядала адрас на канверце. Як толькі я адарваўся ад кніжкі, запінаючыся спытала:

— Прабачце, калі ласка, я на канверце выпадкова прачытала Глуск і расхвалявалася. Вы часам не адтуль?

— Вырас там, а цяпер бываю рэдка. Вось адзіны таварыш астаўся, часам перапісваемся, і то, бачыце, ліст на вакзале забыўся ўкінуць. А вас што там цікавіць?

— Усё... Бачыце, я нарадзілася ў Глуску і нічога пра яго не ведаю. Вывезлі адтуль у пялёнках. Колькі разоў збіралася з'ездзіць, ды так і не выбралася.

— А дзе там жылі вашы бацькі?

— У хатцы каля нейкага прыватнага млына. Маці казала, недзе ў полі стаяў. Бацька мой паравознік, а ў галодныя гады заехаў у гэтую глуш і наняўся машыністам да млынара. Там я і з'явілася на свет.

Мой дэтэктыў упаў на лаўку. Я ўглядаўся ў жанчыну, маўчаў, усміхаўся, а ў самога ад неспадзяванасці затахкала сэрца. Та-ак: на левай шчацэ ледзь прыкметная радзімка, вочы нібыта з усходнім разрэзам. Няўжо можа быць такая сустрэча? Яна чакала, што скажу.

— Памятаю той млын, і хатку памятаю. Цяпер іх і знаку няма. Вось так, Марына Паўлаўна. — Яна замаргала вейкамі, запунсавелі шчокі.

— Як вы сказалі?

— Сказаў Марына Паўлаўна. Так вас завуць?

— Адкуль вы ведаеце?

— Яснавідзец і варажбіт...—усміхнуўся я. — Выходзіць, не памыліўся.—Яна маўчала. Толькі яшчэ больш зардзелася, часцей заміргала доўгімі загнутымі вейкамі. А мне хацелася яшчэ трохі паказытаць яе здзіўленне.

— Дазвольце вашу руку, я вам яшчэ нешта скажу.

Яна даверліва працягнула вузкую смуглявую далонь з тонкімі пальцамі без манікюра.

— Маму вашу зваць Фрося, Ефрасіння. Есць у вас і брат... Зваць яго... Як жа зваць? Ага, Уладзімір, — яна высмыкнула далонь.

— Быў Уладзімір. Ён загінуў каля горада Апавы, у Чэхіі. Што вы яшчэ ведаеце?

— Што вас двойчы хрысцілі.

— І гэта вам вядома? Не тлуміце мне галаву, лепш скажыце, што ведалі маіх бацькоў. Прызнайцеся, ведалі?

— Прызнаюся, — і жартаўліва падняў рукі ўгору. — А такія сустрэчы бываюць раз у паўстагоддзе. Цяпер маю права зваць вас проста Марына, бо колькі разоў няньчыў скручанае спавівачамі гарластае дзеўчанё.

— Дык хто вы? Як вас зваць? Можа, і ваша імя мне вядома?

— Так і быць. Розыгрыш не ўдаўся,— і я назваў сябе. Яна ссунула бровы, напружваючы памяць:

— Чакайце... прозвішча чутае... ад ма-

Светла, нібы пры сустрэчы,
Кожную рыску матулі сваёй уяўляю.

●

Кожны раз, як прыеду дамоў,
Аглядаю свае баравіны.
Недалічваю звонкіх ствалоў,
Невясёлыя ў леса навіны.

Пад ляшчынай звіняць камары,
Тут дзяцінства страсала арэхі.
Дзе яно? — Не сустрэў у бары.
Уцякло, як няўлоўнае рэха.

Дзе калісьці сівенькі машок
Пузанкі плечуком падымалі,
Перасох баравінны пясок,
І ляшчыны галлё паспляталі.

Там, дзе ягад было — хоць грабі,
Ні за што не зачэпіцца вока.
Паўзнімалі узгоркі гарбы,
Іх, пакатыя, бачыш здалёку.

Там, дзе ельнік задумлівы рос
(Да імхоў апускалася вецце),
Загусціўся бярэзнічак.
Скрозь
Крапівы і маліны нашэсце.

Дзе крынічка гаюча цякла,
Камяні перасмягла бялеюць.
Да рачулкі сцяжынка вяла,
Прывяла. П'ю і чую: «Мялею».

Толькі неба над борам былым
Ды вяршыні стажкоў мурашыных.
Боль па лесу у сэрцы маім
Не знаходзіць для выйсця сцяжыну.

Я хачу, каб мой лес не рэдзеў,
Да яго дапаўзу і далезу,
Каб злучыць корань лёсу людзей
З перасечаным коранем лесу.

●

Прывыкаць трэба змалку
Зямлю берагчы
І любіць,
Як найпершую ў свеце святыню.
І тады
Будзе светла табе і ўначы,
І тады
Да Радзімы любоў не астыне.

Адзінокім
Ты з ёю не будзеш нідзе.
Па зямлі пазнаюць —
Хто ты: дужы ці хілы.
І калі ты прыстанеш
У цяжкай хадзе,
Для цябе
Яна знойдзе і лекі і сілы.

Ты яе беражы
Ад напасці і зла
І любі,
Прыкрываючы ў бітве сабою,
Каб тады,
Калі пойдзеш глыбей ад святла,
Не здавалася
Цяжкай табе і чужою.

●

Далёка мы ад дому. Хоць бы слова
Пачуць і супакоіцца душой.
Прыснілася:
Не чую роднай мовы,
Мне цяжка гаварыць не на сваёй.

Хачу спытаць,
Адкуль такое гора.
Як на збавенне да людзей бягу.
Яны ж — праходзяць міма, не гавораць,
Спрабую закрычаць, ды не магу...

Прачнуўся.
Ціха-ціха у прасторы.
Заслухаўся начною цішынёй.
Стамлёна не ўздыхае нават мора,
Іскрыцца толькі зорка над гарой.

Нагрэтая зямля адпачывае.
Дачушка спіць.
Што сніцца ёй, малой?
Як рад я, што са мной душа жывая —
Карэньчык роду. нацыі маёй!

●

На схіле веку,
Хочацца мне, Ганначка —
Унучка сінявокая мая,
Ісці з табой,
Стаяць з табой на ганачку,
Траву кранаць, і краскі, і чмяля...

І расказаць пра годы навальнічныя
(Яны твае не патрывожаць сны!),
І ўсе палянкі паказаць сунічныя,
Не напалохаць жахамі вайны.

Убачыць сосны, стромкія, высозныя,
Вытокі ручайкоў, рачулак, рэк...
І з веку агрэсіўнага і грознага
Перавясці цябе — у мірны век.

Тваёю згодай буду я расчулены.
Спытаеш:
«А тады што, дзед, пасля?»
Ну, а тады мне ў самы раз ссутулена
Сысці туды, дзе дыхае зямля.

Квецень. Фотаэцюд Ул. КРУКА.

мы. Так, нешта ўспамінаецца. А дзе жывяце цяпер?

Мы абмяняліся кароткай інфармацыяй. Марына працавала педыятрам у Рыбноўскім раёне на Разаншчыне, цяпер вярталася дадому ад мужавай радні.

— Дарога ў нас дальняя. Раскажыце, калі ласка, усё, што помніце пра тыя мае «хрэсьбіны». З маміных расказаў мала што запомнілася.

У купэ адчыніліся дзверы, праваднiца на столік паставіла шклянкі з чаем. Каб сабрацца з думкамі, я марудна размешваў лыжачкай цукар, зняў абгортку з пачка вафляў, павольна сербануў гарачага чаю. Марына не дакранулася да шклянкі, моцна счапіўшы пальцы рук, чакала, што я скажу.

— З чаго ж пачаць?.. — задумаўся я.

— З самага пачатку. Усё, што помніце. Калі ласка.

— Тады слухайце. Піце чай і слухайце. — Я яшчэ сербануў глыток.

— У пачатку дваццатых гадоў голад многіх пагнаў з гарадоў у далёкія хлебныя мястэчкі і сёлы. Наехала шмат інтэлігентаў і да нас. Запомніўся добры мастак Лебедзеў. Ён выкладаў у школе маляванне і так захапіў усіх вучняў, што не было хаты без размаляваных печы і сцен. І спевы ў нас выкладаў наезджы настаўнік, а ў нядзелю спяваў на клірасе. Быў яшчэ маленькі, кудлаты і чарнявы, юркі, як малпачка, музыкант. Іграў ён на кларнеце, аж шыбы звінелі ў наваколлі. З'явіўся і ваш бацька, у скуранцы, чыгуначнай фуражцы з кантамі. Ён з вашаю мамаю і Валодзькам спыніліся ў нас: з маім бацькам яны былі раднёю ў трэцяй стрэчы. Так што і мы з вамі трохі свае. Добра памятаю вашу маму, бялявую, сарамлівую і ціхую. Валодзьку было гады чатыры. На левай шчацэ ў яго цямнела ладная радзімка.

За мястэчкам у полі быў вялікі двухпавярховы млын, а пры ім — крупадзёрка, ваўначоска і пільня. Каля млына стаялі дзве хаткі — адна для завознікаў, другая для машыніста. Пакуль трымаўся НЭП, млын належаў местачковаму заможніку Довіду Стральцу. Ён адразу згадзіў вашага тату ў машыністы і пасяліў у парожняй хатцы.

Летам я часта прыбягаў у млын, гадзінамі глядзеў, як сапе, цяжка дыхае, шпокае маслянымі поршнямі, сыкае помпаю, дрыжыць і зыбаецца ўкапаны ў зямлю запацелы чорны паравік. Дзядзька Павел пры ім здаваўся нейкім чараўніком. Бацька ваш у мястэчку быў адзіны сапраўдны рабочы, бо не меў ніякай маёмасці — адным словам, самы што ні ёсць пралетар. Таму на ўсіх сходах ён заўсёды сядзеў у прэзідыумах, на святочных дэманстрацыях ішоў у першым радзе побач з раённым начальствам.

Пасля каляд мая маці пайшла ў водведкі да цёткі Фросі, а вярнулася надосвітку. На бацькава запытанне толькі і сказала «дзевачка». Зразумеў і я, што ў дзядзькі Паўла з'явілася дачка. Неўзабаве ад маці пачуў незнаёмае слова «акцябрыны». Яна расказвала суседкам, што ў воласці загадалі Паўлу не хрысціць дзіця, а запісаць па новых законах у клубе, пры людзях. Такога ў мястэчку яшчэ зроду не было.

Погаласка пра акцябрыны пакацілася з вуліцы ў вуліцу, з канца ў канец. На рынку, у крамах, на цвінтары адна ў аднае пыталіся жанкі, калі ж будуць тыя савецкія хрэсьбіны? Хто будзе за «папа»? Ці пусцяць хоць паглядзець?

Вось і настаў той дзень, сцюдзёны і завейны. Зіма ўдалася снежная і лютая, на ўскраінах панакручвала гурбы роўныя са стрэхамі. Акцябрыны прызначылі ў клубе: у самым вялікім з нацыяналізаваных дамоў выпілавалі адну сцяну паміж пакоямі, паставілі лаўкі, збілі невысокі памост. Удзень тут засядаў суд, а ўвечары праводзілі мітынгі і сходы.

На змярканні мой бацька запрог нашу сівую кабылу, узяў мяне і паехалі да млына. Узрушаная цётка Фрося ўздыхала і прычытала: «А божачка, божачка, як жа яно будзе? Каб хоць не застудзіць дзіцятка. Там жа народу збярэцца цьма і будуць глядзець, як на нехрысцяў». У вашай хацінцы ўжо была мая маці, а ўсім камандавала бабка Пабліянка. Была такая ў мястэчку здатная на ўсе рукі кабета: ніводная парадзіха не абыходзілася без яе, і на хрэсьбінах яна камандавала, ніхто вяселля без бабы Пабліянкі не спраўляў, і нябожчыка ў апошнюю дарогу без яе не выпраўлялі — усё яна ведала, усё ўмела, усім верхаводзіла. На вашу маму толькі буркала: «Няма чаго войкаць. От вязіце барджэй, ды не баўцеся, а я тым часам памалюся, каб анёлы засланілі святую душачку ад нячысцікаў».

Яна ўпраўна снавала пры печы. На сцяне і на дзвярах скакалі водбліскі кармазынавага полымя, у печы нешта булькала, сквярлося, пад кужэльным абрусам дымілісь смачнаю параю пірагі. Калі выходзілі з хаты ў клубах марознага паветра, бабка тройчы пераражагнала нованароджаную, сказала «з богам» і зачыніла дзверы.

У полі скавытала і круціла мяцеліца, гурба замеценага снегам пілавіння здавалася высачэзнаю гарою, чарнела зацярушаная ў пазах мучным і снежным пылам сцяна млына з белымі бельмамі акон. У небе праз ускудлачаныя хмары шчарбаты месяц заліваў халодным сіняватым святлом імклівыя снежныя змеі, што перапаўзалі абледзянелую дарогу. Мы людзьве расселіся на санях і паехалі супроць ветру. Мястэчка пачыналася старымі кладамі. У змроку шумелі і шаргацелі абледзянелым веццем расахатыя хвоі, прывідамі здаваліся аблемаваныя снежнаю навіссю помнікі і пахілыя крыжы. Ехалі паціху, каб на раскатах не перакуліліся сані.

Вокны клуба залівала белае святло, пад дзвярыма тупалі людзі, якім не хапіла ў сярэдзіне месца. Як толькі мы пад'ехалі, усе расступіліся, даючы нам дарогу. Паперадзе ішла захутаная ў вялікую суконную хустку ваша мама, побач — бацька, за імі — я з Валодзькам. Клуб быў набіты людзьмі па самыя дзверы. Прыткнуліся да сцен, таўкліся ў праходзе і каля невысокіх падмосткаў. На іх стаяў доўгі стол, накрыты чырвоным, справа — трыбуна, пасярэдзіне сцяны вісеў партрэт Карла Маркса. Для вашай маці, напэўна, з нейкага маёнтка прывезлі пацягнутае зялёным аксамітам высокае крэсла. Побач, на звычайным гнутым крэселцы сеў бацька ў сваёй нязменнай скуранцы, з аднаго боку паставілі Валодзьку, з другога для сіметрыі мяне. Зала гаманіла і гула: бесцырымонна разглядалі вашых бацькоў, часам чулася: «І бога не баяцца». Нехта пярэчыў: «Хіба ён такі страшны?» — «Як жа нехрышчонаму жыць?»—«А чаго гэта Іванаў хлопец прыляпіўся?» «Павел жа, кажуць, ім нейкая радня». Я чырванеў, гатовы ўцячы ад сораму, але жаданне ўпершыню быць навідавоку, адчуваць, што і я тут не старонні, перамагло сорам. Усе пазіралі на бакавыя дзверы, але адтуль доўга ніхто не выходзіў. У невялікім зальчыку станавілася парна і душна ад кажушных, цыбульных і часночных пахаў.

Нарэшце з баковачкі выйшаў у расшпіленай камісарскай скуранцы старшыня прафсаюза Лазар Віленчык, за ім — зграбная, у чырвонай касыначцы, кіраўнік жаночага аддзела Насця Клімчук, і наезджы, з паголенай, як гарбуз, галавою, у зялёным фрэнчы з кішэнямі, як добрыя торбы, старшыня мясцовай каперацыі Суораў. Віленчык пазваніў школьным званком, і ўсе сціхлі. Гаварыў ён зычна, доўга і складна, а што, я тады нічога не зразумеў. Пасля яго за трыбуну стаў Суораў з вялікаю тоўстаю кнігаю ў чырвонай абкладцы. Нехта добра чутным шэптам сказаў: «Гэта іх явангелле», яго перакрыў шэпт ад дзвярэй: «А кудлаты Лазар за папа». Віленчык пазваніў і некаму паківаў пальцам.

Суораў разгарнуў кнігу. Не заглядаючы ў яе, зычна і хутка загаварыў, што рэлігія опіум для народа (што такое той опіум, ніхто ў мястэчку і не чуў), што папы, ксяндзы і рабіны ашуканцы і крывасмокі, а ў цэрквах, касцёлах і сінагогах абдурваюць і пазбаўляюць смеласці і волі людзей. Потым пачаў нешта чытаць з кнігі. Чытаў аднастайна і доўга, спатыкаючыся, вымаўляў незнаёмыя словы. Не ведаю, як дарослыя, а я ў тым чытанні нічога не цяміў.

(Заканчэнне на стар. 10—11).

ЯЕ ВЯЛІКАСЦЬ АКТРЫСА

У БЕЛАРУСКАЙ драматычнай студыі ў Маскве, педагогамі якой былі майстры МХАТа на чале з Валянцінам Сяргеевічам Смышляевым, С. Станюта адкрыла для сябе важныя ісціны і правілы; імі яна і сёння кіруецца ў сваёй творчасці. Іграеш ты маленькую ролю ці ўдзельнічаеш у масоўцы, няхай у глядзельнай зале сядзіць толькі некалькі чалавек,— заўсёды трэба працаваць так, быццам ты знаходзішся на адказнейшым экзамене. Толькі такім чынам з тэатральнага свайго юнацтва яна разумее сутнасць акцёрскай творчасці.

У лістападзе 1926 года ў Віцебску быў адкрыты Другі беларускі дзяржаўны тэатр (Акадэмічны тэатр імя Якуба Коласа), у якім разам з іншымі выпускнікамі студыі пачала працаваць і Стэфанія Станюта. Тут яна выконвала ролі Тытаніі («Сон у летнюю ноч» Шэкспіра), Агавы («Вакханкі» Эўрыпіда), Псіхеі («Эрас і Псіхея» Ю. Жулаўскага). У 1927 годзе тэатр звярнуўся да драмы М. Грамыкі «Каля тэрасы». У спектаклі С. Станюта іграла Манюню, дачку доктара Барановіча. Выхаваная бацькам-рэвалюцыянерам, яна з вялікай павагай і сімпатыяй ставіцца да простага народа. Яе Манюня — жвавая, жыццярадасная, з пачуццём гумару, і разам з тым востра адчувае драматызм гістарычных падзей. У Віцебску да 1931 года актрыса сыграла многа роляў у савецкім рэпертуары: Паліна ў «Авангардзе» В. Катаева, Людміла Міхайлаўна і Настаўніца (п'есы У. Кіршона «Рэйкі гудуць» і «Горад вятроў»), Эміль у п'есе Ю. Юр'іна «Калі спяваюць пеўні». Гэта былі каларытныя, адметныя па ўнутраным свеце і па тэмпераментных выявах жаночыя вобразы.

Калі Стэфанія Станюта ўступіла ў трупу БДТ-І, калектыў быў ужо сталым творчым саюзам аднадумцаў, які цвёрда стаяў на рэалістычных пазіцыях і, што самае галоўнае, няўхільна імкнуўся да стварэння сучаснага актуальнага рэпертуару. Тэатрам кіраваў тады выдатны рэжысёр і педагог, выхавацель вялікай групы беларускіх акцёраў Е. Міровіч, а сцэну тэатра ўпрыгожвалі імёны такіх таленавітых майстроў, як У. Крыловіч, У. Уладамірскі, Г. Глебаў, Б. Платонаў, І. Ждановіч, В. Галіна, Л. Ржэцкая, В. Пола і іншыя. Стэфанія Станюта заняла сярод іх сваё адметнае месца, яна адразу прыйшлася, як кажуць, «да двара» ў гэтай дружнай акцёрскай сям'і. Яе палюбілі ў тэатры за яскравы талент, за яе вялікую чалавечую прыгажосць, за чысціню і чуласць, за сціпласць і добрасумленныя адносіны да працы. Стэфанія Станюта заўсёды зараджае сваіх сяброў бескарыслівай улюбёнасцю ў тэатр. Усё яе жыццё, усе клопаты і радасці аддадзены мастацтву.

Для Станюта кожная роля, вялікая ці маленькая,— гэта шчасце. Над кожнай яна заўсёды працуе многа і старанна, таму амаль усе створаныя ёю вобразы такія яркія і запамінальныя. А роляў у маладой актрысы было шмат. Нагадаем лепшыя з іх. Глафіра ў спектаклі «Ваўкі і авечкі» А. Астроўскага. Глафіра — маладая, але вопытная драпежніца. У Станюта яна была разумная, разважлівая і жыццялюбівая. Актрыса выявіла сваё ўменне тонкімі штрыхамі, ледзь улоўнымі намёкамі стварыць дакладна акрэслены характар. Глядач разумеў, што Глафіра не толькі вельмі здольная вучаніца Мурзавецкай, але неўзабаве пераўзыдзе яе, бо яна і маладзейшая і прыгажэйшая. Таму і лянівы тугадум Лыняеў не змог устаяць перад імклівай, тонкай атакай чароўнай Глафіры — Станюта. Роля Глафіры з'явілася буйным дасягненнем актрысы.

І яшчэ адна роля, у якой найбольш поўна ўвасобілася ўсё назапашанае за гэтыя гады,—Дыяна са спектакля «Дурная для іншых, разумная для сябе» Лопэ дэ Вэга. Станюта надзяліла яе здаровым народным гумарам і мудрасцю. Сялянская дзяўчына, якая выпадкова апынулася на месцы герцагіні, аказвалася больш узвышанай і разумнейшай за арыстакратак. Яна з лёгкасцю заваёўвала прызнанне і сімпатыі простага народа. З незвычайным майстэрствам выконвала актрыса гэтую ролю. Камедыйны бляск у выкананні спалучаўся з глыбокім драматызмам. Вобраз Дыяны стаў сапраўдным шэдэўрам актрысы ў шэрагу роляў камедыйнага плана.

Стэфанія Міхайлаўна Станюта з поспехам выступала і ў трагедыйных ролях. Так было, напрыклад, у спектаклі «Фландрыя» В. Сарду, дзе яна здзівіла ўсіх выдатным выкананнем ролі гераічнага плана — вобраза Сары Мацісон.

Значнай падзеяй у жыцці беларускага тэатра была пастаноўка п'есы К. Крапівы «Хто смяецца апошнім» у 1939 годзе. Станюта была першай выканаўцай ролі Зіначкі Зёлкінай у гэтым спектаклі. Яна паказала выдатнае ўменне ляпіць востры сатырычны характар. Сама актрыса сваёй гераіні дала імя «фік-фок на адзін бок», — і гэта было вельмі дакладна і вобразна. Яе Зіначка знешне здавалася элегантнай, але яе мяшчанская сутнасць так і вылузвалася з яе. Лёгкая і грацыёзная Зіначка—Станюта лётала па сцэне, нібыта матылёк, бесклапотная і нікчэмная, яна была да пары агідным тыпам—Гарлахвацкаму і Зёлкіну.

З гэтым спектаклем улетку 1941 года тэатр выехаў у сонечную Адэсу. Тут яго і напаткала вайна. Калектыў быў неадкладна эвакуіраваны ў Томск. Да канца вайны Станюта была адарвана ад роднай зямлі. Адзіным суцяшэннем была праца. Працаваць — гэта значыла жыць. І, не ведаючы стомы, Станюта побач з удзелам у спектаклях тэатра, выступае з канцэртамі на заводах і фабрыках, працуе ў ваенным шпіталі, дзе вядзе гурток мастацкай самадзейнасці.

У гэты час, акрамя роляў названых вышэй, яна іграе жанчыну-патрыётку Вольгу («Душа Масквы» Л. Нікуліна), Цёцечку («Хлапец з нашага горада» К. Сіманава). Тут у Томску Станюта стварае яшчэ адзін яркі камедыйны вобраз графіні Дыяны дэ Бельфлор («Сабака на сене» Лопэ дэ Вэга). Своеасаблівасць гэтага выканання была ў бясконцай разнастайнасці фарбаў і выразных сродкаў.

Узіму 1944 года Станюта разам з канцэртнай брыгадай была ў Маскве. Тут М. Калінін уручыў ёй медаль «За працоўную доблесць». Адначасова Стэфаніі Міхайлаўне Станюта было прысуджана ганаровае званне заслужанай артыстцы БССР.

Калі Беларусь была вызвалена, тэатр змог вярнуцца дадому, у родныя сцены. Перад творчым калектывам паўставалі новыя актуальныя задачы. У іх вырашэнні самы актыўны ўдзел прымае і Станюта.

Для Стэфаніі Міхайлаўны перыяд рэпетыцый — гэта любімы час творчай працы. Яна заўсёды імкнецца зразумець рэжысёра, яго пункт гледжання на ролю і будучы спектакль, шмат спрабуе, шукае. Часам роля адразу не даецца, і актрыса зноў і зноў пачынае новыя спробы, шукае новыя фарбы. Станюта — чалавек творчы, яна з павагай прыслухоўваецца да крытыкі і рэжысёраў, сяброў па працы, ніколі не спыняючыся на аднойчы знойдзеным, ад спектакля да спектакля развівае характары сваіх гераінь, імправізуе. Вельмі любіў іграць са Стэфаніяй Міхайлаўнай выдатны майстар беларускай сцэны Глеб Паўлавіч Глебаў. Па некалькі разоў самі акцёры глядзелі дуэты Станюта і Глебава ў спектаклі «Дзень цудоўных падманаў» Р. Шэрыдана, дзе яна іграла Дуэнню, а Глебаў — Мендозу. Дуэння была адной з любімых роляў актрысы: хуткая, нібыта вецер, яна заражала і сваіх партнёраў і гледача вяселлем, заўсёды выклікаючы смех і апладысменты.

У ролі Зёлкінай («Хто смяецца апошнім» К. Крапівы).

І ў самай маленькай ролі Станюта ўмее знайсці такую непаўторную рысу, якая робіць яе вобразы не падобнымі ні на якія іншыя. І яшчэ адна асаблівасць яе творчасці — здольнасць спалучаць драматычнае з камедыйным. Такой была яе Шарлота ў спектаклі «Вішнёвы сад» А. Чэхава: і камічнай, і, у той жа час, глыбока драматычнай.

Пані Вашамірская («Салавей» З. Бядулі), Карміліца («Рамэа і Джульета» У. Шэкспіра), Жабрачка («Крамлёўскія куранты» М. Пагодзіна), Долі («Анна Карэніна» Л. Талстога), Жыўка («Пані міністэрша» Б. Нушыча), Іраіда («Дабракі» Л. Зорына), Падушкіна («Мільён за ўсмешку» А. Сафронава) і шмат іншых вялікіх і маленькіх роляў розных па характарах, былі заўсёды цікавыя, яркія, сакавітыя ў выкананні Станюта. Год за годам удасканальваўся яе талент. І ў 1957 годзе ёй было нададзена ганаровае званне народнай артысткі БССР.

Вобраз Куліны Чарнушкі ў спектаклі «Людзі на балоце» па раману І. Мележа з'явіўся адным з лепшых у шэрагу народных нацыянальных характараў, створаных Стэфаніяй Міхайлаўнай. Па раману Куліна — мачаха Ганны. У выканаўцы гэтай ролі магло б узнікнуць стэрэатыпнае рашэнне вобраза: мачаха — значыцца злосная. Але актрыса пайшла па іншаму шляху, і Куліна ў яе была чалавекам з мяккім, чулым сэрцам. Яна дасягнула поўнай знешняй выразнасці: высокая, худая, змучаная шматгадовай непасільнай працай, але, на здзіўленне, з добрымі і клапатлівымі вачыма. Усё ў гэтым вобразе — і манеры, і мова, і выяўленне пачуццяў, і характар мыслення, — усё было ўвасабленнем душы народа, увасабленнем нацыянальнага беларускага характару.

Адной з самых значных работ Станюта ў апошнія гады з'явілася бабуля Вольга ў спектаклі «Я, бабуля, Іліко і Іларыён» Н. Думбадзе і Г. Лордкіпанідзе. Жыццёвая праўда, чалавечая цеплыня, нацыянальны гумар і каларыт — вось тыя асаблівасці выканання ролі бабулі Вольгі. А ў апошняй, цудоўна сыгранай сцэне смерці, актрыса ўзнімала вобраз Бабулі да сімвалічнага абагульнення. Яна здолела стварыць непаўторны нацыянальны грузінскі характар, з уласцівым яму агеньчыкам і тэмпераментам.

Неўзабаве Станюта стварае яшчэ адзін народны характар Марылі ў спектаклі «Раскіданае гняздо» Я. Купалы. Гэта быў надзіва праўдзівы абагульнены вобраз беларускай жанчыны. Разбурана хата, павесіўся Лявон, Зоська зняслаўлена і пакінута панічом, Сымон хапаецца за сякеру — Марыля ледзь паспявае ўсвядоміць усе гэтыя падзеі. Яе застылая постаць, погляд вачэй, то ў бясконцай роспачы, то з бляскам нейкай надзеі, адкрывалі часам перад гледачом усю глыбіню яе трагедыі. Але гэтая няшчасная жанчына не схілялася перад ударамі лёсу, яна мела сваю годнасць...

Актрыса Станюта знялася амаль што ў 35 фільмах. І тут таксама, часам, лёс робіць ёй падарункі, як гэта здарылася, калі вядомы кінарэжысёр Ларыса Шапіцька прапанавала ёй галоўную ролю Дар'і Пінігінай у фільме «Развітанне» па раману В. Распуціна. Цяпер нават цяжка ўявіць творчасць Стэфаніі Міхайлаўны без гэтага вобраза. Яе Дар'я — гэта сама прырода. Яна, як той магутны непахісны дуб на роднай зямлі, так глыбокі яе карэнні, дзякуючы якім выяўляецца яе неверагодная сіла духу.

Стэфанія Міхайлаўна і сёння здымаецца ў новым фільме. І гэтак увесь час, як яна сама кажа: «...з тэатра на вакзал, з цягніка на самалёт. І заўсёды — дамоў, дамоў! Сюды, на вуліцу Энгельса, на нашу маленькую і такую ўтульную сцэну... Цябе клічуць агні гэтай рампы, твае калегі, сябры. І — гледачы!..»

Народная артыстка БССР Стэфанія Міхайлаўна Станюта па-творчы няўрымслівая і ў кожнай новай ролі таленавітая. Такой яе і вітае наша грамадскасць, адзначаючы 80-годдзе выдатнай актрысы.

Уладзімір НЯФЕД,
доктар мастацтвазнаўства.

АКЦЯБРЫНА

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 8—9).

Марына Паўлаўна глядзела нейкім адсутным зажураным зрокам, нібыта бачыла той завірушны вечар, душны перапоўнены клуб, зусім маладых сваіх бацькоў, шустрага Валодзьку з радзімкаю на шчацэ. Я замаўчаў. Глуха татахкалі колы на стыках, за акном мільгалі пераезды, будкі стрэлачнікаў, пакгаузы, паўстанкі і шчыльныя прыдарожныя прысады з елачак. Я думкамі і пачуццямі перанёсся ў той завірушны вечар, і зноў вачыма хлапчука ўбачыў усё і ўсіх, такіх маладых і знаёмых, незваротна страчаных назаўсёды.

Мая спадарожніца парушыла маўчанне.

— Чаго ж вы замоўклі? Я слухаю... — яна абаперлася падбародкам на счэпленыя замком смуглявыя далоні.

Ад доўгага аднастайнага чытання Суворава ўсе занудзіліся. Я пераступаў з нагі на нагу, пачаў круціцца з боку ў бок. Цётка Фрося смыкнула мяне за рукаў і з папрокам зіркнула добрымі светлымі вачыма. Калі Суворaў дачытаў сваю рату і сеў, на памост узышоў старшыня местачковага Савета Барыс Галубавец з доўгаю прашнураванаю кнігаю. Віленчык узяў з матчыных рук дзіця, паклаў на чырвоны настольнік, і на ўвесь клуб пакаціўся залівісты плач. Усе за сталом, а за імі і ў зале запляскалі ў ладкі. «Ого, галасістая! Бедная, естачкі хоча!» — пачулася з розных куткоў.

— Вось азвалася новая грамадзянка нашай краіны — Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік Акцябрына Паўлаўна, — урачыста абвясціў Суворaў. — Зараз прадстаўнік Савецкай улады запіша яе ў кнігу актаў грамадзянскага стану па новым звычаі, які завецца Ак-цяб-рыны. Віншуем высокасвядомага прадстаўніка рабочага класа таварыша Цімкевіча і яго... — Суворaў замяўся, — жану, адным словам супругу Фросю Епіфанаўну з дачкою Акцябрынаю. Па даручэнні райвыканкома, праўлення кааперацыі, арцелі «Спартак», прафсаюза і камсамола нованароджанай уручаюцца падарункі.

У суседнім пакоі па камандзе юркага кудлаценькага кларнетыста, якога адразу ахрысцілі капельдудкіным, аркестр пажарнікаў грымнуў туш. Дзяўчаткі ў юнгштурмаўках і чырвоных касынках на выцягнутых руках, як дары ад заморскіх паслоў, унеслі каляровыя скруткі і склалі на стале ладнаю горкай. У цэнтры зіхацеў самавар. Людзі ўставалі з месцаў, станавіліся на дыбачкі, выцягвалі шыі — кожнаму хацелася пабачыць, чым жа адарылі шчаслівых бацькоў і дачушку.

Маці нізка пакланілася прэзідыуму і залу. Бацька павінен быў нешта казаць, а тады яшчэ не было завядзёнкі загадзя пісаць прамовы, дык ён ад хвалявання толькі і сказаў: «Я, як рабочы чалавек, апраўдаю давер'е Савецкай уласці. Абавязкова апраўдаю, як рабочы чалавек... Дазрастуе міравая рэвалюцыя! Ура!» Усе ахвотна крыкнулі ў адказ, а нованароджаная зайшлася залівістым плачам. Віленчык кіўнуў у бакоўку, і пажарнікі грымнулі «Інтэрнацыянал». Усе ўсталі і заспявалі гімн. Яго хутка засвоілі, бо кожны сход заканчваўся спяваннем «Інтэрнацыянала» і «Беларускай марсельезы».

Маці калыхала на руках прыкрытае хусткаю дзіця і нешта ласкавае шаптала. Замоўк аркестр. Шумна разыходзіліся местачкоўцы з першых акцябрын. Каля канавязі замеценая снегам наша кабыла лена хрумстала сена. Бацька строс посцілку, склаў у перадок падарункі, мне даручылі везці самавар. Я яго моцна трымаў за настылыя вушы, аж зайшліся ад холаду і здранцвелі пальцы.

Хмары раздаліся, неба вызарыла, бралася на мароз. Шчарбаты месяц заліваў блакітным святлом зіхатлівыя стрэхі і сумёты, наслізганую палазамі дарогу, белыя прысады і поле, аблемаванае заінелым лесам. Ехалі моўчкі, толькі папісквала Акцябрына.

— Ванечка, падгані трошкі хутчэй. Дачушка ж заходзіцца ад голаду,—прасіла ваша мама і не назвала ні разу дзіця новым імем.

С. Станюта з актрысай Г. Бальчэўскай у спектаклі «Верачка» па п'есе А. Макаёнка.

Эліза ў «Скупым» Мальера.

ДЗЯКУЙ...

У НОВЫМ фільме студыі «Беларусьфільм» «Мама, я жывы!» (рэжысёр І. Дабралюбаў, аўтар сцэнарыя У. Халіп) яна іграе адну з галоўных роляў.

Старая настаўніца, што ў лясной партызанскай школе вучыць дзяцей не толькі грамаце, але і ўсяму, што складае і фарміруе чалавечую асобу, — любові да Радзімы, годнасці і дабрыні. У выніку нечаканага нападу гітлераўцаў яна застаецца адна з групай сваіх вучняў, ва ўмовах блакады, без прытулку і ежы. І тады дзеці, хлапчукі, бяруць на сябе ношу, якая пад сілу, бадай, толькі дарослым мужчынам, — ахоўваць і карміць усю групу, лячыць яе самую, хворую і знясіленую. Усё роўна яна ім патрэбна, бо мужнасць і нешта больш моцнае за сяброўства, што аб'ядноўвае цяпер іх усіх, зыходзяць у асноўным ад яе — Домны Піліпаўны, ад гэтага добрага сэрца...

Здаецца, што актрыса нічога не іграе. Яна жыве ў карціне так проста і нязмушана, што з пэўнай цяжкасцю ты ўспамінаеш другую Стэфанію Станюта — пані Вашамірскую ў «Салаўі» З. Бядулі або праныру Зёлкіну ў камедыі К. Крапівы «Хто смяецца апошнім»...

І ўсё-такі, калі яна, Домна Піліпаўна, разам з вучнямі стаіць перад гітлераўцамі, ведаючы, што ратунку няма — не проста верыш, што, калі б надарылася ў яе жыцці такое, дык і яна, як Януш Корчак, раздзяліла б з дзецьмі іх лёс, не кінула б іх, — гэта **ведаеш.** Той падсвядомасцю, якая за самай бліскучай ігрой адчувае чалавечую сутнасць акцёра, яго грамадзянскае крэда.

Заўсёды думаю — дзе канчаецца іграа, ужыванне ў вобраз, і пачынаецца сама сутнасць акцёра? Бывае, адчуваеш, што гэтай сутнасці якраз і няма, а ёсць уменне пераўвасобіцца, трапіць на эмацыянальную хвалю, якая нясе і ўзносіць — часам нават даволі высока. Такі акцёр ці актрыса іграюць як бы «нутром», і вобраз ствараюць цікавы, але адыходзіць пасля спектакля гэты вобраз — і не застаецца ў чалавеку нічога; дакладней кажучы, амаль нічога... І ёсць творцы, якія сапраўды нібы ўсё жыццё збіраюць ў скарбонку тое, што бачаць у жыцці, пра што самі думаюць, і ўласная іх індывідуальнасць расцвечвае вобраз мноствам адценняў і фарбаў. Такую індывідуальнасць не зламаць ніводнаму рэжысёру, самаму прыхаматліваму ў сваіх фантазіях, а толькі — узбагаціць, накіраваць, зрэшты — паставіць на яе... Стэфанія Станюта, па маім адчуванні, — з такіх акцёраў. Ніколі не сустракалася з ёю асабіста, але міжволі— ёсць жа прэса, інтэрв'ю, творчыя вечары! — многае ведаю пра яе. Аблічча яе, што гадамі складвалася ў маім уяўленні, усё ўзбагачаецца і як бы паглыбляецца.

Галоўнае ж, канечне, — гэта творчасць.

Марыля ў «Раскіданым гняздзе» Я. Купалы, Рыпіна ў «Плачы перапёлкі» І. Чыгрынава, Дар'я ў фільме паводле «Развітання з Мацёрай» В. Распуціна — у гэтых менавіта ролях найбольш поўна і ярка выяўляецца яе ўнутраны свет і аблічча.

Вось яна шэпча заклік-заклінанне Зямлі, Сонцу, Прыродзе, і таемны гэты, чарадзейны шэпт захліствае, зачароўвае, і ты нібыта разам з ёю зліваешся з зямлёй, з сонцам, з ветрам... Не Піфія, не Геката, не Сівіла — не, яна з добрых сіл прыроды; яна — Маці, што дае сілу ўсяму жывому і падтрымлівае кожны, самы слабы парастак жыцця. Такая Дар'я С. Станюта на экране.

Для майго пакалення яна наогул перш за ўсё — менавіта Маці.

...Што застаецца ад работы акцёра? Апісанні сучаснікаў, водгукі, рэцэнзіі. Ды толькі жывое ўяўленне, той міг, калі адбываецца цуд пераўвасаблення, — толькі ён дае магчымасць адчуваць па-сапраўднаму, хто ёсць хто. Тэлебачанне, кіно цяпер фіксуюць іграу акцёра, але ж далёка не ўсё, што ён стварае. І колькі хочаш чытай пра іграу народнай артысткі БССР Стэфаніі Станюта ў ролі Тытаніі, Псіхеі, Дыяны, Глафіры ў 20—40 гг. — а ўспрымаеш яе сённяшнюю, у агляднай для нас прасторы, у тым, што мы бачым. Успрымаем — эмацыянальна, пачуццёва, сэрцам. І многа дае гэтаму ўспрыманню дадатковае асэнсаванне таго амаль неверагоднага факта, што ёй — восемдзесят, і яна застаецца па-творчы працаздольнай, цікавай, што яна сёння — адна з самых яркіх нацыянальных актрыс краіны.

Можа, гэта толькі асабістае ўражанне — але і там, у «Развітанні з Мацёрай», яна была як бы знаёмай, адной з тых кабет, што помняцца з дзяцінства, што збіралі зёлкі, шапталі над хворымі замовы, з тых беларускіх, славянскіх жанчын, якія ў поўнай меры ўвасабляюць сілу дабра і мудрасці нашага народа.

Нацыянальны каларыт характару — паняцце, якое бывае і цяжка растлумачыць, але яно адчувальнае, яно сапраўды як бы ўзбагачае мастацкі вобраз тым, што паадметнаму кранае тваю душу, асабліва ў наш час суцэльнай урбанізацыі, літаратурнага гладкапісу... Ці не нацыянальная драматургія па-сапраўднаму дазволіла раскрыць такія выдатныя таленты, як нашы народныя артысты Г. Макарава, Л. Давідовіч, Г. Аўсяннікаў, М. Захарэвіч!.. І створаныя імі вобразы ўваходзяць у агульнае рэчышча шматнацыянальнай савецкай драматургіі і тэатра, пашыраючы і ўзбагачаючы яго. Менавіта таму, ствараючы вобраз беларускай жанчыны — настаўніцы ў фільме «Мама, я жывы!»,—Стэфанія Станюта адначасова стварыла і вобраз Жанчыны, вобраз Настаўніцы, цікавы і блізкі гледачу ў стэпах Казахстана і гарах Кіргізіі, у Прыбалтыцы і на Далёкім Усходзе, па-за межамі Саюза. Усім жа людзям блізка і дорага тое, што іх з'ядноўвае, што паказвае ў чалавеку Чалавека, што ўзвышае і абнаўляе яго.

Яе мастацтва, яе творчасць таксама ўзвышаюць і ўзнімаюць чалавека да вышынь самаахвярнасці і мужнасці, абуджаюць у ім лепшае.

У Стэфаніі Міхайлаўны пасапраўднаму зайздросны лёс. Жыццё дало ёй магчымасць выявіць праз сябе, праз свой талент і сам Час, а час гэты быў няпросты і нялёгкі. Яе любяць і ведаюць ужо некалькі пакаленняў — і нашы бацькі, і нашы дзеці. Яе мастацтва ўвайшло ў нашы жыцці, хай сабе і далёка не ўсімі гранямі, што зіхацелі, напрыклад, гледачам 20-ых гадоў. Не так многа іграе яна ў тэатры, як хацелася б нам, — і ўсё роўна кожная сустрэча з ёю на падмостках, у студыі тэлебачання, у кіно — гэта радасць. І дзякуй ёй за гэта!

Вольга ІПАТАВА.

На творчым рахунку С. Станюта многа кінароляў. На здымку — кадр з фільма «Раданіца» (сцэнарый А. Кудраўца і Ф. Конева, рэжысёр Ю. Марухін).

Фота Ул. КРУКА і А. ДЗМІТРЫЕВА.

РОДАМ З ВАЙНЫ

Многія ўжо добра знаёмы з дакументальнымі запісамі С. Алексіевіч «У вайны — не жаночы твар», — на старонках якіх аб пройдзеных дарогах расказваюць жанчыны, што ў час фашысцкай акупацыі перажылі шматлікія нягоды, страцілі блізкіх людзей, самі цудам уратаваліся ад смерці.

І вось чарговая публікацыя — на гэты раз у папулярным выданні «Роман-газета». У сувязі з 40-годдзем Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне рэдкалегія вырашыла майскія нумары — дзесяты і адзінаццаты — выпусціць пад адной вокладкай. Так нарадзіўся мастацка-дакументальны зборнік «У тыя грозныя дні», аўтарамі якога з'яўляюцца пісьменнікі А. Генатулін, М. Нікольскі, А. Бляееў, М. Шаўчэнка і С. Алексіевіч.

Запісы «У вайны — не жаночы твар» зацікавілі і літаратурна-мастацкі і публіцыстычны штогоднік «Парус», які выдавецтва «Молодая гвардия» выпускае для юнацтва. У сёлетнім нумары яго прапануюцца раздзелы з вострапубліцыстычнага твора С. Алексіевіч.

Р. ТОПАР.

Нарэшце з воблакамі белае пары ўваліліся ў цесную хатку. Пасля клубнага святла яна здавалася асабліва змрочнаю. На сцяне гарэла пяцілінейная лямпа, на засланым стале стаялі талеркі з халадцом і смажанінаю, салёнымі гуркамі і ружовым салам. Яшчэ смачней пахла з печы. Бабка Пабліянка прыняла дзіця і, не раскручваючы, падала маці: «Бардзэй пакармі, Фросечка, і паехалі». — «Куды яшчэ паехалі?» — здзівіўся бацька. «Куды? Куды? Ты сваё дзела здзелаў і маўчы»,—сказала бабка і пачала завязваць гаматную суконную хустку. «Іван, падкінь кабыле тым часам». Бабка камандавала ўсім і ўсімі і, хочучы ці не, а слухаліся яе. Сцішанае дзіцятка яна закруціла ў новую ружовую коўдру, кіўнула майму бацьку, яны выйшлі з хаты і толькі было чуваць, як зарыпелі сані.

— Што гэта яна надумалася? Чаго тут камандуе? — усхадзіўся дзядзька Павел.

— Кажуць, трэба правезці праз тры масты, каб не хварэла дзіця. От і павезлі. Не бойся, бабка ўсё ведае, — схлусіла маці, — а ты тым часам унясі з кладоўкі капусты.

На ўскраіне мястэчка, непадалёк ад кладоў, жыў поп айцец Аляксей. Да яго і паехалі. Кумам быў мой бацька, кумою — бабка Пабліянка. Колькі яна прыняла, ахрысціла і пакуміла, сама ніколі не ведала. Без яе ніхто не абыходзіўся. Усе местачкоўцы былі яе хрэснікі. Ніхто не ведаў, колькі ёй год — заўсёды была ў адной меры і здавалася вечнаю.

Неўзабаве яны вярнуліся. Бабка разгарнула дзіцятка, перахрысціла, лёгка падкінула ўгору і сказала: «Хай расце вялікая, разумная ды здаровенькая хрышчоная Марынка. А цяпер усе за стол. Кум, налівай!»

Дзядзька Павел толькі лыпаў вачыма:

— Дык гэта вы... гэта вы, значыць, ашукалі, хрысціць вазілі? І ты, Ваня... а-яй. Што ж я скажу Віленчыку, як пагляджу ў вочы?

— А ты не глядзі. На ёй жа знаку няма, хрышчоная ці не. Гэта ж не воспа. Ты нічога не чуў і не бачыў. Акцябрына ці Марына адно і тое ж. Тое па-іхняму, гэта па-нашаму. Вырасце, сама разбярэцца. Няма чаго цяпер гавэнду разводзіць. Усе за стол!

Спачатку пілі і елі моўчкі. Потым разгаварыліся ды і заспявалі. Мой бацька выцягваў: «У зары ў зоранькі многа ясных звёзд», пакуль не асалавеў над талеркаю халадца. Мы з Валодзькам заснулі на печы.

Наступіла доўгая паўза.

— А пасля яшчэ спраўлялі акцябрыны?

— Не прыпамінаю. Пры мне не было.

— Чаму ж толькі адны? Чым я заслужыла такую ўвагу?

— Відаць, таму, што ў мястэчку больш нікога не было пралетарскага паходжання. Кожны местачковец меў хоць мізэрную ўласнасць. Ды і накладна, пэўна, было рабіць падарункі. Нараджаліся дзеці, хто хрысціў, хто запісваў у Савеце, і ўсе аднолькава параслі, людзьмі сталі, вайну адваявалі. Цяпер з даўнейшых мала каго ў мястэчку сустрэнеш... Вясною млын нацыяналізавалі. Жыццё наладзілася, і вашы бацькі паехалі назад у Жлобін, на чыгунку. Разы са два прыходзілі лісты ад вашага таты, потым дачуліся, што ён загінуў у нейкай аварыі. І ўсё абарвалася... Гэта ж трэба, праз столькі гадоў сустрэцца ў адным купэ. Каб адправіў пісьмо, так бы, мабыць, і прамаўчалі, або пералівалі б з пустога ў парожняе. Магчыма, ужо не раз недзе сустракаліся, праходзілі побач і разміналіся, нічога не ведаючы. Каб хто расказаў пра такую сустрэчу, не паверыў бы. А цяпер ваша чарга. Раскажыце пра сябе.

— І ўсё ж завуць мяне Акцябрынай. Мама спачатку і Марынай звала, а як пайшла ў школу, запісалі па метрыцы. Так і засталося. І мама прывыкла.

Жыццё яе склалася, як і ў кожнага з яе пакалення: былі страты і пакуты ў вайну, галоднае студэнцтва, замужжа, дзеці і работа ў заводскай паліклініцы.

На развітанне абмяняліся адрасамі, абяцалі пісаць, але так і не прыйшло ніводнага ліста: яна, відаць, чакала, што напішу я, а я спадзяваўся на яе. Потым і адрас згубіўся.

Гады праз два я ўспомніў Акцябрыну і напісаў наўгады на адрас тае заводскай паліклінікі, але ліст вярнуўся з адзнакай: «Адрасат выбыў». Куды, не вядома.

Дагэтуль шкадую, што страціў хоць і далёкую сваячку. Іх усё меней і меней застаецца ў мяне. А радню заўсёды трэба берагчы.

Раман ТАРМОЛА

Мы не для бед абраны

Мы не для бед абраны.
Ды шчасце,
як няўлоўнае:
І, загаіўшы раны,
Пяём
пра незагойнае.
Мы —
споведзь днём і ноччу
Сябрам,
усяму свету.
Да вёсак родных крочым
Мы —
праз усю планету.

Мая радаслоўная

Быў дзядзька Юзік.
Дзядзька Косця быў.
Праз месяц — пахаронка.
Праз паўтара — другая.
Быў род як род.
Не скажаш, што слабы.
Вайна якая
выжыць роду памагае?
І ўжо ж ніякага зусім радства
Між Беларуссю
і фашысцкай Прусіяй.
Былі дзядзькі...
Было дзядзькоў аж два...
Хацелі жыць...
Ды вось загінуць мусілі.
Вінтоўку не трымалі у руках
Да гэтага...
Хіба што плуг ці скрыпку.
Іх душы
мне гукаюцца ў радках
І ад крыві
мая здаецца ліпкай...
Ссівелы маршал потым напісаў:
«Маглі і меншымі мы абысціся
стратамі...»
Крывёю наліваецца раса
За спінамі дзядзькоў,
за іх жа хатамі...
Яны стаяць сцяною да сцяны,
Спіною да спіны
І так сціхотна,
Як гром раптоўна
грукатам вайны
Па вёсцы пройдзецца
Паўзводна і паротна.
Яны стаяць...
І ўдумны іх пагляд
Глыбока у нутро мне скіраваны...
«...Сынок,
не дажыву я да каляд...» —
Як нітка,
маці голас абарваны.
Ды нітку надтачылі галаском
Сястры Галіны
І сястры Рэгіны.
Разлукай у гародчыку вяргіні
Цвітуць...
А ў горле жоўтым камяком.
Такая філасофія жыцця:
Працягвацца каб,
трэба абрывацца...
І што з таго,
што злосна зубы сцяў?
За вечнасць І зубамі не ўтрымацца.

●

Нешта ў свеце не тое,
Штосьці ў свеце не так...
Пакаленне,
якое не знае вайны,
Адбівае за ноч па дзесяць атак —
Сніць крывавыя сны,
Каляровыя сны...

Яно ўскоквае ў цемры
І з крыкам бяжыць,
Пакідаючы ложак
і маці,
і дом,
Да збавення бяжыць,
Як да нейкай мяжы
Паміж ноччу і днём,
Паміж явай і сном.

Супакойцеся,
ціха,
не будзе вайны —
Мне чутна пераклічка
Начных галасоў.
Праганяюць бацькі
страшэнныя сны
У дамах,
што стаяць пасярод лясоў,
У хацінах,
аглухшых ад цішыні,
У палатках,
што павуцінна трымцяць...
Век,
дзяцей барані —
Век,
сябе барані.
Ты — няшчаснае самае ў свеце дзіця.
Бо крывавяцца рана
твае туманы.
І рассыпана соллю
скупая сляза.
Пакаленне,
якое не знае вайны,
Можа лепш за дзядоў
пра вайну расказаць...

●

Усе здаровыя...
Пакуль
Сам не патрапіш у бальніцу
І не ўпадзеш ад болю ніцма,
Бялейшы ад усіх кашуль.

Глядзіш
і думкі паплылі
З палаты белае да лесу.
Як многа хворых на зямлі
Сярод здаровага прагрэсу.

І ты ацэніш боль чужы,
Свой перажыўшы неаднойчы.
І падабрэюць твае вочы
На смерці і жыцця мяжы.

Трымай плячо, брат,
ля пляча,
Род чалавечы,
род смяротны,
Шчаслівы самы
і гаротны,
І адкажыся ад мяча.

Для барацьбы твае
штодня
Інсультаў хопіць
і інфарктаў.
А пра вайну забыцца варта:
Радзее без яе радня...

Смех

Шчаслівы самы смех —
то смех кахання.
А самы жорсткі смех —
смех над сабой,
Хаця ацэніш самапакаранне,
Калі аднойчы
стрэнешся з бядой.

Ты здзівішся,
што некалі прадбачыў
Такое гора...
Але ж перанёс!
Бо смехам
сам сябе пераіначыў,
Сябе самога быццам перарос.

●

Як дзіўна,
што каштоўныя каменні
Схавацца могуць
у маленькай жмені.
Як страшна,
што гранёныя караты
Заб'юць сумленнасць
і ўратуюць ка́та.
Як смешна,
што каменьчыкі вякамі
Паміж людзьмі
вялізны клалі камень.
Як радасна,
калі твая рука
Не да алмаза цягнецца —
да матылька.

●

Сярод ночы сэрца разбудзіла,
Каб зрабіць
чарговы свой папрок:
Покуль спаў,
я столькі пахадзіла —
Аддаецца болем
кожны крок.

Што ж ты
пра мяне ізноў не помніш,
Помніць жа
даваў зарок...
Покуль я ў цябе
не камень-помнік,
Аддаецца болем
кожны крок.
Падміргнуў
люстэрку ты няўмела,
Атрымаў
яшчэ адзін урок —
Адчаго
завецца свет наш белым...
Аддаецца болем
кожны крок.
А цяпер
паслухайся, шаноўны,
Паляжы
і вусны — на-замок.
Не хваліся тым,
што рызыкоўны...
Аддаецца болем
кожны крок.

Як на памяць вузялок...

У якім не быў бы чыне,
Дзе б сябе не адшукаў,
Чалавека далячыні —
Не далей яго Айчыны,
Не далей яго кутка.

Гэта Ісціна святая
З вечнага календара
Нас часамі папракае,
Нас да існасці вяртае,
Нам даказвае: пара

Мітусліваму — спыніцца,
Бойкаму — паспакайнець
Шчасце,
з бацькавай крыніцы
Ціха роздуму напіцца,
Шчасце,
бацькаўшчыну мець!

У яе навідавоку
Кожны на зямлі грудок,
Як сабрат не адзінокі,
Як на памяць вузялок...

Беларусь

Найменне бацькаўшчыны —
Беларусь,
Не ад таго,
што ззяе плямай белаю.
Хутчэй за ўсё таму,
Што Беларусь
Для некага —
заўжды незразумелая.
Нялёгка зразумець народ
Ціхманы ў працы,
У змаганні — ваяўнічы,
Які геройскім
сам сябе не лічыць,
Ды вечна у героях яго род.

Артысты — дзецям

Беларускі дзяржаўны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа сумесна з Віцебскім абкомам ЛКСМБ і аблана ўпершыню правялі дэкаду «Творчая моладзь тэатра — дзіцячым дамам і школам-інтэрнатам Віцебскай вобласці». Адбыліся паездкі ў Наваполацкі дашкольны дзіцячы дом, Ветрынскую, Опсаўскую, Дзісненскую школы-інтэрнаты. Артысты паказалі спектакль па казцы В. Зіміна «Жыла-была Сыраежка», чыталі вершы К. Чукоўскага, спявалі папулярныя дзіцячыя песні.

У шэфскіх паездках прынялі ўдзел заслужаныя артысты БССР В. Петрачкова, Б. Сяўко, артысты В. Войчанка, М. Глушакоў, В. Грушоў, С. Жукоўская і іншыя.

С. ДАШКЕВІЧ.

Артыстка Л. Заграбельная з выхаванкамі Наваполацкага дзіцячага дома.

Фота С. КОХАНА.

СУАЙЧЫННІКАМ ПРА КАЛІНОЎСКАГА

Чарговая кніжка, што выйшла ў серыі «Бібліятэчка газеты «Голас Радзімы», называецца «Кастусь Каліноўскі». Аўтар яе кандыдат філасофскіх навук В. Шалькевіч расказвае пра жыццё і дзейнасць вядомага рэвалюцыянера - дэмакрата, мысліцеля, ніраўніка паўстання 1863—1864 гадоў на Беларусі і ў Літве.

Нашым суайчыннікам за мяжой будзе цікава даведацца пра шлях чалавека, які «не толькі здолеў узняцца да прызнання неабходнасці класавай барацьбы і народнай рэвалюцыі як сродку карэннай перабудовы грамадства, але і заклікаць беларускіх сялян да паўстання...», пазнаёміцца з сутнасцю сацыяльна - палітычнай праграмы, што меў намер ён ажыццявіць з дапамогай паўстання.

Г. БАГАЧОУ.

ВЫСТАЎКІ

Каб далучыцца да непаўторнага свету творчасці выдатных майстроў выяўленчага мастацтва, неабавязкова збірацца ў паездку ў Ленінград, дзе многія з іх работ захоўваюцца. Для гэтага дастаткова завітаць у Дзяржаўны мастацкі музей БССР, дзе працуе выстаўка заходнееўрапейскай графікі XV—XVIII стагоддзяў з фондаў Эрмітажа. У экспазіцыі прадстаўлены работы, выкананыя мастакамі Іспаніі, Англіі, Германіі, Францыі, Італіі, Фландрыі і Галандыі.

Знаўцы мастацтва ўжо ацанілі па-сапраўднаму значнасць гэтай калекцыі, а тых, хто наведае яшчэ музей, чакае незабыўная сустрэча са шмат якімі шэдэўрамі. На выстаўцы прадстаўлены «Вяртанне блуднага сына» неўміручага Рэмбранта, афорты Франсіска Гоі, яго славуты «Капрычас», твораннi Альбрэхта Дзюрэра.

Побач імёны таксама знакамітыя, якія шмат гавораць кожнаму, хто цікавіцца гісторыяй мастацтва. У экспазіцыі работы Клода Мелана і Нікола Дзеланэ, Антоніса ван Дэйка і Джорджа Гізі...

Чатыры стагоддзі заходнееўрапейскай графікі адлюстроўвае выстаўка. Знаёмішся з работамі, што ўвайшлі ў экспазіцыю, і бы перагортваеш яркія старонкі сусветнага мастацтва, атрымліваеш задавальненне ад таго, што ўвасобленае чалавечым талентам, не падуладна часу і заўсёды будзе хваляваць чалавека сваёй непаўторнасцю.

М. ГЕЛЬСКІ.

●

У выставачнай зале Акадэміі навук БССР экспануюцца 200 карцін настаўніка-пенсіянера, удзельніка абароны Ленінграда Л. Кулакоўскага.

Леанід Лук'янавіч вучыўся мастацтву ў старэйшых майстроў пэндзля рэспублікі — М. Станюты, у студыі П. Мрачкоўскай і С. Каткова. У свой час заахвоціў да мастацтва нямала вучняў школ-інтэрнатаў і школ, дзе працаваў. Вучыў дзяцей маляванню, лепцы, рабоце з гіпсам і дрэвам, мастацкай кераміцы, афармляў школьныя мастацкія музеі, а ў школе-інтэрнаце № 13 г. Мінска разам з вучнямі стварыў музей У. І. Леніна і алею герояў-маладагвардзейцаў.

Асабістае захапленне ветэрана — пейзажны жывапіс. Л. Кулакоўскі пабываў у многіх кутках краіны і рэспублікі і адлюстраваў свае ўражанні ў мастацкіх палотнах, якія напісаны жывымі, яркімі фарбамі. Сярод іх такія творы, як «Край свету. Порт Находка», «Заход. Нясвіж», «Свіцязь. Жураўлі прыляцелі», «Мінск. Украіна», серыя «Па лермантаўскіх і чэхаўскіх мясцінах», каўказскія і крымскія пейзажы.

І. КРУПЕНЯ.

ПРЭМ'ЕРЫ

У дні фестывалю мастацтваў «Мінская вясна» Рэспубліканскі тэатр юнага гледача імя 50-годдзя камсамола Беларусі паказаў новую работу. «У спадчыну — жыццё» — так называецца гэты спектакль, адрасаваны школьнікам. Аўтар п'есы Алесь Петрашкевіч, рэжысёр-пастаноўшчык Уладзімір Караткевіч, сцэнограф Ларыса Герлаван, кампазітар Алег Залётнеў. Сярод выканаўцаў — вучні мінскіх школ, студэнты Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута, артысты тэатра А. Шароў, К. Сянкевіч, Л. Цімафеева, Л. Горцава, С. Журавель, С. Дзмітрыеў, В. Ліхадзей, В. Лебедзеў і іншыя. Спектакль прысвячаецца 40-годдзю Вялікай Перамогі.

Г. РОШ.

На здымку: сцэна са спектакля.

Фота Ул. КРУКА.

І гімн, і рэквіем, і песня

Шматстайнасць почыркаў, непадобнасць талентаў, багацце жанраў і формаў і адначасова агульнае жаданне ва ўсіх аўтараў сказаць сваё слова пра наш гераічны час, пра подзвіг народа ў час барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, за ўсім гэтым — яе вялікасць памяць... Гучыць яна і сапраўдным гімнам мужнасці, гераізму тым, хто выстаяў у суровым змаганні, і жалобным рэквіемам, і велічнай песняй, што славіць жыццё, Радзіму, якая выратавала чалавецтва ад карычневай чумы фашызму. Гэта ўсё — Рэспубліканская выстаўка самадзейнага выяўленчага мастацтва, якая заняла другі паверх галоўнай экспазіцыйнай залы беларускай сталіцы — Палаца мастацтваў.

Не сказаць, каб усе творы вылучаліся высокай тэхнікай выканання, плённасцю ажыццяўлення задумы, выразнасцю мастакоўскага пошуку. Неаднолькавая ступень таленту ў аўтараў, веданне законаў жанру. У адным нельга адмовіць ім — у шчырасці і непасрэднасці, той душэўнай патрэбе, калі абавязкова з'яўляецца жаданне сказаць сваё слова і пра час, і пра чалавека, які выстаяў. І тады на першы план выходзіць паняцце памяці.

«Поле памяці» — так назваў сваю карціну Ю. Камісараў. Умелае выкарыстанне фарбаў дазволіла аўтару перадаць на звычайным, традыцыйным матэрыяле і суровы драматызм ваенных абставін, і неўміручасць жыцця. На пярэднім плане — стары з вінтоўкай за плячыма. Сагнуўшыся, цяжкай хадой ступае ён за плугам, каля ж вядзе хлапчук. А на небе — барвовыя сполахі, якія ў чымсьці нагадваюць полымя пажарышчаў, чырвоны колер паступова пераходзіць у шэрадымкаваты.

Уражвае выразнасцю мастакоўскай задумы, сюжэтнай скампанаванасцю і трыпціх В. Родчанкі. «Пахаронка», «Удовы», «Ля роднага дома» — у творах гэтых відавочны трагедыйна-драматычны пачатак. Сканцэнтроўваючы ўвагу менавіта на гэтым, аўтар паказвае, што нёс фашызм народу, які лёс рыхтаваў яму. Адначасова ў трыпціху прысутнічаюць і іншыя матывы — жыццесцвярджальныя ў сваёй сутнасці, аптымістычныя: людзі вяртаюцца да жытла, іх немагчыма скарыць. На гэтым асабліва акцэнтуе ўвагу Л. Разунова. Яе «Вяртанне ў спаленую вёску» напоўнена самім пафасам абнаўлення. Душэўнымі, надзіва ўнутрана прывабнымі атрымаліся воблікі старога, бабулі, унучкі з катком на руках.

В. АЛЯКСЕЕНКА. Сцяг Перамогі над рэйхстагам.

М. СКЛЯР. Трывожны час.

Е. АРЦЕМЕНКА. Хлеб-соль.

Д. КРУПЕНЯ. Выступае агітбрыгада.

З гэтым творам як бы пераклікаецца карціна Б. Агапава «Усё спачатку». Аўтар таксама адлюстраваў той момант у жыцці людзей, калі неабходна было аднаўляць разбуранае, каб працягваць жыццё. Стомленыя, прыселі на падмурак будучай хаціны стары і старая. Пра што думаюць яны? Пра сына, які загінуў недзе на фронце ці пра дачку, што памерла ад ран, калі, будучы партызанкай, трапіла ў варожую засаду? А мо пра тое, што вайна яшчэ не скончылася і нямала забярэ чалавечых жыццяў? Засяроджана - трывожны позірк, хоць відавочна іншае: цяплынь надзеі, якая цепліцца ў сэрцах немаладых людзей — усё павінна быць добра, вораг жа ўжо выгнаны з роднай зямлі.

Многія аўтары адлюстроўваюць паасобныя моманты з летапісу барацьбы з фашызмам. Намеры іх нельга не зразумець: кожнаму хочацца сказаць сваё слова пра тое, як набліжаўся Дзень Перамогі, як ішлі да гэтай святой мэты і байцы Чырвонай Арміі, і партызаны, і падпольшчыкі, і працаўнікі тылу. І наўрад ці варта падыходзіць з асабліва строгімі меркамі да таго ці іншага твора, калі бачыш падобнасць да палотнаў вядомых мастакоў. Галоўнае ўсё ж — высакароднасць намеру, душэўная акрыленасць, што пераходзіць у духоўную патрэбу расказваць менавіта пра гэта, а не пра іншае. Таму і хвалююць карціны В. Аляксеенкі «Сцяг Перамогі над рэйхстагам» і «Рэйкавая вайна» М. Чарвякова, што ў іх жыве часцінка памяці народнай, якая не згасне датуль, пакуль усе мы будзем памятаць, якой цаной заваяваны мір на зямлі.

Даволі прадстаўнічы ў экспазіцыі партрэт. У асноўным самадзейныя мастакі расказваюць пра людзей, блізкіх ім, тых, хто жыве ці працуе поруч. Аб гэтым, у прыватнасці, сведчыць і назва работы А. Кавалеўскага — «Ветэраны — мае землякі». Воблік знаёмага яму чалавека перадаў і А. Вертуноў. Ён стварыў вобраз ветэрана працы А. Тонкаля. В. Кандраценка, наадварот, схільны да большага мастакоўскага абагульнення. У яго «Партрэце ветэрана» відавочна жаданне раскрыць характар тыповага прадстаўніка ваеннага пакалення.

Як заўсёды, маляўнічыя пейзажы. Падгледжаныя пільным мастакоўскім вокам вабныя куточкі беларускай зямлі ўспрымаеш своеасаблівай песняй без слоў, у якой у адзіную мелодыю зліваюцца прачулыя, задушэўныя, чыстыя «галасы» многіх аўтараў. Краявіды, адлюстраваныя І. Грушэўскім, В. Гутнікам, Ю. Сергіенкам, Г. Ганчаронкам, А. Бухаркіным, У. Саладковым і іншымі сцвярджаюць веліч жыцця, яго нястомную хаду. Гледзячы на гэтыя работы, міжвольна пачынаеш думаць, што чалавецтва абавязкова павінна зрабіць усё магчымае, каб прадухіліць пажар новай вайны, якая можа стаць для яго апошняй.

Выстаўка справаздачная, таму часта сустракаеш сярод яе аўтараў творцаў, талент якіх добра знаёмы. Г. Асіпкова — у гэтым сэнсе не выключэнне. Здаецца, няма мяжы творчым пошукам таленавітай майстрыхі. Што ні новая работа, абавязкова трываласць народных карэнняў, традыцый, заўсёднае жаданне прыкмеціць характэрнае і істотнае ў паўсядзённым жыцці. Героі яе — нагадаем, што Г. Асіпкова займаецца разьбярствам па дрэве — пасапраўднаму каларытныя, народныя характары. Немалаважна і тое, што воблікі гэтых людзей раскрываюцца з гумарам, досціпам. Пацвярджэнне таму і адна з апошніх работ Г. Асіпковай «Абноўка».

Разьба па дрэве — адзін са старадаўніх відаў народнай творчасці. Тым больш прыемна, што дзякуючы намаганням таленавітых прадстаўнікоў народа яна не ідзе ў нябыт, а перажывае сваё другое нараджэнне, аб чым сведчаць і творы М. Скляра «Трывожны час», І. Грышына «Партызан» і работы іншых аўтараў, якія таксама звяртаюцца да гераічнай тэматыкі. Гэта ж самае можна сказаць і пра саломапляценне. Занятак традыцыйна жаночы, ён у наш час знайшоў нямала паслядоўніц тых, хто тварыў раней. З задавальненнем знаёмішся з работамі В. Гаўрылюк, В. Рынкевіч, Е. Арцёменкі, Н. Шыман і іншых. Саломка ў іх умелых руках ператвараецца ў дзівосны залаты цуд, што і вока цешыць, і душу радуе.

Не забываюць народныя майстры і пра такі традыцыйна беларускі матэрыял, як гліна. Ствараюць загадкавыя фігуркі казачных персанажаў, жывёл, кампазіцыі, у якіх імкнуцца падаць тое, што асабліва хвалюе іх. І, вядома ж, у экспазіцыі прадстаўлены ручнікі — а як ткуцца яны, можа расказаць Г. Палішчук, кросны якой знаходзяцца тут жа ў зале...

Свята народнай творчасці сёння ў Палацы мастацтваў. Трапіць на яго шмат жадаючых: выстаўку наведваюць школьнікі і студэнты, рабочыя сталічных прадпрыемстваў, настаўнікі, прадстаўнікі творчай інтэлігенцыі. У цікавасці гэтай — найлепшае пацвярджэнне таму, што тэма подзвігу народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, велічы і нязгаснасці яго духу — жыватворная крыніца, да якой хочацца далучацца бясконца.

А. КУНЦЭВІЧ.

А. ЛІПЕНЬ. Партрэт Рыгора Шырмы.

С. КАКШЫНСКІ. Адна з работ.

НА ЗАВОДСКІМ ФЕСТЫВАЛІ

Кожны год на Мінскім аўтамабільным заводзе арганізоўваюцца святы народных талентаў, на якіх самадзейныя артысты выступаюць са справаздачнымі канцэртамі. Нядаўна тут правялі дваццаць пяты такі фестываль.

Высокае выканаўчае майстэрства паказалі духавы аркестр, эстрадна-цыркавы ансамбль «Рамантыкі», дзіцячы ансамбль танца «Зубраня», харавыя калектывы вытворчасці колавых цягачоў і інструментальна-штамповачнага цэха, хор дашкольных устаноў гэтага прадпрыемства.

Парадавалі гледачоў калектывы, якія носяць званне народных — вакальны ансамбль «Журавінка», хор народнай песні, мужчынскі хор, ансамбль танца «Крыніца» і іншыя. Дарэчы, у такіх калектывах папаўненне — ганаровае званне народнага заваяваў ансамбль пантамімы заводскага Палаца культуры і тэхнікі.

Правядзенне такіх фестываляў садзейнічае далейшаму развіццю самадзейнай мастацкай творчасці, павышэнню выканаўчага майстэрства, папаўненню рэпертуару.

Пра народныя таленты завода ведаюць далёка за яго межамі. Вось і нядаўна народны ансамбль танца «Крыніца» прымаў удзел у перадачы Цэнтральнага тэлебачання «Калі ласка!», а народны вакальны ансамбль «Журавінка» — у праграме «Заспяваем, сябры».

Л. ПЯРШУК.

ПЕРАКЛАДЫ

Аўтары гэтай паэтычнай падборкі — маладыя нямецкія паэты, сябры нашай краіны, якія неаднаразова наведвалі Беларусь і яе сталіцу. Абодва яны — дзеячы руху за раззбраенне і супраць размяшчэння амерыканскіх ракет у Заходняй Еўропе, за разрадку напружанасці і ўзаемаразуменне паміж народамі. Натуральна, што іх палітычныя перакананні ляжаць у аснове іх творчасці, у многім навеянай таксама палітычнай рэчаіснасцю і напружанымі пошукамі свайго шляху ў жыцці і ў паэзіі. На жаль, заўчасная смерць аднаго з іх — Фолкера фон Тэрне — перапыніла плённы шлях гэтага таленавітага паэта-барацьбіта, па якім, аднак, паспяхова прадаўжае ісці яго сябар Крыстаф Хойбнер, што плённа працуе ў паэзіі, прозе і эсэістыцы. Ён вядомы ў Заходняй Германіі як адзін з самых актыўных антыфашыстаў і барацьбітоў за мір у Еўропе.

Васіль БЫКАЎ.

Крыстаф ХОЙБНЕР

Вёска

Пад сінім небам
вёска,
студня,
бярозка;
падае з неба
на схілы стрэх
то сонца спякотнае,
то снег;
чужому гасцінна адчынены дзверы —
з хлебам-соллю і даверам;
вясна прыходзіць у сяло,
дзяцей выводзіць на святло.

Пад сінім небам
вёска,
пажар, дым,
зброі лёскат;
прысак дагарае,
знікае забойцаў зграя.

Пад сінім небам
і сёння
зямля тут крычыць,
стогне;
дым вырастае з-пад яе,
нібы цень ахвяр паўстае;
нібы вецер з лістотаю,
гавораць з намі мёртвыя;
чуем мы: нам свае
пытанні Хатынь задае.

Фолкер фон ТЭРНЕ

Роздум у маі

Я расказваю пра сябе,
Пра Фолкера фон Тэрне,
Народжанага ў трыццаць чацвёртым
годзе
Дваццатага стагоддзя,
Калі мае таварышы ўжо змагаліся
супраць забойц,
Што мяне выхоўвалі
Па свайму падабенству:
І я піў малако,
Якога не хапала галодным. І я насіў
адзенне,
Нарабаванае ў майго брата. І я чытаў
кнігі,
Якія ўхвалялі разбой. І я слухаў прамовы,
Якія заклікалі да забойства:
І я называў бойняй
Маю краіну. калі ўжо народы паўсталі
Супраць майго народа. І я маліўся за
канчатковую перамогу
Забойц. калі ўжо гарады
Падымаліся ў дыме:
І я быў віноўны
У смерці кожнага чалавека,
Нічога не падазраваючы і ўдыхаючы
Пад шыбеніцамі
Салодкі водар ліп.*

Дым

Жыла-была краіна.
Зялёныя павозкі
Цягнуліся праз вёскі. На досвітку
Фыркалі каля ракі
Коні.

Куды яны рухаліся, бадзягі
І музыканты? На якім беразе
Пасвяцца іх коні?
Пры якім месячыку
Пяюць іх скрыпкі?

Ніхто іх не бачыў. Бясследна,
Як дым аблокаў,
Зніклі яны.

Пытанне

Мой дзед памёр
на заходнім фронце;
мой бацька памёр
на ўсходнім фронце.
На якім
памру я?

Пераклаў з нямецкай
Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

* На Унтэр дэн Ліндэн (літаральна: «Вуліца пад ліпамі») Гітлер павесіў пра грэсіўных дзеячаў-антыфашыстаў.

РЭПАРТАЖ У НУМАР

АГНІ ГОМЕЛЬСКАГА ЦЫРКА

Здалёк відаць гэтая прывабная канструкцыя са шкла і бетону, якая нагадвае фантастычную «лятаючую талерку», што спынілася на зямлі. Прасторнае светлае фае Гомельскага цырка нібы паўтарае круг арэны. Тут размясціліся ўтульныя буфеты, гардэробы. Светла і чыста. У цырку каля дзвюх тысяч глядацкіх месц, ды мітусні і штурханіны не адчуваеш тут нават ў час аншлагу. Гэты цырк адкрыўся ў снежні 1972-га. На першага лютага гэтага года яго прадстаўленні наведалі больш за шэсць мільёнаў чалавек, было паказана 64 цыркавыя праграмы. На Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве сярод тэатральна-відовішчных прадпрыемстваў краіны Гомельскі цырк неаднаразова займаў прызавыя месцы.

Мастацтва цырка — гэта мастацтва апантаных, смелых, спрытных. Немудрагелістыя, прастадушныя «хітрасці» клаунады, тэмпавыя, па-майстэрску адточаныя нумары наезнікаў, вальціжораў, гімнастаў, жанглёраў; разумныя дрэсіраваныя звяры — ад тыграў да хатніх катоў — усё гэта захапляючае яркае відовішча цырка.

Дырэктар Гомельскага цырка Я. ЛАБОВІЧ расказвае:

— Два цыркі ў краіне маюць высокае званне — «Образцовое предприятие ВО «Союзгосцирк». Гэта наш калектыў і цырк у Кіславодску. Работа гамяльчан дала свой плён: за гады адзінаццатай пяцігодкі падрыхтаваны 23 новыя цыркавыя нумары, рэгулярна ставяцца тэматычныя дзіцячыя спектаклі да школьных канікулаў. Да 40-годдзя вызвалення Беларусі наш цырк паказаў тэатралізаванае прадстаўленне «Увасобленая песня», якое атрымала высокую ацэнку гледачоў. У ім удзельнічалі артысты абласнога драматычнага тэатра і, побач з прафесіяналамі, — самадзейныя артысты двух народных цыркаў. Да 40-годдзя Вялікай Перамогі распрацаваны вялікі план мерапрыемстваў: творчыя сустрэчы з вядучымі артыстамі савецкага цырка, гутаркі на тэму «Савецкі цырк у гады Вялікай Айчыннай вайны», сустрэча артыстаў цырка з ветэранамі партызанскага руху на Гомельшчыне, у Беларусі, з Героямі Савецкага Саюза, удастоенымі гэтага звання за подзвігі ў баях за Беларусь. Наш цырк вядзе актыўную ваенна-шэфскую работу, дае прадстаўленні для дапрызыўнай моладзі. Мы атрымалі пераходны кубак БРК прафсаюза работнікаў культуры за культурна-шэфскую работу.

У нас працуе сталы творчы калектыў — эстрадны аркестр. Ён быў арганізаваны вядомым дырыжорам Д. Сакаловым. Затым аркестр узначаліў выхаванец Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Ю. Васілеўскі. Ён паспяхова працуе з калектывам ужо дванаццаць гадоў. Аркестр выступае на Гомельскім тэлебачанні з праграмамі эстраднай музыкі, акампаніруе салістам абласной філармоніі. Дырыжор Ю. Васілеўскі неаднаразова ўдзельнічаў у гастролях майстроў савецкага цырка за мяжой: у Балгарыі, Венгрыі, Аргенціне, Перу, Уругваі. Ён кампазітар і аранжыроўшчык, піша музыку для рэпертуару аркестра цырка.

Добрыя ўмовы работы і быту стымулююць далейшыя творчыя поспехі калектыву, прываблываюць у Гомель вядомых майстроў савецкага цырка.

Мы цяпер захоплены падрыхтоўкай да святочнага спектакля, прысвечанага 40-годдзю Перамогі, над пастаноўкай якога працуе галоўны рэжысёр цырка Д. Радзінскі.

А. ВАЙНШТЭЙН,
фота аўтара.



Паветраная гімнастка Н. Каровіна.

Выхаванцы беларускага цырка — гімнасты на турніках пад кіраўніцтвам В. Кашубы.



Г. Макавей з дрэсіраваным сабачкам.

ПРЫЗНАНЫ ЛЕПШЫМ

У Слуцкім раёне праводзіцца вялікая работа па ўмацаванні матэрыяльна-тэхнічнай базы культасветустаноў. Толькі летась тут здадзены ў эксплуатацыю Палац культуры ў вёсцы Казловічы калгаса імя Кірава на 600 месц, клуб у вёсцы Леніна калгаса імя Карла Маркса на 400 месц і брыгадны клуб у вёсцы Строхава калгаса «Мір» на 150 месц. У стадыі будаўніцтва клубы саўгаса «Белічы» і калгаса імя Куйбышава. Пройдзе зусім нямнога часу і іх сцены абудзяцца галасамі самадзейных артыстаў, сюды будуць прыходзіць хлебаробы, наб карысна і цікава правесці свой вольны час.

Такія клопаты аб культасветустановах садзейнічаюць паляпшэнню культурнага абслугоўвання сельскіх працаўнікоў. На Случчыне створаны і актыўна дзейнічаюць 10 цэнтралізаваных клубных сістэм, 6 сацыяльна-культурных комплексаў, сацыяльна-спартыўны комплекс, цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма. Пры культасветустановах працуе больш за 300 гурткоў мастацкай самадзейнасці, клубаў па інтарэсах, у якіх займаецца каля чатырох тысяч самадзейных артыстаў.

Раён прызнаны лепшым у Мінскай вобласці па арганізацыі культурнага абслугоўвання працаўнікоў вёскі.

У. ЖУРАЎЛЕНКА.

З ПАКАЛЕННЯ — У ПАКАЛЕННЕ

Па-майстэрску выконвае беларускія і рускія народныя песні фальклорны ансамбль «Крупіцкія музыкі» калгаса «Новы быт» Мінскага раёна. Шчырасцю сваіх адносін да мастацтва самадзейныя артысты заваявалі любоў і павагу не толькі ў землякоў. Выступалі яны і перад значна большай аўдыторыяй — у Маскве, Югаславіі, Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы.

І вельмі прыемна, што сваю любоў да народнай песні ўдзельнікі самадзейнасці перадаюць сваім дзецям. Гэта яшчэ раз пацвердзіў абласны агляд-конкурс сямейных ансамбляў, з якога кожны прадстаўнік калгаса «Новы быт» вяртаўся дадому з дыпломам. Члены журы далі высокую ацэнку выступленням даяркі калгаса З. Кавалёвай і яе дачкі, вучаніцы шостага класа Алены.

Любяць народную песню энергетык гаспадаркі В. Барысевіч, яго жонка калгасны бухгалтар Ніна Васільеўна. Іх захапленне перадалося дзецям. На аглядзе-конкурсе паспяхова выступілі іх дзеці — шасцікласнік Аляксандр, сямікласнік Коля і вучаніца другога класа Наташа.

Гэта надзейная зарука таго, што заўсёды гучаць песням над Крупіцай — яна будзе перадавацца з пакалення ў пакаленне.

К. АНТАНОЎСКІ.

РОССЫПЫ ТАЛЕНТАЎ

Блакітнае бязмежнае возера. Шумлівыя цяністыя бары. Бярозавыя гаі і пералескі. Чарує Перабродцдзе прыгажосцю навакольных мясцін. Добра вядомы на Міёршчыне шчырыя, руплівыя людзі з гэтай вёскі. Гэтыя мясціны славяцца песеннымі традыцыямі. Нездарма ж тут існуе народны хор, які летась адзначыў свой 45-гадовы юбілей.

...Далёкі 1939 год. З песнямі сустракалі ў Перабродцдзі прыход Чырвонай Арміі, якая вызваляла Заходнюю Беларусь. Навокал чуліся вясёлы смех, бадзёрыя частушкі, мелодыі песень «Інтэрнацыянал», «Па далінах і па ўзгор'ях». Гэта быў адзін з першых на Міёршчыне калектываў мастацкай самадзейнасці. Кіраўніком хору быў В. Юневіч, які пазней стаў заслужаным артыстам БССР. Добра памятаюць перабродцы і вядомага артыста В. Шуманскага, дзейнасць якога таксама брала вытокі ў гэтым калектыве.

Пачалася Вялікая Айчынная вайна. І многія з былых артыстаў пайшлі на фронт.

Пасля вайны хор аднавіў сваю дзейнасць. Спявалі песні, ставілі і драматычныя творы. Добра памятаюць і зараз жыхары Перабродцдзя і навакольных вёсак спектаклі па творах Я. Купалы «Паўлінка» і «Прымакі», па п'есе К. Крапівы «Партызаны».

У 1948 годзе мастацкім кіраўніком хору стаў Аляксандр Сяргеевіч Сяліцкі, які ўзначальвае гэты калектыў і зараз.

Поспех спадарожнічаў спевакам заўсёды. Дружнымі апладысментамі сустракалі перабродскіх артыстаў не толькі на раённай сцэне. Паспяхова выступалі яны ў Полацку, Віцебску, Маладзечне, Мінску, братніх рэспубліках Латвіі і Літве.

Перабродскі хор — неаднаразовы лаўрэат абласнога і рэспубліканскага конкурсаў мастацкай самадзейнасці. А ў 1975 годзе яму было прысвоена званне народнага. Вакальная група гэтага хору ў 1984 годзе заняла другое месца ў конкурсе польскай песні.

На ўрачыстым канцэрце, прысвечаным 45-гадоваму юбілею хору, гучалі беларускія, рускія, польскія, украінскія песні. Шмат у рэпертуары і песень, якія ўслаўляюць родную Беларусь, паказваюць мужнасць і стойкасць нашага народа ў гады вайны.

Па-ранейшаму, як і 45 гадоў назад, спяваюць у хоры Н. Лушчык, В. Паўлоўская, Л. Марковіч, Н. Марковіч, А. Паўлоўскі, Г. Паўлоўскі, М. Юневіч, М. Шымко...

Спяваюць у калектыве нават сем'ямі. Так, на працягу многіх гадоў з'яўляюцца актыўнымі ўдзельнікамі хору Г. і В. Паўлоўскія, Р. і А. Пальчэўскія і многія іншыя. Усе гэтыя людзі па-сапраўднаму захоплены мастацкай самадзейнасцю, песняй.

Наогул, за 45 гадоў існавання хору яго ўдзельнікамі былі каля 300 чалавек. Некаторыя з іх жывуць у іншых месцах нашай неабсяжнай краіны. Але яны па-ранейшаму лічаць хор сваім, з радасцю сочаць за яго поспехамі.

— Кожная песня ў выкананні Перабродскага народнага хору мае своеасаблівае гучанне, якое можна параўнаць толькі са светлай і чыстай крыніцай, — так гаворыць пра творчасць калектыву сакратар Міёрскага райкома партыі А. Кавалёнак.

...А ў хор прыходзяць усё новыя людзі. Настаўніца Соф'я Гарбачонак, заатэхнік Георгій Басакоў, механізатар Анатоль Маслоўскі. Гэта ім, маладым, прадаўжаць песенныя традыцыі свайго азёрнага краю, рабіць усё, каб не мялелі крыніцы талентаў народных.

Т. ГУГАЛА,
супрацоўнік міёрскай раённай газеты «Сцяг працы».

ВЫТОК РАДАСЦІ І НАТХНЕННЯ

Здаўна славіцца Гомельшчына сваім песенным багаццем. У вобласці плённа працуюць народныя харавыя калектывы з багатымі традыцыямі, якія карыстаюцца любоўю і павагай слухачоў.

Сярод іх — народны хор Залескага цэнтральнага сельскага Дома культуры Чачэрскага раёна. У 1985 годзе ён адзначыць сваё 50-годдзе.

Харавы калектыў у Залессі з'яўляецца адным з лепшых на Гомельшчыне. У раёне, вобласці і далёка за яе межамі добра ведаюць і любяць яго за самабытнасць, высокую культуру выканання, змястоўны і разнастайны рэпертуар.

Ініцыятарам стварэння і першым кіраўніком яго быў настаўнік Залескай сярэдняй школы С. Райхман. У складзе хору было 20 чалавек. Заняткі праводзіліся ў маленькай хацечытальні. Рэпертуар хору складаўся ў асноўным з беларускіх народных песень, такіх, як «Ой, рэчанька, рэчанька», «Канапелькі», «Беларускія частушкі», «Лён», «Ой, на дварэ дзень бяленькі» і інш. А праз год, у 1936-м, хор ужо заняў першае месца на раённым аглядзе мастацкай самадзейнасці.

У 1948 годзе калектыў узначаліла калгасніца — удзельніца хору Настасся Надтачэева. На першым часе былі вялікія цяжкасці: не было нот, адсутнічалі музычныя інструменты, але, нягледзячы на гэта, у калектыве заўсёды быў прыўзняты настрой.

Наталля і Еўдакія Хімічовы, Настасся Кебікава, Соф'я Шкурынава... Гэта яны заўсёды былі першымі на рэпетыцыях у тыя цяжкія пасляваенныя гады, яны і цяпер у хоры разам з маладымі спевакамі.

Узбагаціўся рэпертуар новымі творамі, з'явіліся беларускія народныя песні «А ў садзе рэчанька», «Чорныя вочы, пара ўжо спаць», «Што за месяц, што за ясны», «Зязюленька», «Пойдзем, пойдзем лугам» і іншыя.

З 1958 года пачынаецца новая творчая старонка жыцця калектыву. Хор узначаліў Р. Гейфман — чалавек, улюбёны ў народную песню. Раман Аркадзьевіч, чалавек з густам і вопытам работы, добра ведае, які доўгі шлях ад знаёмства з песняй да яе канцэртнага гучання. Так было з беларускімі народнымі песнямі «Казачэнька мой міленькі» і «Квітней, Залессе», песнямі аб прыгажосці роднага краю, аб жыцці працаўнікоў роднага сяла.

Радасная вестка прыйшла ў Залессе ў 1965 годзе — хору прысвоена ганаровае званне «Народны самадзейны калектыў». І з новым творчым уздымам пачалася работа, карпатлівая, сістэматычная праца над новым, больш складаным рэпертуарам, нюансіроўкай, дыкцыяй, дыханнем. І зноў канцэрты ў роднай вёсцы, у раёне, гастрольныя паездкі.

У 1975 годзе хор быў узнагароджаны дыпломам Міністэрства культуры БССР, Белсаўпрофа,ЦК ЛКСМБ за ўдзел у рэспубліканскім аглядзе сельскай мастацкай самадзейнасці, становіцца лаўрэатам І Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці працоўных.

З пакалення ў пакаленне перадаюцца песні ў Залессі. З любоўю і гордасцю за свой калектыў раскажуць пра чарговае канцэртнае выступленне Ліда Бяляева, Аўдоцця Загорцава і Аўдоцця Бабкунова, якія спяваюць у хоры каля 40 гадоў, Марыя Грушкова і Ніна Марчанка і многія іншыя, для якіх народная песня стала жыццём.

Склаліся ў хоры і сямейныя традыцыі. Разам прыходзяць на рэпетыцыю муж і жонка Бяляевы, сёстры Аўдоцця і Наталля Хімічовы, маці і дачка Загорцавы, сёстры Галіна, Настасся і Марыя Трыбуналавы і іншыя. Удзельнічаюць у хоры і навучэнцы старэйшых класаў сярэдняй школы са сваім камсамольскім сакратаром Марынай Загорцавай.

Цяпер у Залессі ў цэнтры вёскі пабудаваны новы Дом культуры з выдатнай глядзельнай залай і пакоямі для гурткоўай работы. І ідуць у хор людзі розных узростаў і прафесій, якіх аб'ядноўвае любоў да народнай песні. Гаворыць старэйшая ўдзельніца хору Соф'я Іванаўна Шкурынава. «Здараецца, прыйдзеш на рэпетыцыю стомлены, з дрэнным настроем, а заспяваеш — і адчуеш, як адыходзіць самота, абнаўляецца душа, і ўсю цябе ахоплівае нейкая радасць. Хочацца жыць і жыць».

Шырокая геаграфія канцэртнай дзейнасці народнага хору. Гэта Чачэрск, Буда-Кашалёва, Сербавічы, Нісімкавічы, Бабічы, Батвінава і многія іншыя населеныя пункты раёна і вобласці. За апошнія два гады калектыў даў больш за 60 канцэртаў.

...Не змаўкае песня ў Залескім Доме культуры — рыхтуецца новая праграма, куды ўвойдуць песні «Ой, туманы мае растуманы» С. Захарава, «Лясная песня» У. Алоўнікава, новыя творы — «Курганы» М. Наско, «Куды б ні ішоў, ні ехаў ты» М. Кутузава і іншыя. У рэпертуары хору больш за 100 твораў беларускіх, рускіх, украінскіх кампазітараў, апрацоўкі беларускіх народных песень.

М. ШАМШЭНЯ.
загадчык сектара мастацкай самадзейнасці Гомельскага АНМЦ народнай творчасці і культасветработы.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ТЭАТРАЛЬНА-МАСТАЦКІ ІНСТЫТУТ

АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС

на замяшчэнне вакантнай пасады выкладчыка курса фізвыхавання

Тэрмін конкурсу — месяц з дня апублікавання аб'явы.

Дакументы накіроўваць на імя рэктара інстытута па адрасе: 220012, Мінск, Ленінскі праспект, 81.

У РАМКАХ УСЕСАЮЗНАГА ТЫДНЯ

У рэспубліцы прайшлі мерапрыемствы, зместам сваім звязаныя з Усесаюзным Тыднем выяўленчага мастацтва, які прысвячаўся 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Урачыстае адкрыццё адбылося ў выставачнай зале Брэсцкага аддзялення Саюза мастакоў БССР. Жыхары горада змаглі пазнаёміцца з выстаўкай выяўленчага мастацтва, на адкрыцці якой выступілі сакратар праўлення Саюза мастакоў БССР І. Міско, ветэраны вайны — народны мастак БССР Л. Шчамялёў і мастак Э. Куфко.

У гэты ж дзень выстаўкі жывапісу і графікі адкрыліся ў палацах культуры калгасаў «Савецкая Беларусь» Камянецкага і «Запаветы Леніна» Маларыцкага раёнаў. Тут выступілі з творчай справаздачай сакратары праўлення СМ БССР М. Ганчароў і У. Гоманаў, начальнік аддзела выяўленчага мастацтва Міністэрства культуры БССР У. Уродніч, старшыня секцыі скульптуры СМ БССР М. Кандрацьеў, народны мастак БССР Л. Шчамялёў.

Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР І. Міско і заслужаны дзеяч мастацтваў рэспублікі У. Стальмашонак сустрэліся са студэнтамі і выкладчыкамі Брэсцкага педагагічнага інстытута імя А. С. Пушкіна, з калектывам рабочых і служачых Брэсцкай фабрыкі верхняга трыкатажу.

У дні Тыдня ў гарадах і вёсках рэспублікі было арганізавана больш як сорак мастацкіх выставак—справаздачных, перасоўных, персанальных, групавых, адбыліся сустрэчы на выстаўках, у творчых майстэрнях, на прадпрыемствах, навучальных установах, калгасах і саўгасах, воінскіх часцях. Народныя мастакі СССР З. Азгур і М. Савіцкі, народныя мастакі БССР А. Анікейчык, А. Бембель, Я. Зайцаў, Л. Шчамялёў, заслужаныя дзеячы мастацтваў рэспублікі Г. Вашчанка, Г. Паплаўскі, П. Крахалёў, А. Кашкурэвіч. В. Грамыка, І. Стасевіч, І. Ціханаў. В. Пратасеня, М. Гуціеў, А. Малішэўскі, заслужаны дзеяч культуры БССР А. Казлоўскі, заслужаны настаўнік рэспублікі В. Вярсоцкі, мастакі І. Белановіч, М. Кандрацьеў, У. Летун, В. Палійчук, І. Дзьмухайла, В. Мінейка, А. Курачкін і іншыя расказалі аб сваёй творчасці, падзяліліся планамі.

Лектарскай групай Саюза мастакоў БССР, навуковымі супрацоўнікамі Дзяржаўнага мастацкага музея БССР прачытана каля 50 лекцый аб выяўленчым мастацтве. На базе рэспубліканскай выстаўкі дзіцячай выяўленчай творчасці праведзены семінар «Фарміраванне марксісцка-ленінскага светапогляду сродкамі выяўленчага мастацтва», у якім прынялі ўдзел выкладчыкі школ, кіраўнікі гурткоў і студый.

Тыдзень завяршыўся традыцыйным конкурсам дзіцячага малюнка «Нам патрэбен мір!». Для юных гледачоў у Палацы мастацтваў быў паказаны спектакль народнага лялечнага тэатра «Батлейка», адбыўся кірмаш «Салют, фестываль», прысвечаны XII Сусветнаму фестывалю моладзі і студэнтаў у Маскве.

Л. САЛАВЕЙ,
адказны сакратар праўлення Саюза мастакоў БССР.

У ФОНД ФЕСТЫВАЛЮ

Бялыніцкі народны тэатр юнага гледача парадаваў жыхароў гарадскога пасёлка чарговай прэм'ерай. На сцэне раённага Дома культуры дэбютаваў намедыяй «Валацуга» малады драматург Сяргей Булыга. Пастаноўку п'есы ажыццявіла рэжысёр тэатра, выпускніца Мінскага інстытута культуры Тацяна Дольнікава.

Дарэчы — гэта і яе дэбют. Упершыню выступалі на сцэне таксама маладыя самадзейныя артысты Вольга Круць, Вольга Ходасава — вучаніцы Бялыніцкай СШ № 2, Васіль Радоўскі — навучэнец ПТВ № 217.

Спектакль будзе паказаны і ў шэрагу гаспадарак раёна.

Самадзейныя артысты вырашылі сродкі ад спектакля пералічыць у фонд XII Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.

М. КАРПЕНЧАНКА,
В. СУХАРАЎ.

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЛіМа»

Пад такой назвай у «ЛіМе» за 18 студзеня 1985 г. быў змешчаны артыкул кандыдата філасофскіх навук Д. Яканюка. Рэдакцыя атрымала водгукі на гэтую публікацыю. Яны былі надрукаваны ў нумары за 15 сакавіка. А вось і афіцыйны адказ — ліст у рэдакцыю за подпісамі дырэктара Беларускай дзяржаўнай філармоніі У. Ратабыльскага і яе мастацкага кіраўніка Ю. Гільдзюка.

«ВЫСТУПАЕ СІМФАНІЧНЫ»

«Артыкул «Выступае сімфанічны» Д. Яканюка, апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» 18 студзеня 1985 года, выклікаў шырокі водгук у калектыве Дзяржаўнага акадэмічнага сімфанічнага аркестра БССР, праблемам канцэртнай дзейнасці якога прысвячае аўтар свае разважанні.

Адзначаны прынцыповая патрабавальнасць і добразычлівы тон артыкула. Правільна зроблены вывад аб існуючым кантрасце паміж выдатна сыграныміпраграмамі сезона. І тымі, якія аўтар называе «няўдачнікамі», выкананымі «ў рабочым парадку», што прыводзіць нярэдка да страты той часткі публікі, якая ведае і ўмее слухаць сімфанічную музыку.

Вырашэнне праблемы арганізацыі слухачоў на сімфанічныя праграмы звязана з пэўнымі цяжкасцямі. Сёння рэдкія наведвальнікі канцэртаў сімфанічнай музыкі студэнты Белдзяржкансерваторыі, музычнага вучылішча імя М. Глінкі, многіх вышэйшых навучальных устаноў Мінска. З мэтай стымулявання цікавасці слухачоў да новых праграм сімфанічнай музыкі кіраўніцтва аркестра і канцэртнай залы філармоніі распрацавала шэраг папулярных тэматычных цыклаў.

Для павышэння мастацкага ўзроўню праграм і больш паглыбленай іх падрыхтоўкі скарэннага паляпшэння сістэмы арганізацыі гледачоў, з улікам іх адукацыйнага і ўзроставага ўзроўню. Па-ранейшаму будзе праводзіцца шэраг цыклаў-праграм для дзяцей і юнацтва з удзелам станоўча зарэкамендаваўшых сябе музыказнаўцаў. Асаблівая ўвага ў цыклах надаецца выхаванню ў юных слухачоў самастойных навыкаў ва ўспрыманні сімфанічнай музыкі. Больш увагі нададзена прапагандзе беларускага сімфанізму.

У сувязі з гэтым у аркестры распрацаваны перспектыўны рэпертуарны план да 1990 года. У сёлетнім сезоне — удзел ва ўсіх найважнейшых канцэртах, прысвечаных 40-годдзю Вялікай Перамогі, фестывалі «Мінская вясна», правядзенне III фестывалю сімфанічнай музыкі ў абласных цэнтрах рэспублікі, шэраг гастрольных паездак па краіне; з аркестрам выступіць шэраг вядучых дырыжораў і салістаў краіны. Ставіцца задача значнага паляпшэння рэкламы, сістэматычнага рэцэнзавання праграм і анансіравання прэм'ер у друку.

Кіраўніцтва Белдзяржфілармоніі ажыццяўляе на справе меры па ўмацаванні сімфанічнага аркестра вопытнымі кадрамі адміністрацыйных работнікаў, здольных вырашаць неадкладныя і перспектыўныя задачы паляпшэння ў комплексе канцэртнай, творчай і прапагандысцкай дзейнасці Дзяржаўнага сімфанічнага аркестра БССР».

Фарбы, сонца... і жыццё

У Палацы мастацтваў сёння гэтак ажыўлена, бадай, як можа быць шумліва толькі ў час школьных канікулаў. Хлопчыкі і дзяўчынкі ў піянерскіх гальштуках і старэйшага ўзросту, піянер-важатыя і настаўнікі пераходзяць ад экспаната да экспаната выстаўкі, з'яўленне якой тут, у галоўнай экспазіцыйнай зале рэспублікі, заўсёды жаданае і чаканае. А яна — незвычайная, бо аўтарамі яе з'яўляюцца дзеці, узрост якіх ад пяці да шаснаццаці гадоў. Сёлета — прадаўжэнне даўняй і добрай традыцыі: Рэспубліканская выстаўка дзіцячага выяўленчага і дэкаратыўна - прыкладнога мастацтва адкрылася ў 30-ы раз. Аднак ёсць яшчэ адна зкалічнасць, якая надае ёй асаблівую святочнасць і ўрачыстасць — экспазіцыя прысвячаецца 40-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, а назва выстаўкі — «Няхай заўжды будзе мір!».

Важкасць і значнасць набыткаў у мастацтве наўрад ці можна вымяраць нейкімі лічбамі, але ў дадзеным выпадку іх абавязкова хочацца прывесці: больш як тысяча работ прадстаўлена ў адной з залаў Палаца, у якой за гонар выставіць свае работы лічаць і знакамітыя прафесійныя творцы. Такое права дадзена юным аўтарам, якія спрабуюць свае сілы ў самых розных жанрах.

Малюнак і скульптура, ткацтва і кераміка, разьбярства па дрэве і вырабы з саломкі — усё гэта можна ўбачыць на выстаўцы. Тут жа размешчаны мастацкая вышыўка і цацкі, вырабы з ільну, букеты. Проста здзіўляешся, наколькі багатая фантазія юных аўтараў, якія нечаканыя сюжэтна-тэматычныя рашэнні ў іх творах, якое здзіўляючае спалучэнне ліній, фарбаў. А за ўсім гэтым — святочнасць, сонечнасць. І, вядома, само жыццё, падгледжанае пільнымі дзіцячымі вачанятамі, што даверліва глядзяць на навакольны свет, адкрываючы яго ва ўсёй складанасці і шматстайнасці, радуючыся яму.

Вялікі педагог сучаснасці В. Сухамлінскі гэтае пазнанне, што пачынаецца ў чалавека з самага маленства, не выпадкова дакладна і хораша назваў «школай радасці». Ёсць у яго і кніга пад такой назвай, а ў ёй раздзел «Кожнае дзіця — мастак». Невялікую вытрымку з роздуму Васіля Аляксандравіча хочацца прывесці, бо яна шмат дае для разумення і таго, што паказана на гэтай выстаўцы: «...дзіцячы малюнак, працэс малявання — гэта часцінка духоўнага жыцця дзіцяці. Дзеці не проста пераносяць на паперу штосьці з навакольнага свету, а жывуць у гэтым свеце, уваходзяць у яго як творцы прыгажосці, атрымліваюць асалоду ад гэтай прыгажосці... Творчасць дзяцей — гэта вельмі своеасаблівая сфера іх духоўнага жыцця, самавыяўленне і самасцвярджэнне, у якім ярка раскрываецца і індывідуальная самабытнасць кожнага дзіцяці. Гэтую самабытнасць немагчыма ахапіць нейкімі правіламі, адзінымі і абавязковымі для ўсіх».

Калі ж глядзець на творы з пазіцыі «дарослaсці», многае будзе незразумелым: і нечаканасць памераў у спалучэнні таго, што, здавалася б, ні ў якім разе спалучыць нельга, і выкарыстанне колераў, якія ў дадзеным выпадку проста не падыходзяць... Але пры падобным успрыманні знікне галоўнае — тая непасрэднасць, якая напаўняе работы дзяцей, вобразнасць, пазітычнасць, што немагчыма перадаць словамі. Таму лепш не проста разглядаць творы, а прыладзіцца да гаманкой стайкі хлопчыкаў і дзяўчынак і паспрабаваць глянуць на работы іхнімі вачамі.

Тады многае ўбачыцца пановаму. Адкрыецца неадкрытае, а дзіцячая фантазія падорыць свае таямніцы. І адразу заўважыш, наколькі многае хвалюе дзяцей у сённяшнім жыцці, як уважліва прыглядаюцца яны да яго, каб даць вытлумачэнне таму, што адбываецца ў свеце. Па-свойму падыходзяць і да адлюстравання тэмы Вялікай Айчыннай вайны, пра якую ведаюць толькі па расказах дзядуляў і бабуль, па прачытаных кнігах, па ўбачаных фільмах і спектаклях. Расказваюць з нейкай зусім не дзіцячай сур'ёзнасцю, бо ведаюць, што такое вайна, бо неаднойчы чулі, як шмат каштавала савецкаму народу і ўсяму чалавецтву перамога над фашызмам.

«Партызанскі хлеб» Валодзі Мінкевіча. «Вечная памяць» Тані Бойка, «Бой за Мінск» Дзімы Латушкіна — гэтыя і іншыя творы хвалююць шчырасцю і непасрэднасцю, а яшчэ — сумленнасцю, бо толькі чалавек, чуйны да чужога болю і гора, здольны расказваць пра тое, што, хвалюючы іншых, пачынае гэтаксама ўзрушліва непакоіць і яго самога. Пра вайну і малюнак Ларысы Чарніцкай «Досвітак 22 чэрвеня 1941 года». Дзяўчынка на пярэднім плане намалявала агромністае сонца, шар якога бы расплаўлены, гатовы спапяліць усё жывое.

Таня Станкевіч падышла да раскрыцця падзей вайны ў іншым плане, расказаўшы пра блізкага і дарагога ёй чалавека. «Партрэт майго дзядулі» — так называецца малюнак. Дарэчы, на выстаўцы нямала і іншых работ, тэмы якіх звязаны з адлюстраваннем вобліку людзей, з якімі юныя аўтары сустракаюцца часта.

Найбольш тэме мінулай вайны прысвечана малюнкаў, аднак дзеці выкарыстоўваюць з поспехам і іншыя жанры. Оля Еўграфава, напрыклад, для стварэння партрэта Героя Савецкага Саюза Зіны Партновай узяла звычайную гліну. Ёсць скульптурныя кампазіцыі, выкананыя разьбой па дрэве.

Другі важны матыў, што гучыць у экспазіцыі, барацьба за мір, услаўленне непераможнасці і несупыннасці жыцця. І тут юныя творцы выяўляюць уменне ствараць кампазіцыі, якія пры ўсёй сваёй непасрэднасці, нават пэўнай дзіцячай наіўнасці (у добрым сэнсе гэтага слова), выглядаюць завершанымі, напоўнены жаданнем дзяцей сказаць сваё слова пра час, у якім яны жывуць, выказаць сваё стаўленне да свету і людзей.

«Няхай заўсёды будзе мір!» — назвай сваёй работы Наташа Карманова перадала пачуцці ўсіх дзяцей планеты, якія жадаюць жыць у міры і дружбе, згодзе і сяброўстве з усімі хлопчыкамі і дзяўчынкамі планеты. Таму не выпадкова, што малюнкі часта расказваюць аб гэтым. «Дружаць дзеці на планеце», — гаворыць Іра Мельяненка. «Танец міру»— так назвалі свой малюнак Алеся Семянько і Косця Вішнякоў. А вось вялікае пано «Праца» створана цэлым калектывам дзяўчынак — Ала Дзяргай, Наташа Сянькевіч, Юля Длатоўская, Аня Міхальская, Інга Сэліта, Таня Гучык, Юля Каламіец, Наташа Гарбачова, Оля Нікшына... Столькі жадання расказаць аб тым, чым заняты людзі ў паўсядзённасці!

Адчувальная на выстаўцы і тэма радаснага, бесклапотнага маленства. Гэта выяўляецца ў жаданні дзяцей расказаць пра любімых герояў казак і кніг, адлюстраваць пэўныя моманты з убачаных фільмаў, перадаць хараство навакольля. А за ўсім — нястрымнасць фантазіі, здзіўляльная гама колераў і адценняў, калі самае незвычайнае становіцца само сабой зразумелым, неверагоднае магчымым.

Работы, што трапілі на выстаўку, у асноўным выкананы звычайнымі хлопчыкамі і дзяўчынкамі (ёсць, праўда, у экспазіцыі і творы дзяцей, якія вучацца ў школах з мастацкім ухілам), што займаюцца ў гуртках і студыях школ, пазашкольных устаноў, ЖЭСаў, дзіцячых садоў... Адабраны толькі лепшыя з лепшых (у рамках гэтай выстаўкі працуе яшчэ экспазіцыя ў фае мінскага кінатэатра «Масква). Пад кіраўніцтвам вопытных педагогаў (хай прабачаць яны, прозвішчы ўсіх назваць проста немагчыма) далучаюцца юныя да свету мастацтва, адкрываючы яго сакрэты і таямніцы, а тым самым адкрываюць у гэтым свеце і саміх сябе. Адбываецца тое тварэнне прыгажосці, якое так многа значыць у эстэтычным выхаванні актыўных будаўнікоў камуністычнага грамадства.

Г. РУНЕВІЧ.

Эла Мяжжынская. Пано «Дзед».

Частка пано «Праца».

Оля Еўграфава. Зіна Партнова.



Вова Куц. Узятая вышыня.

Алег Новік. У вёсцы.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04231 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі—33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі—33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.